Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

14 ЧЭРВЕНЯ 2008 г.
СУБОТА
№ 110
(26223)

Кошт 490 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Паважаныя ўрачы, правізары, фельчары, медыцынскія сёстры, фармацэўты, усе работнікі сістэмы аховы здароўя!

Па шматгадовай традыцыі кожную трэцюю нядзелю чэрвеня наша краіна адзначае Дзень медыцынскіх работнікаў.

2008 год аб'яўлены ў Беларусі Годам здароўя, і першарадная задача дзяржавы і грамадства заключаецца ў вырашэнні ўсяго комплексу праблем па ўмацаванні здароўя беларускага народа, каб здаровы лад жыцця стаў натуральнай патрэбнасцю кожнага чалавека, своеасаблівай нацыянальнай ідэяй.

Развіццё аховы здароўя было, ёсць і будзе найважнейшым прыярытэтам дзяржаўнай палітыкі, накіраванай на тое, каб якасная пярвічная і высокатэхналагічная медыцынская дапамога была даступная кожнаму грамадзяніну Беларусі незалежна ад таго, жыве ён у сталічным мегаполісе або ў маленькай палескай вёсачцы. У апошнія гады гэта палітыка забяспечыла рост працягласці жыцця і нараджальнасці насельніцтва, зніжэнне смяротнасці нашых суайчыннікаў.

Гэтыя дасягненні ў многім сталі магчымыя дзякуючы поспехам рэспублікі ў сацыяльна-эканамічным развіцці, комплекснаму перааснашчэнню лячэбных устаноў новым абсталяваннем, высокаму прафесіяналізму, ведам і працавітасці медыцынскіх работнікаў, якія прысвяцілі сваё жыццё клопату аб здароўі чалавека.

У гэты святочны дзень ад усёй душы жадаю вам новых поспехаў і здзяйсненняў у вашай адказнай і высакароднай працы, моцнага здароўя, дабрабыту, міру і радасці вам і вашым блізкім.

З прафесійным святам, дарагія сябры!

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

Тарыфныя аклады павышаны з 1 ліпеня некаторым катэгорыям беларускіх урачоў

Некаторым катэгорыям урачоў, якія працуюць у сістэме дзяржаўнай аховы здароўя, павышаны тарыфныя аклады на 10—25 працэнтаў. Такое рашэнне замацавана пастановай Савета Міністраў Беларусі ад 13 чэрвеня № 859.

«Устанавіць павышэнне тарыфных акладаў урачам, якія працуюць у арганізацыях аховы здароўя, што фінансуюцца з бюджэту і падпарадкаваны Міністэрству аховы здароўя, мясцовым выканаўчым і распарадчым органам, якія аказваюць амбулаторную медыцынскую дапамогу (акрамя ўрачоў агульнай практыкі, галоўных урачоў, якія выконваюць аб'ём урачэбнай нагрузкі ўрача агульнай практыкі, урачоў-тэрапеўтаў участковых, урачоў-педыятраў участковых) і стацыянарную медыцынскую дапамогу, адпаведна на 25 і 10 працэнтаў», — гаворыцца ў пастанове Саўміна.

Гэтым жа дакументам Міністэрству фінансаў, Міністэрству аховы здароўя, мясцовым выканаўчым і распарадчым органам прадпісана забяспечыць у 2008 годзе фінансаванне расходаў, звязаных з павышэннем тарыфных акладаў урачам за кошт сродкаў, прадугледжаных на ахову здароўя ў рэспубліканскім і мясцовых бюджэтах.

Акрамя таго, вышэй згаданым органам прадпісана штогод, пачынаючы з 2009 года, пры фарміраванні бюджэтаў на чарговы фінансавы год, прадугледжваць сродкі на павышэнне тарыфных акладаў урачам.

Пастанова прынята для выканання дадзенага раней даручэння Прэзідэнта Беларусі. Аляксандр Лукашэнка, наведваючы 29 мая Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр траўматалогіі і артапедыі, указаў на неабходнасць павышэння зарплат беларускім медыкам і пашырэння пераліку выплат за асабліва складаныя аперацыі. Гэта пастанова ўступае ў сілу з 1 ліпеня 2008 года.

БЕЛТА.

ПРЭЗІДЭНТ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА 13 ЧЭРВЕНЯ ВЫДАЎ ДЭКРЭТ № 12 «АБ УСТАНАЎЛЕННІ ПАМЕРАЎ САЦЫЯЛЬНЫХ ПЕНСІЙ».

Дэкрэт прадугледжвае павелічэнне памераў сацыяльных пенсій і спрашчэнне парадку іх вылічэння — у працэнтах ад бюджэту пражыткавага мінімуму, што будзе адпавядаць парадку вылічэння ўсіх іншых сацыяльных выплат.

Пры ўстанаўленні новых памераў сацыяльных пенсій захоўваецца падыход па катэгорыі, але прадугледжваецца забяспечыць усім непрацаздольным грамадзянам (незалежна ад таго, ідзе гаворка аб дзецях, маладых інвалідах або асобах, якія дасягнулі пенсійнага ўзросту) сацыяльныя пенсіі на ўзроўні не ніжэйшым за 50 працэнтаў бюджэту пражыткавага мінімуму.

Сацыяльныя пенсіі ўстаноўлены: для інвалідаў I групы, у тым ліку інвалідаў з дзяцінства, — 85 працэнтаў БПМ; інвалідаў з дзяцінства II групы — 75 працэнтаў, інвалідаў II групы, дзяцей у выпадку страты карміцеля — 65 працэнтаў (на кожнае дзіця); інвалідаў III групы — 55 працэнтаў; асобаў, якія дасягнулі пенсійнага ўзросту, — 50 працэнтаў, дзяцей-інвалідаў ва ўзросце да 18 гадоў у залежнасці ад ступені страты здароўя — ад 60 да 85 працэнтаў.

Выходзячы з бюджэту пражыткавага мінімуму ў цэнах сакавіка 2008 г., які дзейнічае зараз, памеры сацыяльных пенсій для інвалідаў I, II і III груп складуць адпаведна Br178,5 тыс., Br136,5 тыс. і Br115,6 тыс., для асобаў, якія дасягнулі пенсійнага ўзросту, — Br105,1 тыс. Пры гэтым забяспечваецца неабходная дыферэнцыяцыя працоўных і сацыяльных пенсій.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

У Беларусі ёсць патэнцыял для вытворчасці 10 млн тон збожжа

Такую думку ў размове з карэспандэнтам БЕЛТА выказаў намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Аляксандр Папкоў.

Паводле яго слоў, у развіцці аграпрамысловага комплексу яўна прасочваюцца правільныя падыходы па фарміраванні харчовага рынку. Немалаважную ролю ў гэтым адыгрываюць 5 навукова-практычных цэнтраў НАН. «Мы адышлі ад вырашэння асобных задач, укаранення некаторых фрагментаў і цяпер маем новыя тэхналогіі ў комплексе», — адзначыў Аляксандр Папкоў. «Задача, якая была пастаўлена кіраўніком дзяржавы, аб наданні аграрнай навуцы практычнага характару рэалізавана», — падкрэсліў намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта. Аляксандр Папкоў адзначыў, што ў АПК удалося дасягнуць пэўных рубяжоў, многія запланаваныя ў праграме адраджэння і развіцця вёскі задачы выкананы і могуць быць нават павялічаны. «Задача па вытворчасці 8 млн тон збожжа для рэспублікі ўжо не мяжа. Мы можам з улікам асваення новых тэхналогій вырабляць 10 млн тон збожжа, — лічыць Аляксандр Папкоў. — Гэта пацвярджаецца высокім узроўнем механізацыі і тэхнічнага патэнцыялу, базай насенняводства». Што датычыцца прадукцыі жывёлагадоўлі, то ў рэспубліцы ўзяты правільны курс на ўкараненне высокапрадукцыйных парод жывёл, павышэнне генетычнага патэнцыялу парод.

«Прамая лінія»

Пытанне аб страваванні

Аб метадах дыягностыкі і новых падыходах у лячэнні хваробаў стрававода, станаў, якія суправаджаюцца пякоткай, захворванняў страўніка, падстраўнікавай залозы, печані і кішэчніка вы зможаце даведацца, калі патэлефануеце дацэнту 2-й кафедры ўнутраных хваробаў Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, кандыдату медыцынскіх навук, урачу-гастраэнтэролагу вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі Мікалаю Валянцінавічу КАПРАЛАВУ.

«Прамая лінія» адбудзецца ў рэдакцыі газеты «Звязда» напрыканцы чэрвеня. Папярэднія пытанні можна пакінуць па тэлефоне ў рэдакцыі: 8 (017) 287 18 36.

СА «ЗВЯЗДОЙ» — У ДРУГІМ ПАЎГОДДЗІ!

Ідзе падпіска на II паўгоддзе і III квартал 2008 года

Падпісныя цэны на газету «Звязда» (у рублях)

Індэкс	на 1 месяц	на 3 месяцы	на 6 месяцаў
63850 (індывідуальны)	9200	27600	55200
63145 (індывідуальны льготны для пенсіянераў, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны)	8700	26100	52200
63858 (ведамасны)	14700	44100	88200
63239 (ведамасны льготны для ўстаноў міністэрстваў культуры, адукацыі і аховы здароўя)	13400	40200	80400

ISSN 1990 - 763X

КУРСЫ ВАЛЮТ

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 14.06.2008 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 129,00
1 еўра	3 278,34
1 латвійскі лат	4 790,19
1 літоўскі літ	972,88
1 чэшская крона	136,63
1 польскі злоты	966,28
1 расійскі рубель	89,93
1 украінская грыўня	451,92

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

USD	23,6109
10 UAH	49,2325
1000 BYR	11,0739
EUR	36,8070

Курс у гандлёвых кампаніях (на 13.06.2008 г.)

USD	2135 / 2210

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

Фота БЕЛТА.

ПРАДСТАЎНІКІ 25 НАЦЫЯНАЛЬНАСЦЯЎ ПРЫМАЮЦЬ УДЗЕЛ У ФЕСТЫВАЛІ НАЦЫЯНАЛЬНЫХ КУЛЬТУР У ГРОДНЕ

Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведамілі ў дырэкцыі фестывалю.

Журы пад кіраўніцтвам народнага артыста Беларусі Міхаіла Дрынеўскага выбрала звыш 700 найбольш яркіх салістаў і творчых калектываў, якія атрымалі запрашэнне ў Гродна. Да фестывальнага руху далучыліся беларускія балгары, індусы, палесцінцы, кабардзіны, балкары. Пашырылі сваё прадстаўніцтва аб'яднанні казахаў і чувашаў.

Для нацыянальных падворкаў, дзе прадстаўнікі дыяспар прадэманструюць свае культурныя традыцыі, у гістарычным цэнтры Гродна арганізаваны больш як 20 пляцовак. Асаблівасцю гэтага фестывалю будзе паказ фрагментаў нацыянальнага абраду вяселля. Акрамя таго, павялічыцца колькасць падворкаў. Першы — «Шматгалоссе» — аддадзены двум аднайменным шматнацыянальным аб'яднанням з Барысава і Мінска, другі — замежным студэнтам трох гродзенскіх ВНУ.

Галоўныя з іх разгорнуцца на дзвюх плошчах: імя Леніна і Савецкай. На апошняй устаноўлена новая крытая сцэна і размешчаны вялікі плазменны экран, дзякуючы якому сцэнічныя дзеянні будуць даступныя шырокаму колу фестывальнай публікі.

РЭАЛІЗАЦЫЯ ЎКАЗА АБ ДЗЯРЖЗАКУПКАХ ДАЛА МАГЧЫМАСЦЬ ЗЭКАНОМІЦЬ ЛЕТАСЬ АМАЛЬ BR170 МЛРД БЮДЖЭТНЫХ СРОДКАЎ

Рэалізацыя ўказа аб дзяржаўных закупках дала магчымасць у 2007 годзе дасягнуць эканоміі бюджэтных сродкаў у суме амаль Br170 млрд. Аб гэтым паведаміў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на нарадзе па пытаннях удасканалення парадку дзяржаўных закупак.

Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, гэты дакумент стаў своеасаблівым каркасам, вакол якога выбудоўвалася сістэма дзяржаўных закупак. У адпаведнасць з ім прыведзены рашэнні, прынятыя раней органамі ўлады.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што перш чым прыняць рашэнне па праекту ўказа, у якім удакладняюцца палажэнні сістэмы дзяржаўных закупак, якая склалася паўтара года таму, неабходна выслухаць меркаванні прадстаўнікоў усіх зацікаўленых бакоў, кантралюючых органаў, а таксама практыкаў. Галоўнае пытанне — наколькі гэты дакумент адпавядае патрабаванням і ці будзе з яго прыняццем створаны надзейны бар'ер бюракратызму і непатрэбным затрымкам, што мелі месца.

«Важна, каб усе этапы і элементы працэдуры дзяржаўных закупак былі дакладна прапісаны і мелі адназначнае тлумачэнне. Любая нявызначанасць — гэта тая самая «мутная вада», якую паспяшаюцца выкарыстаць нячыстыя на руку, стараючыся атрымаць незаконны даход», — сказаў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што трэба сфарміраваць такі парадак дзяржаўных закупак, які забяспечваў бы іх празрыстасць, канкурэнтнасць, а таксама рацыянальнае і эфектыўнае выкарыстанне бюджэтных сродкаў.

Аб'ём дзяржаўных закупак за кошт сродкаў рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў у мінулым годзе склаў Br13,5 трлн, паведаміў Прэзідэнт Беларусі.

Прэзідэнт падкрэсліў: «Гэта вялікія грошы, і вельмі важна, каб яны былі эфектыўна. Мае адносіны да парадку выкарыстання бюджэтных сродкаў вы ведаеце. Ні адзін рубель не павінен быць патрачаны ўпустую. А патрабаванне за вольнае або міжвольнае разбазарванне дзяржаўных рэсурсаў павінна быць вельмі жорсткім». Пытанне ўдасканалення парадку дзяржзакупак — асноўнае. Сутнасць у тым, каб не забюракратызаваць гэты працэс. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што галоўная мэта абмеркавання — як зрабіць так, каб за гэтыя сродкі закупіць як мага больш.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што, як сведчыць сусветны вопыт, альтэрнатывы конкурснаму працэсу дзяржаўных закупак няма, у адваротным выпадку — карупцыя і злоўжыванні. А пазбегнуць гэтага можна толькі стварыўшы эфектыўную сістэму кантролю, якія падрабязна рэгламентуюць усе этапы працэсу закупак, выбудаваўшы выразныя механізмы кантролю за дакладным выкананнем гэтых правілаў. Менавіта таму ў 2006 годзе было прыведзена ў сістэму заканадаўства аб закупках, прыняты ўказ «Аб дзяржаўных закупках», дзе жорстка рэгламентаваны парадак іх правядзення, устаноўлена эканамічная і адміністрацыйная адказнасць за парушэнне гэтага парадку.

Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і БЕЛТА

Абітурыент-2008

БЛАНКІ АДКАЗАЎ НА ЦТ СТАЛІ ДВУХМОЎНЫЯ

Абітурыентаў сёння без праблем можна пазнаць нават у натоўпе — па тым, што яны трымаюць у руках, а гэта пашпарт, пропуск і ручка. Цэнтралізаванае тэсціраванне набірае свае абароты: у чацвер і пятніцу прэтэндэнты на званне студэнта здавалі іспыты па дзяржаўнай мове, а 15 чэрвеня іх чакае тэст-экзамен па гісторыі Беларусі.

Дарэчы, у першы дзень ЦТ у пункты правядзення тэсціравання здаваць беларускую мову прыйшлі 68 тысяч 22 абітурыенты. А зарэгістраваліся, нагадаем, 69 тысяч 366 чалавек. Такім чынам 1 тысяча 344 чалавекі (або 3 працэнты ад агульнай колькасці зарэгістраваных) экзамен па нейкай прычыне прапусцілі. Калі прычына акажацца ўважлівай, то ў маладых людзей будзе магчымасць здаць экзамен у рэзервовы дзень (2 ліпеня). Зарэгістравацца для праходжання тэсціравання ў рэзервовы дзень можна на базе шасці ВНУ: у Брэсцкім дзяржаўным тэхнічным універсітэце, Віцебскім дзяржаўным тэхналагічным універсітэце, Гомельскім дзяржаўным тэхнічным універсітэце, Гродзенскім дзяржаўным універсітэце, Беларуска-Расійскім універсітэце і ў БДУ. А праводзіцца яно будзе для абітурыентаў з усіх рэгіёнаў у Мінску, на базе Белдзяржуніверсітэта. Як расказаў журналісту «Звязды» дырэктар Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў Мікалай Фяськоў, у першы дзень цэнтралізаванага тэсціравання ад удзелу ў тэст-экзамене былі адхілены 3 чалавекі і яшчэ адзін абітурыент пакінуў аўдыторыю па стане здароўя. Дарэчы, сёлета былі ўнесены некаторыя змяненні ў бланкі адказаў. Уся інфармацыя ў іх цяпер падаецца на дзвюх мовах — рускай і беларускай. Акрамя таго, бланкі сталі больш яркія, кантрастныя. Тое ж датычыцца і сертыфікатаў. Мяркуецца, што цяпер і абітурыенты падчас тэсціравання, і работнікі прыёмных камісій, якія працуюць з сертыфікатамі, змогуць лягчэй успрымаць напісанае.

«Кожны бланк мае сваю серыю і нумар, што з'яўляецца дадатковай страхоўкай ад падробак. Усе бланкі занесены ў базу даных, таму нам вядома, які бланк знаходзіцца зараз у якім горадзе, у якім пункце правядзення тэсціравання і нават у якой аўдыторыі, — патлумачыў Мікалай Фяськоў. — Як і ў папярэднія гады, дастаўкай усіх матэрыялаў цэнтралізаванага тэсціравання ў пункты правядзення ЦТ і назад, у Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў, займаецца фельд'егерская служба».

Надзея НІКАЛАЕВА.

Новыя пляцоўкі гродзенскага спарткомплексу «Нёман» могуць прымаць міжнародныя спаборніцтвы

Аб гэтым заявіў журналістам кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта, старшыня Беларускай федэрацыі футбола Генадзь Нявыглас. Ён прыняў удзел ва ўрачыстай цырымоніі адкрыцця пасля маштабнай рэканструкцыі цэнтральнага спартыўнага стадыёна «Нёман» у Гродне.

Паводле яго слоў, ужо бліжэйшыя таварыскія матчы маладзёжнай і нацыянальных зборных пройдуць на новай футбольнай арэне ў Гродне.

«Беларусь укладвае вялікія сродкі ў будаўніцтва спартыўных аб'ектаў, бо прыярытэт нашай дзяржаўнай палітыкі — чалавек, яго духоўнае і фізічнае развіццё, — сказаў ён. — Шматфункцыянальныя аб'екты, падобныя да гродзенскага спарткомплексу, садзейнічаюць не толькі развіццю здольнасцяў спартсменаў-прафесіяналаў, яны працуюць на ўмацаванне здароўя ўсіх нашых грамадзян».

На спарткомплексе «Нёман» укладзена пакуль адзінае ў Беларусі лёгкаатлетычнае сінтэтычнае бегавое пакрыццё Mondo. Уведзены крытыя трыбуны з індывідуальнымі сядзеннямі на 10 тыс. месцаў.

Тэндэнцыя зніжэння цэнаў на другасным рынку жылля Мінска можа захавацца і восенню

Такую думку карэспандэнту БЕЛТА выказаў старшыня Беларускага таварыства ацэньшчыкаў Мікалай Трыфанаў.

«У любым выпадку зразумела, што даходнасць рынку кватэр, якая прыцягвала туды грошы і нагнятала цэны, сябе вычарпала. Гэта пацвярджаюць і замежныя інвестары, якія пераключылі свой інтарэс на нежылую нерухомую маёмасць — будаўніцтва гандлёва-забаўляльных, адміністрацыйных цэнтраў».

Паводле даных Беларускага таварыства ацэньшчыкаў, са студзеня па красавік 2008 года сярэдняя цана квадратнага метра жылля знізілася з $2036 да $1986. Цяпер сярэдні кошт квадратнага метра вагаецца на ўзроўні $1990 плюс-мінус $10, да канца лета магчыма яго плаўнае падзенне да $1980 таксама з некаторымі ваганнямі.

Мікалай Трыфанаў не згадзіўся з экспертамі, якія адзначаюць пасіўнасць у апошнія месяцы пакупнікоў жылля. Паводле даных Нацыянальнага кадастравага агенцтва, у красавіку гэтага года было прададзена 975 кватэр. Гэта колькасць заключаных здзелак стала новым рэкордам з ліпеня 2006 года, калі было прададзена 825 кватэр. Для параўнання: у студзені 2007 года купілі 197 кватэр, у ліпені — 244 кватэры, у кастрычніку — 461, у студзені 2008 года — 364. На думку старшыні Беларускага таварыства ацэньшчыкаў, здзелкі, якія былі аформлены ў красавіку, былі адкладзены патэнцыяльнымі пакупнікамі паўгода-год таму, у гэтым годзе будуць заключаны.

У I квартале гэтага года сярэдні кошт жылля знізіўся ва ўсіх раёнах Мінска, за выключэннем Цэнтральнага і Ленінскага. У апошнім цэны выраслі асабліва моцна — з $2020 у студзені гэтага года да $2027 у красавіку. На 1 долар з невялікім, да $2258 за 1 кв.м, павялічыўся кошт жылля ў Цэнтральным раёне.

Віншаванне Каралеве

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка ад імя беларускага народа і сябе асабіста павіншаваў Каралеву Злучанага Каралеўства Вялікабрытаніі і Паўночнай Ірландыі Лізавету II з нацыянальным святам — Днём нараджэння Каралевы.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

У ДТЗ ТРАПІЛА ІНКАСАТАРСКАЯ МАШЫНА

У чацвер днём на дарозе паблізу вёскі Ананічы Пухавіцкага раёна ў дарожна-транспартнае здарэнне трапіла інкасатарская машына «Фольксваген», якой кіраваў вадзіцель мясцовага філіяла ААТ «Белаграпрамбанк».

Як паведамілі карэспандэнту «Звязды» ва ўпраўленні Дзяржаўтаінспекцыі МУС, ДТЗ зафіксавана на пачатку чацвёртай дня: інкасатарскі аўтамабіль сутыкнуўся з аўтамабілем «Крайслер», якім кіраваў 24-гадовы грамадзянін. У выніку аварыі загінуў адзін з інкасатараў і пасажыр «Крайслера» — вучань восьмага класа. Акрамя таго, вадзіцелі інкасатарскай машыны і «Крайслера», а таксама другі інкасатар былі дастаўлены ў бальніцу.

Ігар ГРЫШЫН.

ДАІ ЎЗМАЦНЯЕ КАНТРОЛЬ

Асабовы склад Дзяржаўтаінспекцыі пераведзены на ўзмоцнены варыянт нясення службы ў сувязі з высокай аварыйнасцю на дарогах краіны, паведамілі карэспандэнту «Звязды» ва УДАІ МУС.

Як паказвае аналіз, асноўнымі прычынамі дарожна-транспартных здарэнняў становяцца перавышэнне хуткасці і неабдуманыя абгоны. Знаходзячыся ва ўмовах шчыльнага транспартнага патоку, вадзіцелі ігнаруюць элементарныя правілы паводзінаў на дарозе. Таму ў бліжэйшыя дні супрацоўнікі ДАІ будуць правадзіць масіраваныя апрацоўкі ўсіх асноўных напрамкаў з прымяненнем прыбораў фота-відэафіксацыі і актыўна выкарыстоўваючы негалосны кантроль. Акрамя таго, з верталёта будуць патрулявацца напрамкі: Віцебск — Віцебскі раён — а/д М8 — Жодзіна — а/д М1 — Талачын — Крупкі — Барысаў — Жодзіна — а/д Р53 — а/д М2 — Баравая.

Ігар ГРЫШЫН.

ГАЛОЎНЫ РЭДАКТАР ГАЗЕТЫ «СОВЕТСКАЯ БЕЛОРУССИЯ» П. ЯКУБОВІЧ ВЫБРАНЫ ЧЛЕНАМ САВЕТА СУСВЕТНАЙ АСАЦЫЯЦЫІ РУСКАЙ ПРЭСЫ

Гэта асацыяцыя, Х Сусветны кангрэс якой праходзіць цяпер у Маскве, аб'ядноўвае 400 СМІ ў больш чым 80 краінах свету.

БЕЛАРУСЫ — У ФІНАЛЕ ЕЎРА-2008

Праўда, гаворка ідзе пакуль што не пра футбольную каманду, а пра некалькіх беларускіх балельшчыкаў — самых эрудзіраваных і ўдачлівых. Менавіта яны атрымалі магчымасць не толькі сачыць за матчамі вядучых зборных па тэлевізары, але і асабіста трапіць на фінальны матч Еўра-2008 на стадыёне «Эрнст Хапель» у Вене.

У конкурсе для футбольных балельшчыкаў, які праводзіў канал АНТ з 2 па 9 чэрвеня, паспрабавалі свае сілы некалькі тысяч чалавек з розных рэгіёнаў Беларусі. Як распавяла прэс-сакратар АНТ Аліна Праторава, былі сярод актыўных удзельнікаў нават жанчыны, але даволі малы працэнт. А білетаў на фінал — усяго тры. І дасталіся яны на выніках конкурсу самым эрудзіраваным знаўцам: Кірылу Буланаву з г.п. Шуміліна (набраў 46 балаў), Сяргею Грыбаву з г. Бабруйска (43 балы) і Сяргею Гарбачову з в. Вяркуды Ушацкага раёна (40 балаў). Шчасліўчыкам канал не толькі падорыць запаветныя білеты, але таксама дапаможа з атрыманнем візы, аплаціць праезд і пражыванне ў Вене. Сотня лепшых адказаў змешчаная цяпер на сайце тэлеканала.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

УЖЫВАННЕ ЧЫПСАЎ ВЯДЗЕ ДА РАКУ СТРАЎНІКА

Такую думку ў інтэрв'ю карэспандэнту агенцтва «Мінск—Навіны» выказаў галоўны ўрач Мінскага гарадскога клінічнага анкалагічнага дыспансэра Зігмунд Гедрэвіч.

Справа ў тым, патлумачыў спецыяліст, што адно з абавязковых умоў прыгатавання чыпсаў — высокая тэмпература. А калі багатую на вугляводы бульбу даводзяць да такой «кандыцыі», адбываецца працэс утварэння рэчыва пад назвай «акрыламід». «Доза» гэтага рэчыва ў 100-грамовым пакеціку чыпсаў перавышае максімальна дапушчальную канцэнтрацыю ў 500 разоў.

Вольга ГРЫГОР'ЕВА, *«Мінск—Навіны».*

К сведению акционеров ОАО «Универсам Заславль»

26 июня 2008 года в 14.30 состоится внеочередное общее собрание акционеров по адресу: г. Минск, пр. Победителей, д. 49.

Регистрация участников с 13.30 до 14.15.

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Об участии Общества в другом юридическом лице.

2. О переизбрании члена Совета директоров Общества.

3. Утверждение условий материального вознаграждения члену Совета директоров Общества.

Акционер Общества принимает участие в работе собрания лично или через своего представителя, действующего на основании доверенности. Для регистрации на собрании необходимо при себе иметь паспорт и доверенность, оформленную в соответствии с требованиями законодательства.

С материалами, подготовленными к собранию, акционеры могут ознакомиться по адресу: г. Минск, пр. Победителей, д. 49, комн. № 14 в период с 16 июня 2008 г. с 10.00 до 16.00, а в день проведения собрания — в помещении, где оно проводится.

Телефон для справок: 203 89 17.

УНП 100008383. **Совет директоров.**

УП «Минский городской центр недвижимости»

ПОВТОРНО ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже конфискованного имущества: двухкомнатная квартира № 127, расположенная по адресу: г. Минск, проспект Машерова, д. 76 (общая площадь – 46,9 кв.м, жилая площадь – 26,8 кв.м).

Начальная цена снижена и составляет 213 132 690 белорусских рублей.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, условиями проведения аукциона; нотариально заверенные копии учредительных документов и свидетельства о регистрации (для юридических лиц); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного документа, подтверждающего внесение задатка; а также иные документы в соответствии с условиями проведения аукциона.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый объект. Порядок проведения торгов указан в условиях проведения аукциона.

Задаток в размере 21 000 000 белорусских рублей перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, код 153001331, УНП 190398583. Оплата объекта осуществляется в течение 2-х месяцев и 25 календарных дней с даты проведения аукциона. **Аукцион состоится 30 июня 2008 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.** Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по 28 июня 2008 года до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. № 6.

Телефоны для справок: (017)227 48 36, 227 40 22.

УНП 190398583

ОАО «Белагропромбанк» (Продавец) совместно с КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

ПРОВОДЯТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже одноэтажного кирпичного здания филиала отдела по работе с населением, об. пл. 62 кв.м, расположенного по адресу: Барановичский район, г.п. Городище, ул. Едунова, 7. Начальная цена с НДС – 21 773 844 бел. руб. Площадь земельного участка 0,0229 га. Задаток в размере 10 % от начальной цены перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015. Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 дней с даты проведения аукциона. Объект продается без условий. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. **Аукцион состоится 15 июля 2008 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 14 июля 2008 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

Контактный телефон (8017) 224 61 34.
Сайт в Интернете: www.rlt.by

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015.

СІНОПТЫКІ ЗРАБІЛІ ШТАРМАВОЕ ПАПЯРЭДЖАННЕ Ў СУВЯЗІ З НАВАЛЬНІЦАМІ І ПАРЫВІСТЫМ ВЕТРАМ, ЯКІЯ ПРАГНАЗУЮЦЦА НА 14 ЧЭРВЕНЯ

14 чэрвеня на тэрыторыі рэспублікі чакаюцца навальніцы. Удзень па ўсходняй палове краіны моцныя дажджы, у Гомельскай і Магілёўскай абласцях месцамі град, пры навальніцах прагназуецца шквалістае ўзмацненне ветру да 15—20 метраў у секунду.

Вядучыя беларускія банкі прафінансуюць падпіску на газеты для ветэранаў

Падпіску на дзяржаўныя перыядычныя выданні на наступны год для ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны прафінансуюць вядучыя банкі Беларусі, паведаміў на прэс-канферэнцыі старшыня Беларускага грамадскага аб'яднання «Фонд «Перамога — 1945 год» Аляксандр Бітус.

Паводле яго слоў, ужо ёсць дамоўленасці з шэрагам банкаў, цяпер рыхтуецца спіс ветэранаў, у які будуць уключаны некалькі тысяч чалавек.

Аляксандр Бітус адзначыў, што гэта не першая акцыя, якая праводзіцца пры падтрымцы беларускіх банкаў. Па ініцыятыве і хадайніцтву Фонду «Перамога — 1945» Белзнешэканомбанк і Белпрамбудбанк аказалі матэрыяльную дапамогу групе ветэранаў ВАВ у арганізацыі лячэння і набыцці якасных медыцынскіх прэпаратаў на агульную суму амаль $7 тыс.

Цяпер у Беларусі пражываюць 57 479 ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны. З іх 12 841 — інваліды першай і другой групы, якія маюць патрэбу ў паўсядзённым медыцынскім доглядзе. У жывых засталіся 22 Героі Савецкага Саюза, з якіх 13 прыкаваны да ложа і маюць патрэбу ў пастаяннай медыцынскай дапамозе і доглядзе.

БЕЛТА.

БЕЛОРУССКИЙ ИНДУСТРИАЛЬНЫЙ БАНК

УТВЕРЖДЕНО:
Решением Наблюдательного Совета ОАО «Белорусский Индустриальный Банк» Протокол № 17 от 09 июня 2008 г.

Изменение
в Краткую информацию об открытой продаже облигаций первого выпуска Открытого акционерного общества «Белорусский Индустриальный Банк»

1. Пункт 13 изложить в следующей редакции:
«13. Место и время открытой продажи облигаций
Продажа облигаций осуществляется по следующим адресам:
• ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа» — 220013, г. Минск, ул. Сурганова, 48а, в порядке, установленном ОАО «БВФБ» (биржевой рынок);
• ОАО «Белорусский Индустриальный Банк» — 220004, г. Минск, ул. Мельникайте, 8 с **10.00** до **16.00** в рабочие в Республике Беларусь дни (внебиржевой рынок)».

И.о. Председателя Правления **Богуш Д.М.**
И.о. главного бухгалтера **Тентевицкая Г.В.**

Лицензия Национального банка Республики Беларусь № 20 от 13.02.2007 года. УНП 100195493

ХАРВАТЫЯ ТАКСАМА Ў ЧВЭРЦЬФІНАЛЕ

Матчы другога тура ў групе В таксама скончыліся датэрміновым вызначэннем чвэрцьфіналіста. Услед за зборнай Партугаліі ім стала каманда Харваты, якая перамагла немцаў (2:0). У другім матчы ў выніку пройгрышу адной з камандаў яна пазбаўлялася шанцаў прайсці далей групавога турніру, аднак ні Польшча, ні Аўстрыя іх не страцілі, згуляўшы ўнічыю 1:1. Учора прайшлі матчы ў групе С паміж камандамі Італіі і Румыніі, Галандыі і Францыі.

НІ ДНЯ БЕЗ ФАНАЦКІХ БОЕК

Масавыя мерапрыемствы вельмі часта становяцца месцам беспарадкаў, якія арганізоўваюць хуліганы. Выключэннем не стала і кантынентальнае першынство ў Аўстрыі і Швейцарыі. Улады гаспадароў турніру вырашылі загадзя прыняць шэраг мераў у мэтах бяспекі. Напрыклад, Швейцарыя выдаткавала 61 мільён долараў на ахову правапарадку падчас кантынентальнага першынства. Арыштанты з аўстрыйскіх турмаў у гарадах, якія прымаюць Еўра-2008, былі накіраваныя ў іншыя месцы. Такім чынам аўстрыйцы вырашылі вызваліць камеры для футбольных хуліганаў. На тэрыторыі ўсіх стадыёнаў Еўра-2008 забаронены продаж алкагольных напояў.

У сталіцы Аўстрыі, Вене, былі высечаны дрэвы вакол стадыёна «Эрнстэ Хапеле», каб хуліганы не маглі залазіць на іх і кідаць зверху камяні і бутэлькі. У Аўстрыю ў дапамогу паліцэйскім і сцюартам былі выкліканы паліцэйскія з Францыі і Германіі, а швейцарцы мабілізавалі 15 000 салдат на выпадак сур'ёзных беспарадкаў. І ўсё ж інцыдэнты на Еўра-2008 сталі здарацца з самага першага дня. Першыя беспарадкі ўчынілі прыхільнікі зборнай Партугаліі, якія вырашылі адзначыць перамогу сваёй каманды над зборнай Турцыі блакадай адной з цэнтральных вуліц Базэля. Фанаты турэцкай зборнай паводзілі сябе менш міралюбна. Сур'ёзны інцыдэнт быў зафіксаваны ў нямецкім горадзе Франкфурт-на-Майне, дзе прадстаўнікі турэцкай дыяспары выказвалі сваё расчараванне з дапамогай камянёў і бутэлек, якімі яны закідалі ахоўнікаў правапарадку. У выніку адзін паліцэйскі атрымаў лёгкія раненні. Трэба адзначыць, што ўлады Франкфурта стварылі ўсе ўмовы для балельшчыкаў, устанавіўшы вялізны экран у цэнтры горада. Ля гэтага экрана сабралася каля 6500 выхадцаў з Турцыі, якія назіралі за стартам сваёй зборнай на Еўра. Вызначыліся ў першы дзень і балельшчыкі зборных Швейцарыі і Чэхіі, якія імкнуліся ўчыніць бойку перад пачаткам матча, але паліцыя своечасова спыніла беспарадкі.

Другі дзень першынства таксама быў багаты на падзеі: услед за першай перамогай зборнай Харваты балельшчыкі «шахматных» таксама вырашылі ўнесці свой уклад і ўчынілі невялікі кулачны бой, якім і адзначылі поспех. Але, бадай, самы гучны інцыдэнт адбыўся на Еўра-2008 у аўстрыйскім Клагенфурце. У паліцэйскія зводкі трапілі палякі і немцы. Яшчэ да стартавага свістка госці з Польшчы вырашылі дадаць галаўнога болю аўстрыйскай паліцыі і пачалі ўсяляк яе правакаваць. Падчас матча эстафету ў палякаў перанялі немцы. Агрэсіўна настроеныя балельшчыкі з Германіі пачалі выкрыкваць нацысцкія лозунгі пасля таго, як Лукаш Падольскі адправіў першы мяч у вароты Артура Боруца. У выніку паліцыя затрымала каля 150 балельшчыкаў, большасць з якіх з'яўляецца грамадзянамі Германіі. Пасля ідэнтыфікацыі асобы іх выслалі з краіны і занеслі ў чорныя спісы.

Невялікі інцыдэнт адбыўся і пасля матча зборных Расіі і Іспаніі. Віноўнікамі сталі трое прыхільнікаў зборнай Іспаніі, якія разбілі некалькі шыбаў у трамваі. Гарачыя іспанцы былі арыштаваныя, для іх першынство кантынента таксама скончана.

11 чэрвеня зноў вызначыліся адны з гаспадароў турніру — швейцарцы, якія не змаглі стрымаць эмоцый пасля паражэння сваёй нацыянальнай дружыны ад туркаў. Пасля матча, які праходзіў у Базэлі, швейцарскія фанаты ўчынілі масавую бойку ў раёне гарадскога вакзала. Агрэсіўна настроеных балельшчыкаў паліцыі давялося супакойваць гумавымі кулямі.

Такім чынам, падводзячы вынік «выступлення» фанатаў, можна зазначыць, што ў спісе самых недысцыплінаваных лідзіруюць немцы, палякі і швейцарцы. А самым непакойным месцам можна назваць аўстрыйскі Клагенфурт, якому даводзіцца перажываць нашэсце фанатаў, якіх налічваецца больш за 80 тысяч (гэта пры тым, што насельніцтва горада складае ўсяго 90 тысяч).

ПАМЁР БАЛЕЛЬШЧЫК ЗБОРНАЙ ХАРВАТЫІ

У аўстрыйскім Клагенфурце ад сардэчнага прыступу ў чацвер памёр малады балельшчык нацыянальнай каманды Харваты, які прыехаў на турнір падтрымаць сваю зборную. Нягледзячы на аказанне першай медыцынскай дапамогі, фанат, якому, па словах відавочцаў, было каля 20 гадоў, памёр па дарозе ў шпіталь перад пачаткам матча паміж зборнымі Германіі і Харваты. Асоба балельшчыка пакуль не высветлена.

Вакол Еўра

РАНАЛДУ — САМЫ ПРЫГОЖЫ НА ЕЎРА-2008

Паўабаронца зборнай Партугаліі Крыштыяну Раналду прызнаны самым прыгожым футбалістам чэмпіянату Еўропы-2008 па выніках апытання, праведзенага сярод 12 тысяч прадстаўніц прыгожай паловы кампаніяй LG напярэдадні старту турніру. Згодна з апытаннем партугалец найбольшай папулярнасцю карыстаецца сярод італьянак, немак і шведак. Другое месца дасталася форварду французскай каманды Цьеры Анры, а трэцяе падзялілі шведскі паўабаронца Фрэдзі Юнберг і капітан зборнай Італіі Фабіа Канавара, які ў апошні момант атрымаў траўму і на турнір не паехаў.

ЗБОРНАЯ ПАРТУГАЛІІ АДМОВІЛАСЯ АД КАНТАКТАВАННЯ

Футбалісты зборнай Партугаліі цяпер недаступныя для пасляматчавых каментарыяў. Кіраўніцтва каманды вырашыла адмовіцца ад кантактавання з журналістамі, прычыны такога рашэння не тлумачыцца. Некалькі дзён таму зборная Партугаліі забяспечыла сабе месца ў чвэрцьфінале, перайграўшы каманду Чэхіі. Таксама стала вядома, што настаўнік партугальцаў Луіс Філіпэ Скалары з 1 ліпеня ўзначаліць лонданскі «Чэлсі».

Абзац

■Медыкі знялі ўведзеную на мінулым тыдні забарону на купанне ў вадасховішчы Пціч. Закрыццё вадаёмаў у летнія месяцы часцей за ўсё звязана з пагаршэннем бактэрыялагічнага стану вады. Галоўная прычына забароны на купанне — павышанае ўтрыманне ў вадзе ўзбуджальніка кішачнай палачкі. Па стане на сённяшні дзень органы дзяржаўных санітарна-эпідэміялагічных службаў вынеслі забарону на купанне ў 12 вадаёмах рэспублікі, 8 з якіх знаходзяцца ў Брэсцкай вобласці. У Мінску закрытыя для купання вадасховішчы Цна і Дразды. З'явіліся закрытыя пляжы і ў Гомельскай вобласці.

■ Падчас святочнага канцэрту на Чырвонай плошчы ў Маскве ў час святкавання Дня Расіі абвешчаныя пераможцы ўсерасійскага конкурсу «Сем цудаў Расіі». У спіс галоўных славутасцяў краіны ўвайшлі: гара Эльбрус, Даліна гейзераў на Камчатцы, возера Байкал, прыродны помнік «Слупы выветрывання» ў Комі, Пецяргоф каля Санкт-Пецярбургу, Мамаеў Курган і статуя Радзімы-Маці ў Валгаградзе, сабор Васілія Блажэннага ў Маскве.

■ У Іспаніі затрыманы 18 членаў так званай «рускай мафіі», якія падазраюць у адмыванні грошай і кантрабандзе зброі. Сярод затрыманых знаходзяцца не менш чатырох лідараў арганізаванай злачыннасці. Усяго выпісана ордэраў на арышт 25 чалавек, прозвішчы якіх не агучваюцца. Як лічыцца, злачынная групоўка з былых выхадцаў з Савецкага Саюза, якую на захадзе называюць «рускай мафіяй», дзейнічае ў Іспаніі з пачатку 1990-х. Яе членаў падазраюць у адмыванні грошай, кантрабандзе зброі, заказных забойствах і карупцыі.

■ Папулярны чайны пакецік, гісторыя якога пачалася ў 1908 годзе ў ЗША, святкуе свой стогадовы юбілей. Вынаходніцтва адбылося выпадкова. Адпраўляючы клієнтам узоры тавару, нью-йоркскі купец, які гандляваў чаем, Томас Саліван для скарачэння выдаткаў раскладваў чай невялікімі дробкамі па маленькіх шаўковых мяшочках. Кліенты, не разабраўшыся ў хітрасці гандляра, апускалі мяшочкі ў гарачую ваду. Так зарадзіўся новы спосаб завараванне гарбаты. У масавую вытворчасць чайныя пакецікі паступілі толькі ў 1953 годзе, заведаўшы некалькі перайначванняў: спачатку шаўковыя пакецікі былі заменены на марлевыя, пазней — на папяровыя. Сучасны пакецік у сярэднім утрымлівае 3,125 грама гарбаты.

■ **У Бразіліі з мастацкай галерэі ў Сан-Паула ў чацвер былі выкрадзены некалькі дарагіх карцін. У музей днём уварваліся ўзброеныя рабаўнікі і вынеслі чатыры экспанаты. Сярод выкрадзеных работ дзве гравюры Пікасо «Мінатаўр, пітны фантан і жанчына» 1933 года і «Мастак і яго мадэль» (на фота) 1963 года. Ацэначны кошт выкрадзеных карцін пакуль не ўдакладняецца. У снежні 2007 года ўзброеныя рабаўнікі ўжо выкрадалі Пікасо з музея ў Сан-Паула. Работы Пікасо і вядомага бразільскага мастака Парцінары, коштам у 56 мільёнаў долараў, былі знойдзеныя праз тры тыдні пасля рабавання.**

■ На 92-м годзе жыцця пасля цяжкай і працяглай хваробы ў сваёй хаце ў хутары Пухлякоўскі Усць-Данецкага раёна Растоўскай вобласці памёр вядомы пісьменнік Анатоль Калінін. Калініна на Доне звалі апошнім прадстаўніком «данской літаратурнай роты», у якую ўваходзіў і яго сябар Міхаіл Шолахаў. Анатоль Калінін прайшоў Вялікую Айчынную вайну. Ён вядомы перш за ўсё дзякуючы сваім раманам «Звароту няма», «Грыміце, званы!», «Рэха вайны» і «Цыган».

Поўны абзац

■Уладальнік сеткі рэстаранаў горада Тайпэй у Тайвані абраў вельмі арыгінальны варыянт дызайну інтэр'ера і агульнай канцэпцыі ўстаноў. Тут прысесці вам прапануюць на ўніташ, сурвэткі пададуць у рулонах туалетнай паперы, а есці вам прыдзецца з бідэ. Падобнае новаўвядзенне карыстаецца поспехам у турыстаў і жыхароў. Асноўная публіка ва ўстанове — 15—35-гадовыя. Па словах уладальніка, «кожная дэталь установы кажа аб тым, што вы — у туалеце, а не ў рэстаране. Таму тут весела абедаць».

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

ШАШКІ

Пад рэдакцыяй майстра спорту Мікалая ГРУШЭЎСКАГА

РАЗВЯЖЫ, КАЛІ ЗДОЛЕЕШ

Сёння вашу здольнасць у гульні дапаможа праверыць заданне № 4 бліцконкурсу-38 — камбінацыйная мініяцюра Уладзіміра САПЯЖЫНСКАГА (Рагачоў):



БЕЛЫЯ: c1, d2, f2, g5, h6 (5). ЧОРНЫЯ: b4, c5, d4, e5, e7, h4 (6). Выйгрыш.

Аўтар працуе механікам у мясцовым АТУП-9. Нядаўна ён выйграў першынство рэспублікі па рашэнні шашачных галаваломак на 64-клетачнай дошцы, за што ад ГА «Беларуская федэрацыя шашак» атрымаў адпаведныя медаль і дыплом, а калектыў яго роднага аўтатранспартнага прадпрыемства вырашыў адзначыць свайго чэмпіёна грашовай прэміяй.

Пераможцаў конкурсу чакаюць сюрпрызы ад нашага шчодрага чытача Анатоля ПЯРХАЛЬСКАГА (Глыбокае) — яго зборнікі звяздоўскай рубрыкі «Шашкі» №№ 3-4 за 2005-2006 гады. Свае адказы накіроўвайце на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, рэдакцыя газеты «Звязда», рубрыка «Шашкі».

У. Сапяжынскі — кандыдат у майстры спорту па практычнай гульні ў шашкі. А яшчэ ён захапляецца складаннем уласных кампазіцый. Па-за конкурсам разгледзьце некаторыя з іх:

№ 1. БЕЛЫЯ: b6, c7, d6, f4, g5 (5). ЧОРНЫЯ: a5, b2, b4, d2, g7 (5).
1. gf6 2. cb8 3. b:c5!x.

№ 2. БЕЛЫЯ: b6, c7, d6, e7, f2 (5). ЧОРНЫЯ: a5, c3, d2, f8, g5 (5).
1. cb8 2. b:h6 3. h:c1 dc5 4. fe3 cb4 A 5. ca3x. A 4 ... cd2 5. ca3x.

№ 3. БЕЛЫЯ: b6, c7, e5, g5, h6 (5).ЧОРНЫЯ: a3, a5, f8, g3, g7 (5).
1. ef6 2. cb8 3. b:h2 ab2 4. hg7x.

№ 4. БЕЛЫЯ: b6, c1, c7, d4, f2, f4, g1, h6 (7). ЧОРНЫЯ: a3, b2, b4, d8, f6, f8, g7, h4 (8).
1. ba7 2. a:c5 3. de5 4. fg3 5. g:e7 6. h:b4! 7. c:a3 cd4 8. ab4x.

№ 5. БЕЛЫЯ: 22, 27, 28, 39, 41, 42 (6). ЧОРНЫЯ: 10, 12, 20, 29, 30, 36 (6).

А тут пашукайце перавагу за белых самастойна. Таксама будзем рады вашым разгадкам.

НЕ ТОЛЬКІ РАШАЕМ

Праверце, калі ласка, рашэнні змешчаных раней пазіцый.

БЛІЦ-38/3 (Г. Чэховіч, 1908 г.): fe7 (g3 A, g5) f:h6#. A (g5) d8, dg3!, e1, f2 (f4 B) hg3, g1#. B (h4) hg3#.

ПА-3А КОНКУРСАМ (В. Кульчыцкі, 1908 г.): cb6, b8 (h2 AB) g3, e5, e1x. A (f2) b4x. B (ab4, a3) h6 (c3, c1) h2-f4x.

Сярод правільна рашыўшых — дацэнт Белдзяржуніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі, прафесар Ваенной акадэміі Рэспублікі Беларусь Іван Астроўскі. Ён піша: «Вялікі дзякуй за старанную арганізацыю конкурсаў, і ад усёй душы віншую іх лаўрэатаў, жадаю ўсім удзельнікам моцнага здароўя, далейшых поспехаў і новых сустрэч на старонках нашай «Звязды»! Нарэшце — водпуск: спраў — не пералічыць, але шашкі будуць займаць належнае месца».

А токар-універсал магілёўскага завода «Тэхнапрылада» Дзмітрый Камчыцкі даслаў прыклады гульні з трэніровачных партый, у якіх прыгожа перамог члена зборнай свайго прадпрыемства Васіля Івачова:

№ 1. БЕЛЫЯ: a3, b4, c1, c3, d4, g1 (6). ЧОРНЫЯ: b6, d6, f4, f8, g3, h2 (6).

Усё чыста, як у кампазіцыі: 1. gf2 2. ba5 3. a:e7 4. a:g3 5. de5 6. cd2x.

№ 2. БЕЛЫЯ: b2, b4, c1, c3, e1, g1, h2 (7). ЧОРНЫЯ: a5, c7, e5, e7, g5, g7, h4 (7).

Колер шашак зменены: 1. bc5! cd6 2. cb4 3. ed2 4. cb2 5. gf2 6. h:a5!x.

КУБАК КЛУБА

У Мар'інай Горцы ладзіўся трэці абласны камандны турнір «Кубак шашачнага клуба «Дэбют», прадстаўнікі якога і заваявалі Кубак (Віктар Балахоўскі, Уладзімір Беляеўскі, Іван Блізнец, Віталь Габрыелян, Аркадзь Плакхін і Уладзімір Шарый). На другім месцы — дарослая каманда сталічнага СДЮШАР-11, на трэцім — мінскага завода «Падшыпнік». Ва ўласным заліку вызначыліся: 1. кандыдат у майстры спорту Дзмітрый Фадзееў (СДЮШАР-11), 2. майстар У. Беляеўскі і 3. заслужаны майстар спорту Рэспублікі Беларусь А. Плакхін.

Вам цікава будзе пазнаёміцца з фрагментам гульні гэтага спаборніцтва:

БЕЛЫЯ (Андрэй Валюк, СДЮШАР-11): a1, a3, b4, c3, d2, d4, e3, g1, g3, h2, h4 (11). ЧОРНЫЯ (В. Габрыелян, «Дэбют», Мар'іна Горка): a5, a7, c7, d6, d8, e5, e7, f4, f6, f8, g7 (11).

Сутычка міжнародных гросмайстраў: 1 ... ab6! 2. e:g5 bc5 3. d:b6 ed4 4. c:e5 a:e1 5. ba7 d:h6 6. ab8 ed6. Белыя здаліся.

Разам з ДАІ

БЯСПЕЧНАЕ СЁННЯ НАШАГА ЗАЎТРА

Апоўдні ў дварах Уздзенскай санаторнай школы-інтэрната абласнога падпарадкавання, нягледзячы на сонечнае летняе надвор'е — ціхаціха, не чутна ўдараў мячом па асфальце, посвісту скакалак, звонкага смеху. Бо ўсё тутэйшае дзіцячае насельніцтва пад наглядам важатых сабралася ва ўтульнай актавай зале і, затаіўшы подых, слухае… не паверыце: міліцыянераў. Дакладней, супрацоўнікаў Дзяржаўтаінспекцыі, якія праводзяць віктарыну на веданне правілаў дарожнага руху.

— Падарункаў у нас хопіць на ўсіх, але пры адной умове, — робяць паўзу людзі ў форме. Калі вы паабяцаеце, што будзеце заўжды ўважлівыя, і не толькі самі будзеце выконваць ПДР, але і дарослым, калі што, нагадаеце, як трэба рабіць. Дамовіліся?

І дзесяткі дзіцячых галоў згодна ківаюць: «Так! Будзем!».

На працягу года кожную чвэрць у школе-інтэрнаце аздараўляюцца і разам з тым вучацца больш як 150 дзяцей з Мінскай вобласці. У асноўным сюды трапляюць з захворваннямі сэрца, эндакрыннай сістэмы, страўнікава-кішачнага тракта; ёсць таксама дзеці са шматдзетных і няўдалых сем'яў. А летам — у некалькі змен па 21 дню — школу-інтэрнат запаўняюць дзеці з Узды і раёна. Цяпер іх тут 120 — ад вучняў малодшых класаў да амаль «дарослых» падлеткаў, але аднолькава цікаўных і няўрымслівых. Менавіта на іх і была разлічана спартыўна-забаўляльная, а разам з тым інфармацыйная праграма свята, арганізаванага сумесна арганізацыйнай структурай ДТСААФ Мінска і Мінскай вобласці, абласным ДАІ, Уздзенскім раённым камітэтам БРСМ.

Спачатку ўсім ахвотнікам інструктары ДТСААФ прапанавалі спаборніцтва па стральбе з пнеўматычных вінтовак — індывідуальнае і паміж атрадамі. Асобна можна было «пацэліць у яблычак» з пісталета, прычым сярод стралкоў аказалася нямала дзяўчат. Прызавых месцаў у спаборніцтве прадстаўніцы прыгожай часткі чалавецтва, праўда, не занялі, але задавальненне атрымалі немалое. Тым больш, прызы — камплекты валейбольных і футбольных мячоў — усё адно будуць выкарыстоўвацца цэлым атрадам, а вось іменныя граматы застануцца 10-і самым меткім стралкам на памяць.

Пакуль падводзіліся вынікі стралковага чэмпіянату, свята працягнулася невялікім канцэртам. Перад дзецьмі і важатымі Уздзенскай школы-інтэрната выступіў народны ансамбль ветэранаў вайны і Узброеных Сілаў «Памяць сэрца» пад кіраўніцтвам Мікалая Палякова. Можна было чакаць, што сёлетнія школьнікі ў лепшым выпадку будуць ветліва апладзіраваць, але… «Маруся, раздва-тры, каліна…», «Дзе салдат на горадзе», «Зямлянка» — гэтыя і іншыя песні дзеці заўзята падпявалі, паказваючы зайздроснае веданне слоў. А праводзілі ветэранаў увогуле стоячы, з бурнымі авацыямі, чым нямала расчулілі франтавікоў. «Дзеці — наша галоўная радасць», — перамаўлялі за сцэнай усхваляваныя сівыя артысты.

Менавіта таму, што дзеці — сённяшняя радасць і будучыня краіны, іх неабходна берагчы. Аб гэтым, настроіўшы прысутных на сур'ёзны лад, нагадаў кіраўнік ДАІ Мінскай вобласці падпалкоўнік Мікалай Караткевіч. «Мы з вамі жывём у мірны час, калі няма вайны. Але гэта вайна, на жаль, працягваецца на дарогах. За 10 гадоў у ДТЗ загінулі 15 тысяч грамадзян. Толькі ў Мінскай вобласці за год пад коламі аўтамабіляў гіне цэлы клас дзяцей, у рэспубліцы — 3—4 класы…». Зменшыць гэтыя страшныя лічбы ДАІ стараецца ў тым ліку з дапамогай такіх вось прафілактычных мерапрыемстваў — паездак па летніках і аздараўленчых базах, стварэння ў школах секцый юных інспектараў дарожнага руху, правядзення разнастайных конкурсаў і віктарын — так дзецям лягчэй запамінаюцца і ўтрымліваюцца ў памяці Правілы дарожнага руху. Напрыклад, у маі ў Барысаве прайшоў абласны злёт «Бастыёны мужнасці», і многія маладыя людзі — удзельнікі раённых камандаў змаглі здаць экзамены па ПДР і атрымаць вадзіцельскія пасведчанні катэгорыі «А» (на права кіравання матацыклам).

Уздзенскім школьнікам, улічваючы, што абсалютная большасць з іх да матацыклаў яшчэ не «дарасла», прапанаваліся іншы экзамен — па так званых «веласіпедных» білетах. Што цікава, абсалютна правільна на ўсе экзаменацыйныя пытанні адказала… дзяўчынка. Дый трыо прызёраў, якія дапусцілі ў 8 пытаннях усяго адну памылку, таксама аказалася амаль цалкам дзявочым. Алена Шытыка, Аня Іванчанка і Саша Глебка прадэманстравалі найлепшае веданне ПДР, за што і атрымалі прызы ад ДАІ — флікеры, плакаты і сувеніры ад «Звязды» — бейсболку, кубачак, блакнот.

— Вас не здзівілі вынікі экзамену? — цікаўлюся ў супрацоўнікаў ДАІ.

— Не, гэта карціна даволі тыповая. Адзінае што, дзеці трапіліся вельмі актыўныя — звычайна ледзьве выцягнеш пяць—шэсць чалавек, а тут было столькі ахвотнікаў, што білетаў усім не хапала.

— Значыць, дзяўчаты лепш ведаюць Правілы дарожнага руху? Адкуль жа тады анекдоты пра жанчын-вадзіцеляў?

— Дзяўчатам з-за большай цярплівасці, уседлівасці лепш даецца тэарэтычная частка. Дарэчы, сярод школьнікаў — юных інспектараў дарожнага руху таксама вельмі многа дзяўчат. Але з практычнай часткай, непасрэдна ваджэннем, лягчэй спраўляюцца хлопцы…

Усе іншыя ўдзельнікі іспытаў, нават калі далі ўсяго адзін правільны адказ, гэтаксама не засталіся без падарункаў — за смеласць і волю да перамогі. Акрамя таго, асаблівае захапленне ў малодшых выклікаў дазвол сфатаграфавацца на вуліцы з патрульнай машынай ДАІ, якую дзетвара літаральна абляпіла з усіх бакоў. Так што напрыканцы арганізатары канцэрта, спартыўных спаборніцтваў і віктарыны пачулі многа пляскання ў далоні. І яшчэ больш рознагалосых «дзякуй, прыязджайце яшчэ!».

Паводле назіранняў намесніка старшыні ДТСААФ Мінска і Мінскай вобласці Віктара Паўлава, падобныя мерапрыемствы маюць вельмі добры эфект. «Гэта і відовішчна, і запамінальна, змястоўна і карысна, — адзначае ён. — Таму за гэта лета мы плануем кожны месяц наведваць аздараўленчыя летнікі ў вобласці, правядзём каля 30 спаборніцтваў па стральбе, мотакросы, паказальныя гонкі картынгістаў». Напрыклад, адзін з такіх мотакросаў адбудзецца ўжо 19 чэрвеня ў Маладзечне — і на ім, паводле папярэдняй дамоўленасці з ДАІ сталічнага рэгіёна, усе ахвотнікі змогуць здаць тэарэтычны і практычны экзамен на атрыманне правоў катэгорыі «А». Так што лета на Міншчыне будзе дакладна не сумным, а дарогі — цьфу, цьфу, цьфу! — спадзяёмся, бяспечнымі.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.
Мінск — Узда — Мінск.
Фота аўтара.

ОАО «Минский приборостроительный завод»
ПРОВОДИТ ПОВТОРНЫЙ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН
по продаже недвижимости, расположенной в г. Минске по пр. Независимости, 58: комплекса зданий корпусов №№ 19, 19а, 40 общей площадью 7 045,3 кв. м.
Начальная цена продажи — **21 058 920 000** рублей РБ с НДС.
Задаток в размере 2 % от начальной цены объекта перечисляется на расчетный счет ОАО «Минский приборостроительный завод» № 3012000620011 в филиале ОАО «БПС-Банк» г. Минск, код 334, УНП 100363840.
Порядок проведения торгов оговорен в условиях проведения аукциона.
Аукцион состоится 25 июня 2008 года в 11.00 по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 58. Заявления и необходимые документы принимаются до 17.00 24 июня 2008 г. по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 58, ком. 603.
Справки по тел. 8 017 293 94 40, факс 8 017 331 41 97.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости»
ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН
по продаже обращенной в доход государства производственной базы 1991 года постройки со всеми коммуникациями, расположенной в д. Дубеи Солигорского района (вдоль трассы Минск—Микашевичи) на земельном участке пл. 7,8961 га, в составе: здание котельной, об. пл. 1297,2 кв.м; теплая стоянка, 686,5 кв.м; здание материально-технического склада, 483,3 кв.м; здание мастерской, 1794 кв.м; склад нефтепродуктов, 109 кв.м; стоянка на 24 сельхозмашины, 1275,7 кв.м; профилакторий для автомобилей, 1348,2 кв.м; контрольно-пропускной пункт, 48,1 кв.м; здание наружной мойки, 771,7 кв.м; административно-бытовой корпус, 1024,6 кв.м и др. Начальная цена – 3 376 490 210 белорусских рублей. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 06 июня 2007 г. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. **Аукцион состоится 15.07.2008 г. в 15.00 по адресу: г. Солигорск, ул. Козлова, 35, актовый зал.** Заявление на участие и необходимые документы принимаются по 14.07.2008 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.
Контактный телефон (8 017) 224 61 34.
Наш сайт в Интернете: www.rlt.by.
КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015.

Канадскі дзённік

КВЕБЕК

Вулічны рух: строга па правілах.

Першыя суткі нашага знаходжання на канадскай зямлі завяршаюцца паездкай у міжнародны аэрапорт Таронта, адкуль мы адправімся ў Квебек — правінцыю з французскім ухілам. На два тыдні яе сталіца — Квебек-Сіці — стала сапраўднай хакейнай Мекай. Яшчэ ў далёкім дзяцінстве я ведаў мясцовы клуб «Квебек Нордзікс», з якім рэгулярна праводзіў калядныя сустрэчы маскоўскі ЦСКА. Пазней гэты клуб быў прададзены іншым гаспадарам ужо не з квебекскай «прапіскай».

Праўда, агульнапалітычная тэма гэтага канадскага рэгіёна мяне цікавіла не менш, чым хакейная. Чаму ўсё ж такі прыярытэтнай мовай з'яўляецца французская, а не англійская? Высветлілася, што ў Канадзе Квебек атрымаў палітычную вагу і права голасу ў выніку «цікай рэвалюцыі» 60-х гадоў XX стагоддзя. Росквіт культуры суправаджаўся адмовай ад вядучай ролі каталіцкай царквы і адукацыі, ростам сацыяльнага дабрабыту і ўтварэннем новага сярэдняга класа. Яе прадстаўнікі працавалі ў асноўным на прадпрыемствах дзяржаўнага сектара эканомікі. Між тым праблема статусу Квебека ў межах краіны не знікла: цяпер яна стала яшчэ больш вострай, бо некаторыя палітычныя дзеячы для падтрымкі свайго імя на слыху ў выбаршчыкаў раз-пораз патрабуюць аддзялення Квебека ад Канады.

Зарабляем на жыццё.

Бацька і сын Аляксандр і Міхаіл ГРАБОЎСКІЯ.

Гісторыя сведчыць, што самы страшны эпізод у «квебекскім пытанні» адбыўся ў 1970 годзе, калі тэрарыстычная група «Фронт вызвалення Квебека» арганізавала крадзеж, а потым і забойства брытанскага дыпламата, а затым і міністра ўрада. Тады прэм'ер-міністр Канады П'ер Трудо аб'явіў аб увядзенні ваеннага становішча. Канадцы па ўсёй краіне былі шакіраваны з'яўленнем узброеных ваенных на вуліцах Манрэаля. Перажылі шок і жыхары Квебека. У выніку ўсіх гэтых узрушэнняў Канада афіцыйна стала дзвюхмоўнай краінай, а ўрад прыняў усе меры, каб павялічыць колькасць франкамоўных грамадзян на дзяржаўных пасадах.

Як бы там ні было, але ж Квебек-Сіці за некалькі наступных дзесяцігоддзяў атрымаў бурнае развіццё. Сёння сталіца ўжо даўно выйшла за межы сваіх сцен. Жылыя і дзелавыя раёны размяшчаюцца і ў прыгарадах. На вялікай алеі ўзвышаецца будынак Нацыянальнай асамблеі (Парламент правінцыі). У межах Верхняга горада ўсё здаецца зачараваным: як невялікія старадаўнія домікі, так і буйныя рэлігійныя ўстановы, што пабудаваны з аднаго і таго ж шэрага каменя. Калі спусціцца ўніз, то можна ўбачыць яшчэ больш рамантычныя вулачкі Ніжняга горада.

У дні правядзення 72-га чэмпіянату па хакеі з шайбай Квебек адзначыў сваё 400-годдзе. Кажуць, што ў яго вялікая і светлая будучыня.

Уладзімір ЗДАНОВІЧ, *Канада.*

Траецкая памінальная субота

Мы ўжо неаднаразова расказвалі пра тое, што сярод практычна ўсіх святочна-абрадавых комплексаў беларусаў важнае месца належала культу продкаў. Ушанаванне памерлых было настолькі моцным, татальным і ўплывовым, што парадзіла цэлую сістэму абярэгаў і паводзінных рэгламентацый.

Падкрэслена акцэнтаваны статус мелі свяшчэнныя дрэвы і гаі, якія, бадай што, успрымаліся своеасаблівым духоўна-культурным аналагам вясковых могілак (а некалі, відаць, і былі тым адзіным абрадавым цэнтрам, у якім спальвалі памерлых і адначасова бласлаўлялі саюз новаўтворанай маладой пары). Калі «клады» (рускае — кладбище, беларускае — кладавішча, кладовішча) характарызаваліся месцам апошняга прыстанішча фізічнага цела таго ці іншага сваяка, то свяшчэнны бярозавы ці дубовы гай — гэта «зямны рай», у якім свой прытулак знаходзілі душы сканалых сваякоў. Магчыма, якраз таму пад пагрозай смерці забаранялася ламаць галінкі дуба або зразаць дрэва цалкам.

Таму дыялог з продкамі меў у сабе адценне ўміласціўлення і адначасова — ахвярапрынашэння. І ўсё ж першнаперш зварот да продкаў быў, хутчэй, механізмам падтрымання і штогадовага аднаўлення свету, які мог бы сканаць, калі б чалавек раз за разам не аднаўляў механізм супрацьдзеяння Хаосу.

Шэраг абрадава-паводзінных прадпісанняў датычыўся традыцыі ўшанавання закладных нябожчыкаў. На Гомельшчыне ў тых сем'ях, у якіх быў тапелец, косці з велікоднага стала (ад пасхальнага парася) кідалі ў ваду (Мазырскі раён). А каб памянуць вісельнікаў, косці падвешвалі да столі.

Сярод славян шырока бытавалі павер'і аб тым, што парушэнне існуючых забаронаў можа ў будучым адмоўна паўплываць на ўсіх членаў сям'і або на вядзенне іх гаспадаркі. Так, балгары лічылі, што знакам бяды з'яўляецца зачадце і нараджэнне дзіцяці, а таксама смерць чалавека на Русальным тыдні. Такія людзі пасля смерці могуць стаць вампірамі. А.І. Нікіфароўскі сведчыць, што на Віцебшчыне забаранялася займацца шэрагам спраў: круціць, плесці, вязаць, калоць дровы, стрыгчы дзіця, авечку — іначай у сям'і народзіцца няўдалае дзіця. На Смаленшчыне забаранялася віць вяроўкі, плесці карзіны, рэзаць і калоць дровы, іначай у дзіцяці будзе «заячая губа» або «зашыта» попка.

ПАМІНАЛЬНЫЯ АБРАДЫ ТРАЕЦКАГА ТЫДНЯ: «ПАПАРЫЦЬ» І «ЗАМКНУЦЬ У КОЛА»

Разам з тым неабходна сказаць пра самую галоўную адметнасць памінальных абрадаў Траецкага тыдня. Акрамя таго, што ў Траецкую суботу ўшаноўвалі ўсіх памерлых, як і на Радаўніцу, аднак асаблівую ўвагу надавалі тым, хто скончыў жыццё самагубствам. Адразу ж напрошваецца пытанне: а чаму менавіта ў гэты час узгадвалі тых, да каго славянская і перш за ўсё хрысціянская традыцыя ставіліся як да злосных парушальнікаў запаветнага правіла «Бог даў, Бог узяў»?

Нашы сучаснікі ўжо практычна не прытрымліваюцца гэтага правіла, але яшчэ памятаюць, што людзей-самагубцаў не дазвалялася хаваць на агульных могілках побач з астатнімі прадстаўнікамі вашага роду. Некалі іх хавалі па-за межамі агульнавяскоўага кладавішча. А шматлікія гістарычныя і этнаграфічныя крыніцы больш ранняга часу сведчаць пра тое, што «задушных» або «закладных» нябожчыкаў (а імі лічылі не толькі самагубцаў, але і немаўлят, якія нарадзіліся нежывымі або памерлі нехрышчонымі) спачатку захоўвалі ў спецыяльных ямах за межамі населенага пункта і толькі ў суботу перад Тройцай іх хавалі па канонах адвечнай традыцыі.

За ўсімі гэтымі нечаканымі для нас этыкетнымі нормамі стаялі старажытнаславянскія ўяўленні аб тым, несвоечасовае пахаванне самагубцы паўплывае на ўрадлівасць зямлі, якая тут жа адгукнецца неўраджаем. Таму ў перыяд паміж Пакровамі і Тройцай самагубцаў хаваць катэгарычна забаранялася. І толькі тады, калі завершыцца веснавая сяўба, калі зерне прарасце новай сцяблінай, зямля зачала новым ураджаем, неабходна было «ачысціць» яе ад заўчасна сканалых і пахаваць іх на вечны спачын. Таму хочацца далікатна нагадаць нашым чатачам: калі ў вашым родзе былі людзі, якія пакінулі гэты свет па сваёй уласнай волі, **то не забудзьце ўшанаваць іх памяць якраз у памінальную суботу перад Тройцай.** Разам з тым яшчэ раз паўторым: Траецкая субота адрасавалася і даўно памерлым продкам — дзядам. Адсюль і адпаведныя назвы Траецкай суботы: Троецкія Дзяды, Трояшные Деды, Радзіцельская субота, Стаўроўскія Дзяды, Духаўская субота.

Вядомы два варыянты святкавання Траецкай суботы. У адным выпадку жывыя наведвалі могілкі і «гасцявалі» ў памерлых дзядоў, у другім — памерлыя «запрашаліся ў госці» дадому і ў хаце ладзілася святочнае сталаванне. Разгледзім кожны з варыянтаў больш падрабязна.

Нашы шматгадовыя назіранні сведчаць пра тое, што ўшанаванне памерлых на Тройцу ў абрадавай і атрыбутыўнай частцы мела шмат падобнага да памінання на Радаўніцу, толькі з адной папраўкай на больш аддалены час ад Вялікадня. З самай раніцы людзі цэлымі сем'ямі прыходзяць на могілкі, наводзяць парадак на магілах сваіх продкаў. Аднак — вельмі важная дэталь абрадавага кантэксту — калі на Радаўніцу і Восеньскія Дзяды магілы прыбіралі венікамгаляком (дзеркачом), то на Траецкія Дзяды венік быў «жывым» — яго рабілі з зялёных бярозавых галінак. Фактычна перад намі абрад-мадыфікацыя або той самы абрад памінання продкаў на Восеньскія Дзяды, толькі з яго перамяшэннем у прасторы — непасрэдна могілкі.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Такім чынам, атрымліваецца, што Траецкія Дзяды статусна вылучаліся з шэрагу памінальных святаў не толькі структурай абрадавых падзей, але і характарам трохбаковага дыялогу, у якім бралі ўдзел прадстаўнікі свету жывых, «свету» памерлых і свяшчэннае дрэва — галінкі бярозы — як уваскрашэнне душаў гэтых самых памерлых.

Чаму раптам чалавеку спатрэбілася прысутнасць усіх «суб'ектаў» віртуальна-абрадавага дыялогу? Магчыма, таму, што ў гэты час рэзка актывізаваліся душы закладных нябожчыкаў — русалак, якія пачыналі ўсё больш і больш аваладваць прасторай зялёнага наваколля і маглі прынесці жывым бяду, калі іх своечасова не ўшанаваць, не прытрымлівацца шматлікіх забаронаў і прадпісанняў, звязаных з траецка-русальным перыядам.

Д.К. Зяленін адзначае, што на Віцебшчыне існаваў звычай, калі ў Траецкую суботу кожны са сваякоў прыносіў на могілкі бярозавую галінку. Самы старэйшы звязваў усе галінкі разам і тым венікам «парыў» магілкі. А затым па ўзросце гэту абрадавую працэдуру выконваў кожны з прысутных. Надзвычай цікавы ход у развіцці памінальнага абраду. Структурна ён блізкі да перадачы чаркі па кругу на Радаўніцу.

Непасрэдна да гэтых шляхоў фарміравання абрадавай семантыкі прымыкае яшчэ адзін, які паўплываў на ўзнікненне паняцця «опахивать» магілу (беларускія эквіваленты: абворваць, акрэсліваць, узвесці мяжу, адмежавацца, лакалізаваць з мэтай перасцярогі). За гэтым рытуальным вызначэннем стаяць не толькі дзеянні па навядзенні парадку, але яшчэ і ўзвядзення сімвалічнай мяжы вакол магілы. Зноў-такі напрошваецца паралель: калі на Радаўніцу з мёртвымі «хрыстосаваліся» — крыжападобна качалі чырвонае яйка па магіле, цалавалі крыж, г.зн. адбываўся прамы кантакт з месцам захавання прадка, то на Траецкія Дзяды надмагільнае ўзвышша быццам бы імкнуліся ізаляваць ад наваколля, у тым ліку і нават ад самой прасторы іншасвету. Навошта паўставала такая неабходнасць і каго спатрэбілася ізаляваць? Магчыма, усё ж за гэтай мэтанакіраванай перасцярогай стаялі постаці тых самых закладных нябожчыкаў, людзей, якія пры жыцці займаліся чарадзействам або вядзьмарствам, а пакінуўшы гэты свет, сталі біяэнергетычнымі вампірамі і працягвалі шкодзіць людзям нават і пасля смерці. Забітага асінавага кала было мала, каб утаймаваць іх ненажэрнасць, тады ў ход пускалі самы надзейны магічна-ахоўны сродак — месца яго пахавання замыкалі ў кола.

Выкарыстанне свежых бярозавых венікаў у абрадзе «парыць» нябожчыкаў дазваляе зразумець сэнс забароны нарыхтоўваць іх для мыцця ў лазні да Тройцы. Мы зноў сутыкаемся з дзейнасцю звычаёвага нарматыву «перш, чым для сябе — падзяліся з продкамі». Гэта ж залатое правіла народнай культуры вымагала выканання яшчэ аднаго абрадавага дзеяння: назаўтра будзе Тройца, і падворкі будуць упрыгожаны маладой зелянінай, але ж папярэд гэту рытуальную працэдуру неабходна было выкарыстаць і ў дачыненні да памерлых. Таму ў Траецкую суботу на Смаленшчыне магілкі і крыжы ўпрыгожвалі свежымі бярозавымі вянкамі.

Яшчэ адной адметнасцю вызначаліся абрадавыя кантакты паміж жывымі і продкамі на Тройцу. Калі на Радаўніцу сімвалам родавай пераемнасці было чырвонае яйка, асвечанае на Вялікдзень, то да Траецкіх Дзядоў асобна гатавалі яйкі і фарбавалі іх у жоўты або зялёны колер. Апошні дасягаўся яркраз тым, што ў гаршчок дабаўлялі бярозавае лісце. А вось сімволіка жоўтага колеру можа быць больш складанай і апасродкаванай. Калі ўлічыць, што жоўты колер тоесны сімволіцы золата, то няцяжка зразумець, што ў гэтым выпадку прасочваецца прамая сувязь з іншасветам, з нячыстай сілай, д'яблам.

«ДЗЯДОЎ» ЗАПРАШАЛІ ДАДОМУ, АБО ТРАЕЦКАЯ ПАМІНАЛЬНАЯ ВЯЧЭРА

У Беларусі адначасова з варыянтам шанавання продкаў непасрэдна на могілках існавала традыцыя запрашаць «дзядоў» да сябе дадому. Па ўсім бачна, што Траецкая субота займала ў сістэме памінання продкаў вельмі важнае месца. Аб гэтым сведчыць характар падрыхтоўкі да самога свята: ён у пэўнай ступені нагадваў перадвелікоднае абнаўленне хаты і падворка. Хлопцы старанна вымятлі двор, гаспадыня з дочкамі прыбіралі ў хаце: абнаўлялі фіранкі, вешалі новы ручнік-набожнік, выбіралі попел з печы. Асаблівая ўвага надавалася чырвонаму куту. Е.І. Крук (бабуля аднаго з аўтараў) расказвала, што на сходзе дзвюх лаў на вечка ад дзяжы клалі жытні бохан хлеба, выпечаны ў чацвер — на Сямік, з якім хадзілі на могілкі. Аднак наведвалі могілкі прадстаўнікі толькі тых сем'яў, у якіх памерлі маленькія дзеці («гадоў да трох»). У хлеб уторквалі грамнічную свечку, побач ставілі сальнічку з асвячонай велікоднай соллю. Як толькі непачаты бохан хлеба забяруць, на вечка клалі невялікі акраец ад ужо распачатага бохана і загортвалі яго канцамі ручніка. Назаўтра ж, калі хату будуць упрыгожваць зелянінай, на вечка пакладуць: а) калі памерла дзяўчынка, то вянок з бярозавых галінак, у якія ўпляталі лекавыя зёлкі, б) калі памёр хлопчык, то дзерасовы вянок. Побач з вёскай працякае рэчка Гаць, і праз тыдзень гэтыя вянкі пускалі на ваду, прычым пускалі, паварочваліся і ішлі да вёскі, не азіраючыся.

Траецкая субота вылучалася ў шэрагу іншых тым, што ў гэты дзень у печы палілі двойчы. Каб прыгатаваць страву для памінальнай вячэры, печ падпальвалі ўжо адвячоркам. Яшчэ адзін цікавы нюанс. Калі ж збіраліся гатаваць страву для дзядоўскіх памінак у Траецкую суботу, то ў печ клалі толькі бярозавыя паленцы. Як на Восеньскія Дзяды, так і на Траецкія гаспадыня гатавала няцотную колькасць страў, сярод якіх зноў-такі былі тыя, якія з'яўляліся абавязковым атрыбутам усіх жалобна-памінальных сталоў: перш за ўсё бліны, асабліва грэцкая, ячная або пшонная каша, яечня, просвірка, купленая ў храме або яе вясковы абрадавы эквівалент — «канон» («канун») з крышанага хлеба, размочанага ў вадзе з мёдам. Калі выпякалі хлеб пшанічны, то ў «канон» дадавалі тоўчаны мак. Адной з абавязковых памінальных страў быў ягадны кісель.

Правядзенне святочнай урачыстасці адбывалася за вялікім сямейным сталом, які ставілі не так, як заўсёды — паралельна асноўным сілавым лініям, уздоўж сцяны ад двара, а, наадварот, пад трэцяй — радаводнай — бэлькай: ад чырвонага кута і ўздоўж сцяны ад вуліцы.

У чырвоным куце садзіўся гаспадар, злева ад яго — жаночая палавіна сям'і, справа — мужчынская. Памінальная вячэра пачыналася з малітвы і рытуальнага запрашэння душаў памерлых продкаў да сумеснага сталавання. Заўважым, што ў некаторых сем'ях пералік радаводных пакаленняў — мама, дзядуля, прадзед і інш. — меў характар дакладнай канкрэтызацыі: імёны даўно памерлых сваякоў былі «запісаны» («упісаны» на другой бэльцы хаты, якая і выконвала ролю радаводнай кнігі. Таму і гэты жалобны стол ставілі ўпоперак хаты, непасрэдна пад бэлькай. На самым пачатку па чарзе пускалі абрадавую кашу або «канон»: кожны з прысутных браў з агульнай місы па тры лыжкі. Затым адбывалася самае галоўнае абрадавае дзеянне, якое было сімвалам памінальнай трызны, знакам лучнасці, непадзельнасці розных пакаленняў людзей — жывых і памерлых. Гэтым амулетам-абярэгам і адначасова знакам родавай непарыўнасці была чарка, якая перадавалася зноў-такі па чарзе і была за сталом толькі адна. Гаспадар наліваў чарку і перадаваў яе самаму старэйшаму прадстаўніку вялікай сялянскай сям'і. Той адліваў некалькі кропель на абрус або на край посуду. А большую частку выпіваў сам. Чарка далівалася і перадавалася наступнаму. Вось так яна хадзіла над сталом, быццам чаўнок над кроснамі, і знітоўвала ў адзінае цэлае прадстаўнікоў розных пакаленняў. Часцей за ўсё асноўныя стравы-закускі таксама падаваліся ў адной місе, з якой кожны браў па старшынству. Але першую лыжку ўсе прысутныя (і абавязкова кожнай стравы) адкладвалі ў агульную місу, якую затым ставілі ў адной з рытуальных зонаў хаты: на покуці, на парозе або на падваконні.

Вячэра працягвалася нядоўга. Людзі елі моўчкі, гаварыць дазвалялася толькі старэйшым членам сям'і, якія дзяліліся ўспамінамі аб дзядах-прадзедах, засяроджваючы ўвагу на больш важных падзеях і на тых постацях, жыццё якіх ужо даўно «абрасло» легендамі.

Напрыканцы памінальнай вячэры зноў чыталі малітву пры запаленай свечцы, а затым адпраўлялі «запрошаных» гасцей дадому: «Няхай са святымі пачываюць, а нам хлеба-солі засылаюць».

Адзначым і тое, што ўяўны кантакт з душамі памерлых продкаў вымагаў ад старэйшых членаў сям'і не толькі выканання рытуальна-магічных дзеянняў засцерагальнага характару (чытанне малітвы), але і выкарыстання адпаведных атрыбутаў-абярэгаў. Напрыклад, у Слонімскім павеце Гродзенскай губерні на працягу ўсёй вячэры ў хаце былі адчынены дзверы, у якіх стаяла барана. Гэта ўжо другі выпадак выкарыстання адной з земляробчых прылад у магічна-абрадавай практыцы траецка-русальнага тыдня. Барана выконвала функцыю абярэга, які, як рэшата, свабодна «прапускаў» душы сваіх родных, а з другога боку, рабіў адчыненыя дзверы непарадольным бар'ерам для прадстаўнікоў нячыстай сілы.

Аксана КАТОВІЧ.
Янка КРУК.

Спадчына

УЗГАДАЦЬ УСІХ — КАБ ПАМЯТАЛІ НАШЧАДКІ

У Бялыніцкім раёне пры райвыканкаме стварылі камісію для мемарыялізацыі выбітных асобаў, значных падзей і гістарычных месцаў.

Камісію ўзначальвае намеснік старшыні райвыканкама Надзея Серыкава. У склад камісіі ўвайшлі прадстаўнікі ўлады, журналісты, работнікі культуры, настаўнікі, краязнаўцы. Бліжэйшым тыднем яны збяруцца на першае пасяджэнне, дзе будзе абмяркоўвацца праграма мемарыялізацыі Бялыніччыны.

Першыя крокі на гэтым шляху ўжо зроблены. Нядаўна ў райцэнтры адкрылі мемарыяльную дошку Віктара Хаўратовіча: ён быў будаўніком па прафесіі і добрым паэтам па натхненні.

У пачатку ліпеня ў Галоўчыне будзе ўсталяваны памятны камень у гонар 300-годдзя бітвы паміж шведамі і рускімі. Шведы тады перамаглі, але гэта была апошняя вікторыя Карла XII. Пётр I са злосці расстрэляў салдат, якія атрымалі раненне ў спіну — за тое, што беглі з поля бою. Камень у Галоўчыне — у пэўным сэнсе знак прымірэння: на шыльдзе напісана «Вечная памяць воінам, якія загінулі ў бітве» — і шведам, і рускім.

У перспектыўны план мемарыялізацыі прапануецца ўключыць з паўсотні пазіцый. Гэта перш за ўсё выбітныя асобы, якія пакінулі значны след у гісторыі Прыдруцкага краю. Напрыклад, Лёў Сапега, які заснаваў касцёл і кляштар кармелітаў, хоць сёння ад іх былой велічы толькі і засталася выратаваная і складзеная па кавалках фрэска ў музейнай экспазіцыі. Альбо вынаходнік падводнай лодкі Казімір Чарноўскі, ураджэнец вёскі Карытніца Бялыніцкага раёна.

— Гістарычная падзея адбылася ў 1924 годзе ў вёсцы Васількі, што ў Галоўчынскім сельсавеце, — нагадвае ўдзельнік камісіі Міхаіс Карпечанка. — Яе жыхары пракапалі канал для асушэння балота, за што былі ўзнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга БССР за нумарам 1. І нават камень захаваўся, дзе стаяў Чарвякоў, які з нагоды ўручэння ўзнагароды прыязджаў у Васількі.

Камісія па мемарыялізацыі не забудзецца і на зніклыя вёскі. Напрыклад, вёска Галдабуршчына знікла з карты Бялыніцкага раёна, але яна знакамітая тым, што тут нарадзіўся Віталь Сушчынскі. Ён быў адным з першых лётчыкаў Беларусі і першым лётчыкам Запаляр'я. Сушчынскі ваяваў на Першай сусветнай вайне, а загінуў у час бальшавіцкага тэрору ў 1937 годзе.

Праграма па мемарыялізацыі Бялыніцкага раёна будзе распрацаваная да 2013 года.

Ілона ІВАНОВА.

Пасля пісьма

Па закону? Ці як задумаецца?

...Калі не ведаеш, куды ўжо і скардзіцца, пішы ў рэдакцыю, там разбяруцца. Менавіта гэтым правілам карыстаюцца многія чытачы.

Лідзія Аляксееўна Гурская з Уздзенскага раёна не выключэнне. Тут, у вёсцы Магілына, паведамляе яна, мы з мужам пражылі ўсё жыццё — нікога не чапалі. І нас ніхто... Пакуль летась па суседстве не купілі пад дачу старую хату. Спачатку, піша жанчына, мы нават рады былі, бо і сама пакупніца, і бацькі яе — з нашай вёскі... Пачалі заліваць падмурак, разгарнулі будоўлю, — ніякіх праблем: будуйцеся, калі грошы ёсць. Але ж сёлета ў сакавіку яны сталі праводзіць каналізацыю. І, чамусьці, з нашага боку. Муж тады падышоў, папытаўся, што ж вы робіце — у мяне блізка студня, склеп... Аднак на ягоныя словы ніхто не звважаў. Звярнуліся тады да старшыні сельскага Савета Яніны Іванаўны Майсюк. Яна, праўда, прыйшла, спытала ў будаўнікоў, дзе праект? Тыя адказалі, што ўсё ў гаспадара. Яна выклікала санстанцыю. Ужо адтуль прыехала жанчына. Прызнала, што ўсё робіцца не па правілах, і загадала спыніць работы. Але і яе ніхто не паслухаў...

Яніна Іванаўна мяне супакойвала, працягвае жанчына, казала: калі ёсць парушэнні, дачнікаў прымусяць усё перарабіць. Размова гэтая была ў пятніцу. У суботу будаўнікі не працавалі, а ў нядзелю прыехалі зноў. Сталі ўкладваць трубы. Мы зноў пайшлі сварыцца, скардзіцца галоўнаму ўрачу санстанцыі. На будоўлю яшчэ раз прыехалі спецыялісты, зноў (чамусьці крокамі) мералі адлегласці ад «аб'екта» да нашай студні. Адказалі мне, што дадзена прадпісанне перанесці каналізацыю па сцёку грунтовых водаў на 50 метраў. Мы вырашылі, што цяпер ужо забудоўшчыкі не могуць не паслухацца.

Але яны, калі нас дома не было (адпасвалі кароў), прыехалі і ўсё... дарабілі. Мы вымушаны зноў пайсці па крузе. Што вельмі дзіўна, бо з вёскі робяць аграгарадок і, наколькі мы разумеем, усё ў ім павінна быць па закону, а не так, як каму задумаецца.

Ліст Лідзіі Аляксееўны рэдакцыя накіравала ва Уздзенскі райвыканкам, атрымала афіцыйны адказ. Як патлумачыў старшыня выканаўчага камітэта спадар Пожах, заява разгледжана з выездам на месца. Прычым — камісіяй у складзе начальніка аддзела архітэктуры і будаўніцтва, старшыні Нёманскага сельскага выканаўчага камітэта і супрацоўніка ДУ «Уздзенскі раённы цэнтр гігіены і эпідэміялогіі». На момант абследавання ўчастка будаўнічыя работы спынены, уладальніку накіравана прадпісанне аб перанясенні каналізацыйных калодзежаў і ўказана на неабходнасць узгаднення месца іх размяшчэння з органамі санітарнай і архітэктурнай службаў раёна.

Пытанне, паведамляецца ў заключэнне, застаецца на кантролі ў ДУ «Уздзенскі раённы цэнтр гігіены і эпідэміялогіі».

На кантролі яно, зразумела ж, застаецца і ў рэдакцыі «Звязды». Бо трэба ж даведацца «па закону ўсё будзе ў тым аграгарадку, ці так, як каму задумаецца»?

«Гарачы» тэлефон «Звязды» 287 17 41

Таніроўка шкла: абмежаваны агляд і пагаршэнне дысцыпліны ў вадзіцеляў

Наш пастаянны чытач з Наваполацка Віктар Віктаравіч Багданаў захацеў набыць аўтамабіль. Ужо і з маркай вызначыўся, з прадаўцом папярэдне дамовіўся, аднак па месцы жыхарства яму сказалі: можаш гэтага не рабіць, машыну ўсё роўна не зарэгіструем, бо задняе шкло ў ёй — таніраванае.

Вось заяўнік і папрасіў даць адказ праз газету, папярэдне звярнуўшыся ў кампетэнтныя арганізацыі: як задняе таніраванае шкло ўплывае на бяспеку руху?

— У Правілах дарожнага руху сказана, што яно павінна мець пэўны паказчык святлопранікнення. Хто і як яго вызначае? Тыя ж Правілы дапускаюць выкарыстанне аўтамабіля са шторкамі і жалюзі на заднім шкле, праўда, пры наяўнасці бакавых люстэркаў задняга віду. Дзе логіка? — пытаўся чытач.

Па просьбе рэдакцыі кампетэнтны адказ на запыт Віктара Багданава быў дадзены УДАІ Міністэрства ўнутраных спраў.

«Святлопранікальнасць аўтамабільнага шкла рэгламентавана патрабаваннямі Правілаў дарожнага руху (пункт 194.12), дзяржаўнага стандарту СТБ 1639 «Шкло бяспечнае. Агульныя тэхнічныя ўмовы» і распараджэннем Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 4 красавіка 2006 года № 116рп «Аб святлопранікальнасці шкла механічных транспартных сродкаў».

Аўтамабіль, які мае таніраванае шкло, значна абцяжарвае вадзіцелю выкананне такіх манеўраў, як рух заднім ходам, разварот на абмежаванай прасторы, у цэлым абмяжоўвае агляд ззаду аўтамабіля. Яшчэ больш ускладняецца кіраванне такім аўтамабілем у цёмны час сутак, у тумане, а таксама ў асенне-зімовы перыяд.

Акрамя таго, забарона на таніроўку шкла ў свой час была звязана і з ускладненнем аператыўнай абстаноўкі са злачыннасцю на транспарце, а таксама з пагаршэннем транспартнай дысцыпліны ў цэлым.

У апошні час мы можам канстатаваць паляпшэнне крымінагеннай абстаноўкі ў сферы аўтамабільнага транспарту, і пэўны ўклад у дасягненне гэтага выніку, на наш погляд, забяспечаны ў тым ліку павышанай увагай да дадзенай праблемы».

Сяргей РАСОЛЬКА.

Радзільны дом у Магілёўскім заасадзе

На працягу апошняга месяца тут нарадзіліся сямёра дзікоў, высакароднае аленяня, тры казуляняці і лісяня.

Маленькіх дзікоў, якія нарадзіліся чатыры тыдні таму, у заасадзе называюць парсючкамі. Яны адразу сталі любімцамі публікі, бо штодня ладзяць у вальеры вясёлае сямейнае шоў — кусаюць за хвасты сваіх бацькоў, прычым вялізныя і грозныя дзікі цярпліва зносяць забавы малых. Людзі любуюцца высакародным аленянём, якое апекуе маці Каська. Нараджэнне трох казулянят — асабліва радасная падзея ў заасадзе, таму што раней атрымаць патомства казуляў не атрымлівалася.

Радзеі за ўсё наведвальнікі заасада бачаць лісяня, таму што маці толькі зрэдку выносіць малое ў зубах з будкі.

Цяпер у заасадзе чакаюць прыбаўлення ланяў і плямістых аленяў. Разам з двума зубранятамі Лёшкам і Кузьмой, якія нарадзіліся не так даўно, атрымліваецца невялікі «дзіцячы садок». «Будзем ставіць патомства на ногі», — падзёра заявіў кіраўнік заасада Георгій Маліноўскі. Маладыя жывёлы папоўняць статкі ў вялікіх вальерах.

Ілона ІВАНОВА.

Ну і ну!

У СТАРШЫНІ СВК ЛІПКІЯ РУКІ. ДА «БАКСАЎ»

Калі б тыя адзінаццаць мільёнаў рублёў, што паступілі ў касу аднаго з сельскагаспадарчых вытворчых кааператываў Петрыкаўскага раёна, не з'явіліся вынікам крымінальнай здзелкі, то і заметкі гэтай на старонках нашай газеты не было б.

Бо за ўказанай сумай пацягнулася іншая — паўтары тысячы долараў. Хабару. Менавіта на яго нацэлілася кіраўнік той гаспадаркі, калі вырашыла рэалізаваць спісаны энерганасычаны трактар «Кіравец» старонніх асобам. Рэшткавы кошт яго быў аб'яўлены ў вышэй памянёнай суме, хоць цана яго была куды большай. Але старшыня паставіла ўмову: за гэта павінна быць разуменне пакупніка ў тым сэнсе, што яе трэба заахвоціць. Паўтары тысячы «баксаў». Іх яна атрымала ў легкавушцы на дарозе недалёка ад вёскі Грабаў. Каб ніхто не бачыў і не чуў. Але каму гэта трэба было — убачылі і пачулі. І, вядома ж, затрымалі...

НА ЛАВЕ ПАДСУДНЫХ — 12 ЧАЛАВЕК

Больш як дзесяць гадоў у Жлобіне дзейнічала злачынная арганізацыя, у якую ўваходзіла некалькі аўтаномных груп. Кожная з іх спецыялізавалася на пэўных відах злачынства ў маштабах рэгіёна і на ўзбраенні мела пнеўматычную і агнястрэльную зброю, маскі і камуфляжную форму.

Адна з груп займалася «выбіваннем» грошай у індывідуальных прадпрымальнікаў, бізнэсменаў, другая — крадзяжом каляровых металаў з Беларускага металургічнага завода. Трэцяя — прымушала яго работнікаў красці (выносіць ці вывозіць) шляхам злоўжывання службовымі паўнамоцтвамі таварна-матэрыяльныя каштоўнасці. Злачынную арганізацыю ўзначальваў раней судзімы 42-гадовы жыхар горада, які абавязаў кіраўнікоў тых груп частку «зароблены» грошай уносіць у крымінальную касу — «абшчак», каб развівець далей злачынную дзейнасць і падтрымліваць тых, хто адбываў пакаранне ў калоніях. Крымінальныя справы злымыснікаў (дарэчы, сярод іх і чатыры работнікі БМЗ) раскрылі супрацоўнікі ўпраўлення КДБ па Гомельскай вобласці. Трэба вывучыць і прааналізаваць больш за 30 эпізодаў злачыннай дзейнасці, дапытаць каля 30 пацярпелых і больш за 100 сведкаў.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

Простыя рэчы

ПОЛЕ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Камедыя Янкі Купалы «Паўлінка». Адольф Быкоўскі ў хаце Паўлінкі, да якой мае вялікі інтарэс, маніць, пахваляецца сваёй гаспадаркай. Ураджай сёлета: «Жыта нажаў коп са дзвесці, аўса таксама са дзвесці, ячменю з сотню».

А капа ж гэта 60 снапоў! Зразумелае пытанне: колькі ж у пана Адольфа зямлі?

Добрыя валокі з паўтары. І з іх лесу паўвалокі — сасёнка да сасёнкі, і лугу паўвалокі — мурог, як шафран. Аказваецца, ворнай зямлі ў яго толькі паўвалочкі. Маці Паўлінкі дзівіцца:

«У нас ворнай зямлі, мусіць, і са тры валокі будзе і то мы столькі не нажалі».

Вось дзе галоўны інтарэс Быкоўскага — тры валокі ворнай зямлі і адна дзяўчына ў сям'і.

Але сёння нас не цікавіць сюжэт камедыі, пагаворым пра гэтыя самыя валокі.

З 1552 года ў Вялікім княстве Літоўскім пачалася, можна сказаць, вялікая аграрная рэформа — валочная памера. Гэта быў комплекс мерапрыемстваў, у аснове якіх ляжаў абмер і ўлік зямель на стандартныя ўчасткі, валокі (21,36 гектара). Валокі павінны былі мець форму чатырохвугольніка і падзяляцца на тры палі. На сярэднім полі размяшчалася вёска. Некалькі вёсак складалі войтаўства, некалькі войтаўстваў — воласць. Улады намагаліся пасадзіць кожную сялянскую сям'ю на валоку. Бывала, валоку бралі і дзве-тры малалікія сям'і. Было ў рэформе шмат нюансаў, супярэчнасцяў. Але ў цэлым яна мела прагрэсіўны характар. Нездарма валочная сістэма землекарыстання праіснавала шмат стагоддзяў. Ды і сёння спытайце ў любога старога чалавека ў нашых мясцінах: колькі іх сям'я мела зямлі да 1939 года. У адказ пачуеце — валока, паўвалочка, чатвартак. Толькі потым разам з вамі ён будзе пераводзіць гэта ў гектары. Справа ў тым, што ад якасці зямлі і валока ў розных мясцінах была неаднолькавай.

Да пачатку XX стагоддзя праіснавала паўсюль на Беларусі і ўведзеная тады трохпольная сістэма земляробства. Пры ёй ворная зямля падзяляецца на тры змены. З іх адно поле, папарнае, кожны год гуляе, адпачывае. Увосень на папары сеялі жыта.

Размову пра поле я і не мог пачаць інакш, як пра поле сялянскае, поле-карміцельку. Нездарма ў беларускім фальклоры так багата прадстаўлены жніўныя песні, дзе абавязкова ёсць і поле.

Гаварыла поле шырокае,
Жыта ядранае:
— Не магу я на полі стаяці,
Каласочкам махаці,
Толькі магу на полі капамі,
У гумне стагамі.

І поле — не толькі праца. Гэта сімвал жыцця (нават не будзем згадваць вядомую прыказку) няпростай, найперш жаноцкай долі.

Ой, не ляжы, вецер, у полі
Паміж горачак у разоры,
Ды ўстань, ветру, памаленьку,
Павей, ветрык, паціхеньку,
Развей хмарачку цямненьку —
Маю тугу цяжаленьку.

Якімі ўсё-такі рознымі гістарычнымі шляхамі ішлі народы, ператвараючыся ў нацыі. Якраз у той час, калі на вялікакняжацкай Беларусі праводзілася валочная памера, адкрываліся шляхі для стварэння фальваркавых, сялянскіх гаспадарак, у Англіі адбывалася свая аграрная рэформа, дазволеная парламентам. Яна называлася «агароджваннямі». Сутнасць у тым, што феадалы сганялі сялян з зямлі, канавамі, зыгарадкамі і іншым агароджвалі захопленыя землі, патрэбныя ім найперш для авечкагадоўлі. У рэшце рэшт, гэта рэформа прывяла да знікнення ў краіне сялянства як класа.

І яшчэ гістарычнага. Звярніцеся да былых, да сённяшніх школьнікаў з прапановай назваць знаёмыя ім славутыя полі бою. Адказ будзе практычна аднолькавы: альбо Кулікова, альбо Барадзінскае. Ну, самы дасведчаны ўспомніць, магчыма, пра самую вялікую танкавую бітву на Курскай дузе. А ці мае тое поле назву? Не помню і я. Помню, што бліжэйшы населены пункт называўся Прохараўкай.

Што ж да Кулікова поля, то бліся між сабою там войскі князя Дзмітрыя, сярод іх і полацкія дружыны, і войскі Мамая. Але гістарычныя падзеі гэтага 1380 года даволі цьмяна дайшлі да нас. Малазразумелая і роля беларускага войска на чале з Вялікім князем Ягайлам, якое было недалёка ад Кулікова поля, але ўдзелу ў бітве не прыняло.

Ды і Барадзінскае поле ў гісторыі нашага народа неадназначны сімвал. Сёння на падставе гістарычных матэрыялаў даказана, што ў рускай арміі вельмі шмат было салдат, набраных, рэкруціраваных на службу ў беларускіх губернях. Але і ў складзе напалеонаўскіх войскаў неслі службу тысячы выхадцаў з Беларусі.

Дзякаваць богу, сёння слаўным і гучным для нас стала поле Грунвальдскай бітвы. Ляжыць яно за межамі нашай краіны. Але ў 1410 годзе беларусы разам з іншымі славянскімі народамі на гэтым полі перамаглі крыжакоў, спынілі іх экспансію на нашы землі. Магчыма, нейкі наш далёкі продак за адвагу ў тым пабоішчы атрымаў надзел зямлі, пабудаваўся. А назву вёсцы доўга не прыдумваў — Грынвальды. Да нядаўняга часу была такая вёска ў Пастаўскім раёне.

У цяжкім 1941 годзе пісьменнік Канстанцін Сіманаў пабываў у адной з вайсковых часцей, якая геаічнага змагалася ў бітве за Магілёў. Пабываў як журналіст, паехаў назад. А часць гэта ў наступныя дні панесла вялікія страты. Мог загінуць і ён, каб затрымаўся. Пасля смерці яго прах па волі пісьменніка быў развеяны над тым, Буйніцкім полем пад Магілёвам. Ёсць памятны знак. Бы вось якая акалічнасць — Буйніцкае поле стала вядомым не толькі з 1941 года. Яшчэ ў 1595 годзе ў час антыфеадальнага выступлення на Беларусі вялікі атрад паўстанцаў сустрэўся тут з таксама вялікім магнацкім войскам. Бітва доўжылася цэлы дзень, перамогі ніхто не атрымаў. Але тысячы

ТЭХНІЧНАЯ І ТЭХНАЛАГІЧНАЯ РЭВАЛЮЦЫЯ Ў АЙЧЫННАЙ МЕДЫЦЫНЕ

У нядзелю сваё прафесійнае свята адзначаць беларускія медыкі. Напярэдадні Дня медыцынскага работніка міністр аховы здароўя Васіль ЖАРКО сустрэўся ў Нацыянальным прэс-цэнтры з журналістамі цэнтральных СМІ, каб павіншаваць сваіх калег і расказаць пра асноўныя стратэгічныя накірункі развіцця айчыннай медыцыны.

Як падкрэсліў Васіль Жарко, сёння ў краіне ўзяты курс на пашырэнне даступнасці для насельніцтва высокатэхналагічнай медыцынскай дапамогі. Эндаскапічныя, эндаваскулярныя, клетачныя тэхналогіі, трансплантацыя органаў і тканак, лічбавая прамянёвая дыягностыка, камп'ютарныя інфармацыйныя тэхналогіі — усё гэта з'яўляецца складнікам сучаснай беларускай медыцыны. За апошнія тры гады колькасць трансплантацый ныркі павялічылася ў Беларусі ў 5 разоў, аперацый на сэрцы — у 1,5 раза, эндапратэзаванняў тазасцегнавых суставаў — удвая.

Знамянальнай падзеяй для айчыннай медыцыны сталі першыя аперацыі па трансплантацыі печані, праведзеныя сёлета. А ў пачатку 2009 года плануецца правесці першую аперацыю па перасадцы сэрца, якая пройдзе на базе Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра «Кардыялогія». Аснашчэнне цэнтра дазваляе гэта зрабіць, а яго спецыялісты цяпер праходзяць стажыроўку ў замежных клініках. У немалой ступені штуршком да актывізацыі айчыннай транспланталогіі стала прыняцце новай рэдакцыі Закона «Аб транспланталогіі» і рашэнне аб стварэнні ў краіне Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра транспланталогіі.

Сёння ў краіне дзейнічаюць ужо 10 рэспубліканскіх навукова-практычных цэнтраў, 5 навукова-даследчых інстытутаў і 5 цэнтральных навукова-даследчых лабараторый. Па словах міністра, усе створаныя ў краіне РНПЦ і па аснашчэнні, і па сваім кадравым складзе адпавядаюць сусветнаму ўзроўню. Так, па выніках лячэння анкалагічных захворванняў у дзяцей мы ўваходзім у васьмёрку лепшых краін свету. А ў РНПЦ траўматалогіі і артапедыі праходзяць лячэнне пацыенты больш чым з 30 краін, што сведчыць аб высокім прафесіяналізме работнікаў цэнтра. Апошнім часам акцэнт быў зроблены на пашырэнне падрыхтоўкі кадраў у галіне кардыяхірургіі, і, як вынік, сёння ўжо ва ўсіх абласных бальніцах асвоены і выконваюцца аперацыі па імплантацыі электракардыястымулятараў і стэнціраванні каранарных артэрый.

Найбольш значным дасягненнем у развіцці беларускай сістэмы аховы здароўя з'яўляецца зніжэнне смяротнасці немаўлят і мацярынскай смяротнасці. У параўнанні з 2000 годам смяротнасць дзяцей ва ўзросце да 5 гадоў і смяротнасць немаўлят знізілася ў 1,8 раза, мацярынская смяротнасць — у 3,6 раза, і цяпер іх узровень цалкам адпавядае паказчыкам эканамічна высокаразвітых краін свету.

За апошнія гады ў краіне былі рэканструяваны і перааснашчаны аперацыйныя блокі і рэанімацыйныя аддзяленні абласных і раённых бальніц, перынатальныя цэнтры, створаны эндаскапічныя акушэрска-гінекалагічныя цэнтры, рэканструяваны і перааснашчаны многія рэспубліканскія спецыялізаваныя медыцынскія цэнтры. Цяпер вырашаюцца пытанні перааснашчэння службы хуткай медыцынскай дапамогі. Умацоўваецца служба прамянёвай дыягностыкі: для яе толькі ў 2007 годзе было закуплена 278 апаратаў, у тым ліку 9 рэнтгенаўскіх камп'ютарных тамографаў. На працягу шэрагу гадоў адзначаюцца ўстойлівыя тэмпы росту закупак медыцынскай тэхнікі прадпрыемствам «Белмедтэхніка»: у 2007 годзе на 17,4 працэнта ў параўнанні з папярэднім годам.

Як зазначыў Васіль Жарко, раслі ў апошнія гады і аб'ёмы засваення фінансавых сродкаў на капітальнае будаўніцтва і рэканструкцыю аб'ектаў: так, калі ў 2005 годзе было засвоена з усіх крыніц фінансавання каля 200 млрд рублёў, то ў 2007 годзе — 489 млрд рублёў. У 2007 годзе фінансаванне капітальных рамонтаў у параўнанні з папярэднім годам вырасла ў 1,5 раза.

Сярод найбольш актуальных задач на бліжэйшы час міністр назваў правядзенне дыспансярызацыі дарослага і дзіцячага насельніцтва, укамплектаванне кадрамі ўстаноў па аказанні насельніцтву першаснай медыцынскай дапамогі, а таксама рэканструкцыю і перааснашчэнне медыцынскім абсталяваннем арганізацый аховы здароўя на ўсіх узроўнях аказання медыцынскай дапамогі. Летась, дарэчы, на кожнага беларуса прыйшлося 12,7 наведванняў паліклінік, і гэта без уліку ведамаснай медыцыны і прыватнай медыцынскай практыкі. А колькасць шпіталізаваных склала 27,4 у разліку на 100 жыхароў. Па гэтых паказчыках беларусы адносяцца да сусветных лідараў.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Краіна здароўя
Выпуск № 33 (89)

Доктар адкажа

Ёсць пытанні? Тэлефануйце...

На будучым тыдні дзяжурыць на «гарачай» лініі Міністэрства аховы здароўя (222 70 80) плануюць:

16 чэрвеня — галоўны тэрапеўт Міністэрства аховы здароўя Алена Іванаўна АДАМЕНКА.

17 чэрвеня — начальнік упраўлення фармінспекцыі і арганізацыі лекавага забеспячэння міністэрства Людміла Аляксандраўна РЭЎЦКАЯ.

18 чэрвеня — намеснік галоўнага ўрача па медыцынскай частцы Мінскага абласнога радзільнага дома Тамара Канстанцінаўна АЛЯКСАНДРАВА.

19 чэрвеня — начальнік аддзела гігіены, эпідэміялогіі і прафілактыкі Міністэрства аховы здароўя Юрый Яўгенавіч ФЁДАРАЎ.

20 чэрвеня — начальнік аддзела медыцынскай тэхнікі Міністэрства аховы здароўя Аляксандр Уладзіміравіч КУЛАГІН.

У графіку магчымыя змяненні.

НАШЧАДКІ ГІПАКРАТА,

або Беларусы ў гісторыі сусветнай медыцыны

У вестыбюлі Ваенна-медыцынскай акадэміі Пецярбурга ўстаноўлены бронзавыя бюсты двух самых славутых хірургаў XIX стагоддзя — Багданоўскага і Пірагова. Побач аўдыторыя з мармуровай шыльдай, надпіс апавяшчае: «Тут, сярод сваіх вучняў, не закончыўшы пачатай аперацыі, памёр 11 кастрычніка 1888 года Яўстафій Іванавіч БАГДАНОЎСКІ»; ён памёр літаральна са скальпелем у руках.

В.А. ДОГЕЛЬ.

Пра Багданоўскага ведае вузкае кола спецыялістаў. Між тым, у Расіі ён першым асвоіў шэраг складаных аперацый, пераўзышоў сваім «майстэрствам хірурга» славутых еўрапейскіх калег і за свае заслугі быў абраны акадэмікам. Багданоўскі родам са Мсціслаўскага павета, у 1858 г. за казённы кошт з залатым медалём скончыў Пецярбургскую акадэмію і праз 3 гады стаў дактаром медыцынскіх навук. Лекцыі прафесара Багданоўскага прыцягваюць студэнтаў строгай логікай і яснасцю. У канцы жыцця выдаў капітальную працу па хірургіі.

Ваенна-медыцынская акадэмія, заснаваная ў Пецярбургу як медыка-хірургічная, стала месцам набыцця сусветнай славы многіх урачоў-беларусаў. Акадэмік гэтай акадэміі Ілья Васільевіч БУЯЛЬСКІ таксама родам з Магілёўскай губерні.

Далёка за межамі Расіі набылі вядомасць яго «Анатама-хірургічныя табліцы». Паводле свайго спосабу ён упершыню ў Еўропе бальзаміраваў целы вялікіх асобаў Францыі, Германіі, Аўстрыі. Гэта шчодра аплатная работа дазваляла яму падарожнічаць па «ўсёй Еўропе» з мэтай калекцыянавання хірургічных інструментаў з часоў Сярэднявечча. Гэты найбагацейшы свой «кабінет» Буяльскі ў дзень свайго 50-гадоваго юбілею падарыў акадэміі. Яго метад быў выкарыстаны пры бальзаміраванні целаў Леніна, Сталіна, Мао-Цзэ-Дуна і інш. Сам жа сапраўдны стацкі саветнік Буяльскі быў пахаваны па хрысціянскім звычаі.

Заснавальнік рускай псіхіятрыі Іван Міхайлавіч БАЛІНСКІ з Віленскай губерні скончыў акадэмію з залатым медалём з занясеннем на мармуровую дошку. Заснаваў у Пецярбургу першую ў свеце кафедру псіхіятрыі і ўпершыню пачаў выкладаць псіхіятрыю. Стварыў першую ўзорную псіхіятрычную клініку на 120 месцаў. Самастойная кафедра з клінікай і абавязковы для студэнтаў курс душэўных хвароб — гэта было ў той час штосьці новае не толькі ў Расіі, але і ў Еўропе. Балінскі стаў не толькі першым прафесарам псіхіятрыі, але і дырэктарам першай псіхіятрычнай клінікі. Ён жа стварыў акружныя клінікі ў найбуйнейшых гарадах Расіі: Харкаве, Казані, Адэсе і інш., а таксама і земскія лячэбніцы.

Сярод яго шматлікіх вучняў былі Бехцераў, беларус Чачот і інш. Ён жа быў і заснавальнікам Расійскага Таварыства псіхіятраў, на І з'ездзе якога І.М. Балінскі быў названы «бацькам айчыннай псіхіятрыі».

Кандрацій Іванавіч ГРУМ-ГРЖЫМАЙЛА з Магілёва прысвяціў сябе выданню штотыднёвага народна-ўрачэбнага часопіса «Друг здравия». Часопіс, які доктар Грум рэдагаваў 40 гадоў, адыграў вялікую ролю ў медыцынскай навуцы і папулярызацыі медыцынскіх ведаў. Яго часопіс «Народна-медыцынская энцыклапедыя XIX стагодзя» для сучаснага ўрача — крыніца пазнання гісторыі медыцыны ў Расіі. Ён выдаў кнігі аб прафілактыцы воспы, аб мінеральных водах і грязях, аб лячэнні і выхаванні дзяцей; адкрыў і ўзначаліў у Пецярбургу «Оспопрививальное учреждение». Гэта яму належыць вядомае: «У здаровым целе здаровы дух!».

Сапраўдным «пакутнікам» навукі быў урач-беларус Восіп Восіпавіч МАЧУТКОЎСКІ. Выпрабаваннямі на сабе ён даказаў, што кроў хворых на тыф заразная.

Значны ўклад у сусветную навуку ўнесла славутая дынастыя ўрачоў-беларусаў ДОГЕЛЯЎ. Заснавальнік эксперыментальнай фармакалогіі М.М. ДОГЕЛЬ з Віцебскай губерні першым звярнуў увагу на праблему алкагалізму; яго працы па параўнальнай анатоміі, фізіялогіі і фармакалогіі сэрца, крывяносных і лімфатычных сасудаў атрымалі сусветнае прызнанне.

Акадэмік А.С. ДОГЕЛЬ стаў заснавальнікам нейрагісталогіі. Ён упершыню падрабязна апісаў адчувальныя нервовыя канчаткі ў лімфатычных і крывяносных сасудах, у сэрцы, нырках, у брушыне, плеўры, сухажыллях, мышцах і спіннамазгавых вузлах; 10 тыпаў утварэнняў названы яго імем. Заснаваў і рэдагаваў спецыяльны часопіс «Рускі архіў анатоміі, гісталогіі і эмбрыялогіі», які існуе і да гэтага часу. Яго сын, В.А. ДОГЕЛЬ — заснавальнік протазаалогіі. Яго працы перакладзены на многія замежныя мовы. Заснаваў у Пецяргофе Біялагічны інстытут і ўзначальваў яго з 1924 па 1941 год; быў прэзідэнтам Таварыства даследчыкаў прыроды СССР. Член-карэспандэнт АН СССР Догель пасля смерці ўзнагароджаны Ленінскай прэміяй.

З даўніх часоў стыхійным бедствам у Расіі былі чума і халера, якія перыядычна, але пастаянна «гасцявалі» на бяскрайніх прасторах краіны. І самы грунтоўны ўклад у барацьбу з гэтым сусветным злом унеслі менавіта ўрачы-беларусы: Л.Я. НАГУМОВІЧ з Магілёва, а таксама А.А. РАФАЛОВІЧ і В.В. ЯБЛАНОЎСКІ з Гродна, якія ўзначальвалі экспедыцыі для вывучэння эпідэмій чумы і халеры ў краінах Азіі. Удалае спалучэнне трох спецыяльнасцяў — эпідэміёлага, мікрабіёлага і патолагаінфекцыяніста дазволілі прафесару Н.Н. КЛАДНІЦКАМУ з в. Краснае паблізу Маладзечна ўпершыню распрацаваць метады барацьбы з гэтымі інфекцыйнымі захворваннямі; ён узначальваў ліквідацыю ўспышак чумы і халеры ў Паволжы і Сярэдняй Азіі, па заданні ўрада — у Іране, кіраваў экспедыцыяй па вывучэнні сыпнога тыфу ў Беларусі.

Урач-тэрапеўт па ўнутраных хваробах, прафесар Ф.І. ПАСТЭРНАЦКІ з мястэчка Пяцяўшчына пад Мінскам увайшоў у гісторыю медыцынскай навукі як непераўзыдзены аўтарытэт па хваробах нырак. Быў арганізатарам І Усерасійскага з'езда ўрачоў па бальнеалогіі і курорталогіі, у Пяцяўшчыне яму пастаўлены помнік.

Дзейнасць прафесара С.С. ЗІМНІЦКАГА з мястэчка Хіславічы паблізу Мсціслаўля пачалася ў той час, калі І.П. ПАЎЛАЎ ужо стаў першым у свеце Нобелеўскім лаўрэатам у галіне фізіялогіі. Але Зімніцкі таксама паспяхова развіваў фізіялагічны накірунак. Сучаснікі ставілі яго вышэй за С.С. Боткіна, на яго працах выхавана некалькі пакаленняў тэрапеўтаў-кардыёлагаў.

В.Н. БЕКЛЯМІШАЎ з Гродна заснаваў у Маскве Інстытут малярыі і медыцынскай паразіталогіі, узначаліў работу па метадах ліквідацыі малярыйных ачагоў. Яго працы — буйное дасягненне савецкай навукі, перавыдадзенае ў Еўропе. Акадэмік Беклямішаў — лаўрэат Сталінскіх прэмій.

Прафесар Медыцынскай акадэміі і дырэктар самай вялікай ў Расіі Надзежды Дзінскай рододадпаможнай установы А.Я. КРАСОЎСКІ са Слуцка ў XIX стагоддзі лічыўся ва ўсім свеце лепшым урачом-акушэрам. Яго «Курс практычнага акушэрства» па зразумеласці выкладання да гэтага часу лічыцца класічнай працай у сусветнай медыцынскай літаратуры; перакладзены на многія замежныя мовы. Быў заснавальнікам Рускага акушэрска-гінекалагічнага таварыства, заснавальнікам і першым рэдактарам «Часопіса акушэрства і гінекалогіі», членам 35 рускіх і замежных навуковых таварыстваў.

Цікавая з'ява ў гісторыі медыцыны — першая жанчына ў свеце, якая атрымала вучоную ступень доктара медыцыны, была Варвара КАШАВАРАВА-РУДНЕВА з-пад Магілёва.

Урач А.А. БАГДАНАЎ (1873—1928) з Беластока, вядомы апанент У.І. Леніна, заснаваў першы ў свеце Інстытут пераліванне крыві; памёр ад няўдалага эксперыменту на самім сабой.

Шмат вельмі значнага ў сусветнай медыцыне створана ўрачамі-беларусамі. БАЛІНСКІ, БАГДАНОЎСКІ, БУЯЛЬСКІ, ГРУМ-ГРЖЫМАЙЛА, ЗІМНІЦКІ, КРАСОЎСКІ, КАШАВАРАВА-РУДНЕВА...

Якія звонкія імёны! І між тым, ніводнай вуліцы, названай іх імёнамі, ніводнага помніка. Калі хто і адзначаны ў нас, дык гэта рускія Боткін ці Бехцераў, вучні ўрачоў-беларусаў. Да чаго ж мы такія марнатраўныя ў адносінах да сваёй духоўнай спадчыны...

В. ЯРМОЛЕНКА,
пастаянны прадстаўнік Беларусі ў Сусветнай камісіі па гісторыі навукі.

14 чэрвеня — Сусветны дзень донара крыві

Той, хто здае кроў, больш здаровы і даўжэй жыве

Гэта дата адзначаецца ў свеце пяты раз. У Беларусі першае пераліванне крыві было праведзена ў 1928 годзе на базе першай мінскай хірургічнай клінікі. А сама гісторыя службы крыві рэспублікі бярэ свой пачатак з 1933 года, калі быў створаны НДІ гематалогіі і пералівання крыві. Цяпер мы маем магутны Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр гематалогіі і трансфузіялогіі; 21 станцыя і 37 аддзяленняў пералівання крыві забяспечваюць кампанентамі крыві ўсе арганізацыі аховы здароўя стацыянарнага тыпу. Кроў па заяўках медустаноў можа быць дастаўлена ў любую кропку рэспублікі не больш чым за 50 хвілін.

— Донарская кроў — гэта такі лекавы сродак, які не можа быць заменены нечым іншым, — гаворыць дырэктар Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра гематалогіі і трансфузіялогіі Міхаіл Патапнеў. — Аднак цяпер у свеце цэльная кроў не пераліваецца, і з мінулага года мы таксама ідзём па гэтым шляху.

Сёння выкарыстоўваюцца толькі тыя яе складовыя, колькасць якіх памяншаецца з-за хваробы або страты крыві. У прыватнасці, пры анеміі пераліваюць эрытрацыты, пры лейкозах, калі развіваюцца крывацёкі, — трамбацыты, пры захворваннях, якія ўскладніліся парушэннямі згусальнасці крыві — звышзамарожаную плазму. Важнай задачай для службаў крыві з'яўляецца бяспечная нарыхтоўка кампанентаў крыві. Для гэтага праводзіцца ўважлівы адбор донараў, для чаго ў рэспубліцы створана ўнікальная сістэма. Усе ўстановы службаў крыві штомесяц атрымліваюць падрабязную інфармацыю аб людзях, якія захварэлі на вірусныя гепатыты, СНІД, сіфіліс, іншыя інфекцыі, інфармацыя паступае ў картатэку. Уся нарыхтаваная кроў старанна даследуецца на маркёры інфекцый, якія перадаюцца ад донара хвораму.

У апошнія 10 гадоў донарамі ў рэспубліцы былі каля 2 мільёнаў чалавек. Што ж рухае гэтымі людзьмі? Наўрад ці толькі матэрыяльная выгада. Тым больш што з 8 асноўных ільгот донарам адмянялі тры: бясплатнае пратэзаванне зубоў з каштоўных металаў, 50-працэнтную аплату за лекі і пазачарговае выдзяленне санаторных пуцёвак. Але ж у нашай рэспубліцы захавалася самая высокая кампенсацыя за здадзеную кроў. Напрыклад, за здачу 450 мл крыві выплачваецца 68 тыс. 250 рублёў. У Расіі гэты паказчык у пяць разоў меншы, а ў Злучаных Штатах увогуле кампенсацыі не даюць. Донар пасля здачы крыві мае права на два дні вызвалення ад работы, якія аплачваюцца па сярэднім заробку. Калі донар здае кроў рэгулярна, яму належыць 100-працэнтная аплата бальнічнага ліста. За ім захоўваецца права выбару адпачынку ў любы зручны для яго час.

І яшчэ, як падкрэсліў М. Патапнеў, мяняецца матывацыя донарства. У прыватнасці, з'явілася новыя навукова абгрунтаваныя даныя аб тым, што здача крыві спрыяльна адбіваецца на здароўі і донара. Кампаненты крыві пасля здачы яе праз 2—3 дні аднаўляюцца ў арганізме, і чалавек адчувае сябе лепш пасля гэтага. Акрамя таго, кожны дзень у нас адмірае каля 100 мільярдаў клетак крыві. А донар быццам бы разгружае арганізм ад гэтай работы. У рэгулярных донараў дастаткова добра развіта рэгенерацыя. Даследаванні паказалі, што гэтыя людзі хутчэй папраўляюцца пасля хваробы, у іх ніжэйшая смяротнасць ад усіх захворванняў: ад анкалогіі — на 20 працэнтаў, ад захворванняў лёгкіх — на 30 працэнтаў, ад эндакрынных захворванняў — у 3 разы.

Вольга ШАЎКО.

Алена БЕЛЬСКАЯ: «ЁСЦЬ ЯГО ВЯЛІКАСЦЬ УРАЧ! І ЯМУ ТРЭБА ДАЦЬ УСЁ, ШТО ЁН ПАЖАДАЕ»

Народная мудрасць сцвярджае, што ўсе прафесіі — ад людзей, і толькі тры — ад Бога: гэта вучыць, судзіць і лячыць. Не сакрэт, што ў медыцынскую ВНУ вельмі цяжка паступіць, але яшчэ больш цяжка там навучацца. Многія студэнты адсейваюцца, не вытрымаўшы вучэбных нагрузак ці расчараваўшыся ў выбранай прафесіі. Усё ж такі адна справа — вучыць тэорыю, і зусім іншая — працаваць з жывымі людзьмі. Адных толькі выдатных ацэнак у дыпломе недастаткова, каб стаць прафесіяналам у сваёй справе. Работа ўрача — гэта не толькі белы халат, але і начныя дзяжурствы, цяжкасці з пастаноўкай дыягназу, уменне пачуць і даць надзею. Медыцынай трэба «заразіцца»...

Між іншым, ні для каго не з'яўляецца сакрэтам, што пацыенты часта ставяцца да медыцыны як да сферы паслуг, спрабуюць маніпуляваць урачамі ў сваіх інтарэсах — для атрымання лістка часовай непрацаздольнасці, ільготнага рэцэпта і г.д. Тым больш што адказнасць за выкананне прызначэнняў урача ў нас ніхто не нясе. Могуць абсалютна беспадстаўна выклікаць на дом участковага ўрача ці брыгаду хуткай дапамогі. Прычым медыкам, занятым аказаннем хвораму дапамогі, нярэдка даводзіцца хвалявацца не толькі за яго жыццё, але і... за ўласную бяспеку. Гэта ў іншых краінах прэстыжнасць прафесіі медыка падмацоўваецца высокімі заробкамі. А ў нас пакуль што кошт адной гадзіны працы медыцынскага работніка складае ўсяго 3,5 тысячы рублёў. А па колькасці адпрацаваных гадзін медыкі саступаюць толькі работнікам сельскай гаспадаркі. Напярэдадні прафесійнага свята беларускіх медыцынскіх работнікаў мы гутарым са **старшынёй Рэспубліканскага камітэта Беларускага прафсаюза работнікаў аховы здароўя Аленай БЕЛЬСКАЙ:**

— Абсалютна відавочна, што для сістэмы аховы здароўя павінна быць распрацаваная свая, адметная ад іншых сфераў сістэма аплаты, якая адлюстроўвала б спецыфіку працы медыцынскіх работнікаў і забяспечвала б дыферэнцыяцыю ва ўзроўнях аплаты працы розных катэгорый работнікаў з улікам іх прафесіяналізму, аб'ёмаў, складанасці работы, яе якасці і эфектыўнасці. За апошнія гады была здзейснена вялікая колькасць «кропкавых» павышэнняў заработнай платы асобным катэгорыям медыцынскіх работнікаў. Аднак дзеюча на сёння сістэма аплаты працы работнікаў аховы здароўя ў рамках адзінай тарыфнай сеткі і тарыфнай стаўкі першага разраду ўсё роўна не дае магчымасці годна ацаніць напружанасць і адказнасць вельмі спецыфічнай працы медыцынскага работніка. Мы неаднаразова накіроўвалі ва Ўрад свае прапановы па рэформаванні ўсёй сістэмы аплаты працы, у аснову якіх была пакладзена навукова-абгрунтаваная шкала колькаснай ацэнкі працы ўрачоў у залежнасці ад яе спецыфікі. І, як вынік, Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь быў зацверджаны інавацыйны праект пад назвай «Распрацоўка методыкі ацэнкі працы медыцынскіх работнікаў і мадэль галіновай сістэмы аплаты працы ў аховe здароўя», рэалізацыя якога разлічана на 2007—2008 гады. Але пакуль што ўкараненне гэтай сістэмы — толькі перспектыва, спадзяёмся, што не вельмі аддаленая. А ў дадзены момант на разглядзе ва Ўрадзе знаходзіцца праект пастановы па павышэнні заработнай платы медыцынскім работнікам, якое, як мяркуецца, адбудзецца з 1 ліпеня.

Сёння памер нашых заробкаў залежыць ад дадатковых дзяжурстваў, звышурочнай работы і гэтак далей. Пры гэтым па выніках мінулага года сярод 14 асноўных галінаў народнай гаспадаркі сістэма аховы здароўя займала 8-е месца па ўзроўні заробкаў, а па сярэднямесячным ўзроўні аплаты працы за адну гадзіну — і ўвогуле дзесятае. Кошт адной гадзіны працы медыцынскага работніка складае ўсяго 3,5 тысячы рублёў, у той час як у прамысловасці — 5,1 тысячы.

— Алена Ўладзіміраўна, пераход да кантрактнай формы найму палепшыў ці пагоршыў прававы статус медыкаў? Ці адчуваюць сябе абароненымі работнікі перадпенсійнага ўзросту?

— Прафсаюзам пастаянна праводзіцца маніторынг прымянення кантрактнай формы найму, вынікі якога паказалі, што на падставе кантракту цяпер працуе больш за 91 працэнт работнікаў нашай галіны. З задавальненнем хачу адзначыць, што практыка прымянення кантрактнай формы найму ў арганізацыях аховы здароўя стала больш дасканалай. Так, у калектыўныя дагаворы, як правіла, уносяцца нормы Генеральнага, Тарыфнага і мясцовага пагадненняў, якія дазваляюць найбольш поўна абараніць правы работнікаў пры прымяненні кантрактнай сістэмы найму. Дадатковыя гарантыі прадугледжаны для работнікаў перадпенсійнага ўзросту: з жанчынамі ва ўзросце 52 гады і мужчынамі ва ўзросце 57 гадоў кантракты заключаюцца, па іх згодзе, зразумела, на тэрмін да моманту набыцця імі права на атрыманне пенсіі. Выбарачныя праверкі калектыўных дагавораў сведчаць, што гэтыя нормы, у асноўным, захоўваюцца.

Колькасць кантрактаў, заключаных на гадавы тэрмін у якасці мінімальнага, штогод зніжаецца і цяпер складае па краіне 37,6 працэнта. Хоць у сталіцы, напрыклад, амаль кожны другі кантракт заключаецца на гадавы тэрмін. Разам з тым найбольш характэрным парушэннем пры заключэнні кантрактаў з'яўляецца неўключэнне ў іх дадатковых мераў па стымуляванні працы з-за адсутнасці сродкаў. У гэтым плане хацелася б звярнуць увагу рэгіёнаў на сталічную практыку, дзе на стымуляванне работнікаў накіроўваецца да 5 працэнтаў сродкаў ад фонду заработнай платы.

— Нядаўна была агучана адна цікавая лічба: штогод сістэму аховы здароўя пакідаюць 400 урачоў. Хто-небудзь цікавіўся, якімі прычынамі выкліканы адток кадраў?

— Адток медыцынскіх кадраў з галіны і сапраўды мае месца, як і дэфіцыт кадраў. Нягледзячы на павелічэнне кантрольных лічбаў набору ў медыцынскія навучальныя ўстановы штогод застаюцца вакантнымі каля трох тысяч урачэбных пасадаў пры каэфіцыенце сумяшчальніцтва 1,34—1,39. Хачу сказаць, што толькі павелічэннем прыёму ў ВНУ наўрад ці ўдасца вырашыць кадравыя праблемы аховы здароўя — іх трэба вырашаць комплексна. Выключнае значэнне мае матывацыя працы медыцынскага работніка, і гэта не толькі заработная плата, але яе нарміраванне, арганізацыя, умовы і ахова працы... Зразумела, нас цікавіла, па якіх прычынах медыцынскія работнікі сыходзяць з галіны. Мы прааналізавалі сітуацыю за чатыры апошнія гады і высветлілі, што 258 чалавек з'ехалі за межы краіны. Але больш чым у 20 працэнтах выпадкаў прычыны звальнення так і засталіся невядомыя.

— Часта даводзіцца чуць прапановы аб павелічэнні тэрміну работы выпускнікоў медыцынскіх ВНУ па размеркаванні. Маўляў, гэта дазволіла б хоць частково вырашыць праблемы сельскай медыцыны. Як вы ставіцеся да такіх ініцыятыў?

— Я не лічу, што такім чынам можна вырашыць пытанні ўкамплектавання ўрачамі арганізацый першаснай медыка-санітарнай дапамогі. Стварыце маладым спецыялістам адпаведныя жыллёвыя і бытавыя ўмовы, падтрымайце іх матэрыяльна. Там, дзе маладых спецыялістаў акружаюць клопатам, паверце, праблема цякучасці кадраў так востра не стаіць. Хачу паўтарыць, што галоўнае ў замацаванні кадраў — матывацыя працы, вырашэнне сацыяльных пытанняў і прадастаўленне маладым спецыялістам умоў для прафесійнага росту. А калі гэтага не рабіць, то праз два гады зноў давядзецца накіроўваць запыт і прасіць, каб дапаможа маладымі спецыялістамі.

— А што робіцца сёння прафсаюзам для павышэння сацыяльнай абароненасці медыцынскіх работнікаў, і, у прыватнасці, маладых спецыялістаў?

— Цяпер у галіне працуе звыш 64 тысяч маладых спецыялістаў. У ВНУ навучаюцца 14 114 чалавек і каля 8 тысяч чалавек — у сярэдніх спецыяльных навучальных установах. З мэтай каардынацыі маладзёжнай палітыкі пры Рэспубліканскім камітэце прафсаюза функцыянуе Рэспубліканскі маладзёжны камітэт. Для заахвочвання студэнтаў і навучэнцаў, якія сумяшчаюць выдатную вучобу і грамадскую работу, прафсаюз выплачвае 88 стыпендый у памеры 220 працэнтаў ад базавай велічыні, на гэтыя мэты прафсаюз выдзеліў 63,2 млн рублёў.

Толькі павелічэннем прыёму ў ВНУ наўрад ці ўдасца вырашыць кадравыя праблемы аховы здароўя — іх трэба вырашаць комплексна. Выключнае значэнне мае матывацыя працы медыцынскага работніка, і гэта не толькі заработная плата, але яе нарміраванне, арганізацыя, умовы і ахова працы...

Аднак ёсць праблемы, якія патрабуюць вырашэння, перш за ўсё гэта дэфіцыт месцаў у інтэрнатах. Не забяспечаны жыллём у інтэрнатах 1200 студэнтаў і 1176 навучэнцаў.

Калі гаварыць пра маладых спецыялістаў, то маніторынг забяспечанасці жыллём урачоў 2007 года выпуску паказаў, што з размеркаваных 1467 спецыялістаў жылая плошча (маецца на ўвазе службовае, ведамаснае жыллё ці месцы ў інтэрнатах) была прадастаўлена толькі 224 чалавекам. Лепш вырашаюцца гэтыя пытанні ў Віцебскай, Магілёўскай і Гродзенскай абласцях.

— Алена Ўладзіміраўна, а ці многія арганізацыі аховы здароўя выкарыстоўваюць практыку страхавання персаналу ад урачэбных памылак? Ці вырашана пытанне аб уваходзінах страхавання жыцця і здароўя медыцынскіх работнікаў?

— Пры ўсёй сваёй гуманнасці і высокім прафесіяналізме медыцына не абыходзіцца без памылак і непрадбачных ускладненняў у працэсе лячэбна-дыягнастычнай і нават прафілактычнай дзейнасці. У сусветнай практыцы прафесійная адказнасць урачоў, як правіла, падлягае абавязковаму страхаванню. На працягу некалькіх папярэдніх гадоў мы вывучалі стан спраў з урачэбнымі памылкамі і судовымі іскамі да медыцынскіх установ аб кампенсацыі шкоды здароўю пацыентаў. У адпаведнасці з Грамадзянскім кодэксам Рэспублікі Беларусь шкода, якая наносіцца жыццю ці здароўю грамадзяніна, падлягае ў поўным аб'ёме кампенсацыі асобай, якая яе нанесла. А пакольку медыцынскія работнікі знаходзяцца ў працоўных адносінах з установамі аховы здароўя, то апошнія ў адпаведнасці з Грамадзянскім кодэксам, нясуць адказнасць за сваіх работнікаў і кампенсуюць шкоду пацыенту на падставе судовых рашэнняў. У сваю чаргу ўстановы аховы здароўя маюць права выставіць патрабаванне аб кампенсацыі свайму работніку, па віне якога здароўю пацыента была нанесена шкода.

У агульнай колькасці складаных экспертыз такія справы складаюць каля 45 працэнтаў. Штогод рэгіструецца каля 100 выпадкаў. Дадзеная праблема знайшла сваё адлюстраванне ў Законе Рэспублікі Беларусь «Аб аховe здароўя» ў рэдакцыі 2008 года, у главе «Правы, абавязкі і сацыяльная абарона медыцынскіх і фармацэўтычных работнікаў». Медыцынскія і фармацэўтычныя работнікі маюць права на страхаванне прафесійнай памылкі, не звязанай з нядбайным выкананнем імі прафесійных абавязкаў.

Я ведаю, што ў сталіцы многія кіраўнікі арганізацый аховы здароўя падтрымліваюць практыку страхавання ад урачэбнай памылкі. Наяўнасць страхавога пасведчання для ўрача з'яўляецца свайго роду дадатковай гарантыяй, што ён валодае высокім прафесіяналізмам. А пацыент ведае, што за кожнай аперацыяй, кожным дзеяннем урача стаіць фінансавая адказнасць медустановы. Установы аховы здароўя страхуюць сваіх работнікаў за кошт сродкаў, атрыманых ад пазабюджэтнай дзейнасці. Як правіла, паслугамі страхаўшчыкоў карыстаюцца ўрачы самых рызыкоўных прафесій: стаматолагі, гінеколагі, хірургі, рэанімятолагі, анастэзіёлагі, трансплантолагі. Набываючы страхавы поліс, медустанова атрымлівае гарантыю кампенсацыі шкоды сваім пацыентам у выпадку здзяйснення іх работнікамі памылкі.

Аднак страхаванне прафесійнай рызыкі не стала ў нас абавязковым, таму заканадаўчая база патрабуе ўдасканальвання. Тое ж можна сказаць і пра страхаванне ад няшчасных выпадкаў на вытворчасці і прафесійных захворванняў. Ёсць Указ Прэзідэнта «Аб страхавой дзейнасці», але для медыцынскай галіны павінен быць распрацаваны ўсё ж такі свой дакумент, з улікам яе спецыфікі: для медыцынскіх работнікаў, напрыклад, існуе рэальная пагроза заразіцца ВІЧ-інфекцыяй ці туберкулёзам, медыцынскіх работнікаў траўмуюць, збіваюць... Гэта зусім не перабольшанне: 16 працэнтаў ад усіх вытворчых траўмаў складаюць процітпаўныя дзеянні. Мы, на жаль, не можам назваць бяспечнай сёння працу брыгад хуткай дапамогі ці работнікаў прыёмных аддзяленняў, якія нярэдка вымушаны працаваць з не зусім адэкватнымі пацыентамі. Для таго, каб брыгады хуткай дапамогі маглі адчуваць сябе больш-менш абаронена, трэба забяспечваць выязны персанал на законных падставах эфектыўнымі сродкамі асабістай бяспекі, а гэта немагчыма без распрацоўкі і прыняцця дакумента аб нападзе на медыцынскіх работнікаў. Праблему неабароненасці медыцынскага персаналу трэба вырашаць юрыдычна. Апошнім часам часта ўзгадваюцца правы пацыентаў. Гэта правільна, аднак нам хацелася б, каб і пра правы медыцынскіх работнікаў не забывaліся. Пры распрацоўцы Кодэкса аб кананаў аб аховe здароўя мы збіраемся ініцыяваць прынятае Закона «Аб правах і абавязках медыцынскіх работнікаў». Такія законы ёсць у многіх краінах свету.

— У Год здароўя не маглі не пацікавіцца, а ці могуць беларускія медыкі пахваліцца добрым здароўем?

— За апошнія тры гады захваранальнасць медыцынскіх работнікаў стабілізавалася. Працоўныя страты па захворваннях склалі за 2007 год 571,7 дня на 100 працуючых, што на 17,7 працэнта ніжэй за паказчык па народнай гаспадарцы. Нас вельмі радуе тая акалічнасць, што колькасць медработнікаў, якія сістэматычна займаюцца фізкультурай і спортам, за 2007 год узрасла з 25 да 33 працэнтаў. Штогод сярод медработнікаў праводзяцца абласныя і рэспубліканскія спартакіяды. Будз

Дзённік бландзінкі

КІЧ І МАГІЯ

Не магу згадаць дакладна, дзе пра гэта прачытала — у «Нязнайцы на Месяцы» ці ў «Піноккіо»... Але сутнасць такая — маленькага хлопчыка прывозяць на выспу дурняў. Грае чароўная музыка, круцяцца атракцыёны, і хлопчык ператвараецца ў асліка...

Дык я гэта бачыла!

Нас было пяцьдзесят у экскурсійным аўтобусе, які павінен быў ехаць у знакаміты Версаль. Праўда, па дамове, калі сярод пасажыраў больш за восем ахвотнікаў ехаць у Дыснэйлэнд, то тых ахвотнікаў трэба весці ў Дыснэйлэнд. Але ў нашым аўтобусе было ўсяго дзве мамкі і трое дзяцей... Дыснэйлэнд нам не пагражаў. Але ніхто не ведаў, што тыя дзве мамкі былі стаматолагамі. А жанчыны-стаматолагі — гэта страшная сіла! Гэта значыць, што калі жанчына-стаматолаг намылілася ў парк атракцыёнаў, то сорак пяць дарослых перакрычаць ёй вельмі проста (можа яны сабе дынамікі ў рот манціруюць, не ведаю).

Карацей, перад Версалем мой аўтобус паехаў у другі бок Парыжа, прама супрацьлеглы... І вось вам чароўная музыка, бягучая дарожка, Сезам адкрыйся. З таго дня я перакананая — у кожны кіч падмешваюць магію. Бо чым іначай растлумачыць той факт, што замест пяці чалавек у Дыснэйлэндзе засталося сорак пяць? І толькі пяць здолелі сесці ў аўтобус і ўсё ж даехаць да Версаля? Да гэтай пары не магу зразумець, як мне ўдалося пазбегнуць чараў...

СЕТКАВЫ МАРКЕТЫНГ

Сёння ў арцы тры вакзальныя бамжыхі, у халера-ведае-якіх брудных апранахах, па чарзе фарбаваліся, узіраючыся ў адно на ўсіх люстэрка. Прыглядаюся — «Арыфлэйм»! Божачкі, і да іх дабраўся сеткавы маркетынг...

ЖАНЧЫНКІ

Ранак, па дварам сунецца маладзенькая бадзяжка, у блакітным джынсавым касцюме. Мокрым ад пояса да каленаў і яўна не ад дажджу. Памятая, як дваццацірублёвая купюра, відаць, не першы месяц жыве не дома... Але ж бландзінка! Увесь час думаю — і дзе ж яны фарбуюць валасы? Ну добра — вусны, тут многа спрыту не трэба. Але ж дзе яны разводзяць фарбы, трымаюць пэндзлікі, рушнікі... Пры тым, што ні месца, ні жадання проста памыць валасы ў асобаў без поўнага месца жыхарства не назіраецца. Тут, відаць, нейкі ўласнагрупавы фетыш, напамін самой сабе, што жанчына. Гляджу на іх ужо даўно без агіды, адно са шкадаваннем. Як імгненна менавіта жанчыны старэюць без дому, без камфорту. З'яўляюцца на вуліцы зусім дзяўчынкамі, праз месяц выглядаюць на саракагадовых, праз паўгода — бабулькі. Чарнаткварыя, яйкагаловыя. Трансфармацыя такая, што пазнаеш адно па вопратцы... І разумееш, што нават апранўшы, накарміўшы і адправіўшы дахаты — не дапаможаш. Што зламалася недзе там, дзе не склеіць.

ІРЫСЫ

А ці ведаеце вы, што існуе каля двухсот пяцідзесяці гатункаў касачоў — так па-беларуску называюць ірысы? Не ведаю, колькі гатункаў высаджана ў мінскім батанічным садзе, але ўсе яны прыгажосці незвычайнай і пахнуць тонка, парфумерна, чаго не скажаш пра рададэндроны, якія таксама якраз цяпер цвітуць у тым жа садзе. Праўда, пахнуць яны спецыфічна — паветраным шарыкам, які выпадкова лопнуў. А калі казаць паэтычна — страчанай радасцю дзяцінства...

ВЫХАВАННЕ ПАЛІТКАРЭКТНАСЦІ. СЕРЫЯЛ «НЕСАНТА-БАРБАРА»

У Валянціны, адзінокай інтэлігентнай бібліятэкаркі з аддзела музычнай літаратуры, адзіны сын Васенька.

Зразумела, ходзіць у музычную школу, вучыцца скрыпачцы.

Разам з ім ходзіць дзяўчынка Леначка. Васенька і Леначка — сябры. Мама Валянціна патроху кпіць з іх сяброўства. Бо Леначка — з добрай яўрэйскай сям'і. Валянціна — не юдафобка, проста, калі ў хаце няма вады, то Валянціна ведае, хто яе выпіў.

Вася і Лена вырастаюць і хочуць пажаніцца. Валянціна супраць. Аргумент — каб Васенька не быў адзіным сынам, яна б пацярпела ўнукаў-яўрэяў, а так — не.

Валянціну падтрымлівае яе сяброўка Люда. У Люды ёсць дачка Волечка, якой падабаецца Васенька.

А бацькі Леначкі збіраюцца з'язджаць. Васенька стаіць перад выбарам. Валянціна нагадвае пра яго абавязкі. Леначка з'язджае адна.

Васенька і Воленька жэняцца на радасць Валянціны і Люды. Але праз год сям'я распадаецца, бо слабахарактарны Вася пачынае выпіваць.

Аднойчы, калі Вася нападпітку вяртаецца дадому, ён сварыцца з падлеткамі проста каля свайго пад'езда. Яго забіваюць.

Валянціна безупынная. У яе нікога няма, нават з былой сяброўкай Людай яны не размаўляюць.

Валянціна атрымлівае ліст з Ізраіля. У далёкім горадзе Хайфа ў яе расце ўнук. На дасланым фотаздымку ён выліты Васенька.

Валянціна пазычае грошы і едзе да ўнука. Пасля прыезду ўсе заўважаюць, як яна памаладзела. Яна збіраецца пераязджаць у Ізраіль, каб дапамагаць глядзець унука.

Валянціна эмігравала. Цяпер, калі ў кране няма вады, яна ведае, што яе выпілі... арабы.

P.S. Усе імёны зменены.

Ганна КІСЛІЦЫНА.

ДЗЯЎЧЫНА З ХАРАКТАРАМ,

альбо Чаму беларускія русалкі ходзяць па зямлі?

Якая была прыгажуня!.. Зялёныя вочы абяцалі пяшчоту. Пышныя валасы рассыпаліся па плячах. Сустрэча з ёй здавалася казкай, цудам — тое, што такая чараўніца апынулася і стала жыць у хаце. Гаспадарнічала яна бездакорна, спраўлялася з усёй жаночай працай. Мара, а не жанчына... І што здарылася? Раптам сышла, знікла, быццам бы яе ніколі не было, пакінуўшы ў хаце пасля сябе смутак — і гэта ў той час, калі ўся прырода заклікае радавацца жыццю...

Гісторыя для псіхатэрапеўта, які будзе спрабаваць разбірацца ў складаных калізіях адносінаў і наўрад ці знойдзе адказ на пытанне, чаму так адбываецца.

Аднак яшчэ адзін спецыяліст — фальклярыст — можа выказаць сваю версію знікнення дзяўчыны. Ці не русалкаю яна была? Паводле народных паданняў, якія распавядаюць пра загадкавых прыгажунь, вядома, што можна іх злавіць і прывесці ў чалавечае жытло, нават скорацца яны і будуць служыць гаспадару. Але толькі год — абавязкова збяжыць да наступнага Русальнага тыдня, які ішоў пасля Сёмухі, напярэдадні Пятрова паста.

Лічылася, што ў гэты час сустрэцца з русалкай асабліва небяспечна хлопцам, якія і ведаць не ведаюць, якія насамрэч мэты мае салодкагалосая і няўлоўная жанчына-хахатуння. І паспрабуй ты здагадайся, хто яна такая? Распрануташ, эратычная — дык мода цяпер такая. Без хваста — дык мясцовая, беларуская русалка не абавязкова была падобная на жанчыну-рыбу. І па зямлі ж ходзіць — мала таго, на Русальным тыдні яшчэ і сярод белага дня!

Вобраз прыгожай, але недаступнай, жанчыны здаўна натхняў паэтаў, пісьменнікаў, мастакоў, кампазітараў. А сёння пра русалак нават здымаюць кіно. Гэта лепш за што сведчыць пра тое, што гэтая гераіня казак і гісторый аказалася вельмі жыццяздольнай. Афіцыйная навука лічыць русалак міфалагічнымі істотамі. Але час ад часу якая-небудзь нечаканая знаходка, якая дайшла з глыбінь вякоў, прымусіць падумаць: ці так добра чалавецтва ведае таямніцы прыроды? Нездарма ж гэты вобраз ёсць у фальклоры самых розных народаў свету.

Русалка, Вадзяніца, Казытка, Купалка, Каўка... Колькі імёнаў далі ёй нашы продкі. Вымаўляць іх можна па-рамантычна-замілавана, ці надварот, запалохана і напружана. Напэўна, у любой мясцовасці, дзе ёсць рэчка, возера ці іншы вадаём, існуюць свае легенды пра русалак.

Але якія ж яны насамрэч? Чым небяспечныя чалавеку? Адказы на гэтыя пытанні дапамагла знайсці **Ірына МАХОЎСКАЯ, супрацоўніца кафедры этнаграфіі і фальклору БДУ.**

ХТО ЯНЫ?

Фальклярысты лічаць русалку адным з найскладанейшых персанажаў беларускай дэманалогіі. Яна з'яўлялася насельніцай адначасова дзвюх стыхій: вады і зямлі. Паходжанне русалкі звязваецца з заўчаснай, «няправільнай» смерцю. Русалкамі нібыта станавіліся дзеці, якія памерлі неахрышчанымі ці праклятыя сваімі маці яшчэ ў чэраве, дзяўчаты, што скончылі жыццё самагубствам; нарачоныя, што памерлі напярэдадні вяселля; дзяўчаты, якія памерлі на Русальным тыдні.

Асабліва шкада дзяўчат, якія загінулі з-за кахання, падманутыя жаніхом. Яны не ўступілі ў шлюб, але так і засталіся поўнымі кахання, і калі выходзяць са сваіх сховішчаў, то шукаюць сярод мужчын свайго нарачонага. Вось чаму асабліва маладым хлопцам нельга ўпадаць летам у лёгкадумнасць, хто ведае...

Вам, русалачкі, вяночкі,
А нам, маладым, сярпочкі,
Вам, русалачкі, у зямлі спаць,
А нам, маладым, жыта жаць.

ЯКІЯ ЯНЫ?

Уяўленні аб знешнім выглядзе русалак вельмі разнастайныя. Расійская даследчыца славянскай народнай дэманалогіі Л.Н. Вінаградава адзначае, што ўяўленні аб русалках як прыгажунях характэрны для Заходняга Палесся.

Русалкі-прыгажуні апісваюцца як маладыя дзяўчаты з густымі і вельмі доўгімі валасамі, якія свабодна распушчаны. Часам русалкі маюць на галаве вянок з кветак ці лісця. Апранаюцца русалкі ў белыя, празрыстыя сукні. Часам на іх можна ўбачыць залатыя ўпрыгожанні. Русалкі-прыгажуні вельмі любяць танцаваць, спяваць, гуляць. Часта іх можна сустрэць на лузе ці ў лесе.

Русальны тыдзень, Клечальны тыдзень, Траная нядзеля. Паводле паданняў, русалкі на Сёмуху выходзяць з вады і ходзяць па нівах, гаях. Паколькі русалкі лічыліся небяспечнымі для людзей (маглі заказытаць ці заманіць у ваду), на Русальным тыдні імкнуліся абыходзіць мясціны, блізкія да рэк і азёраў, не хадзілі ў лес, каб «русалка не забрала». Русальны тыдзень сяляне шанавалі, як і Каляды, і забароны ў гэтыя тэрміны існавалі падобныя. Працавалі толькі з раніцы, не пачыналі новай працы, забаранялася ткаць, прасці, віць вяроўкі, гарадзіць платы.

Русалкі-прыгажуні апісваюцца як маладыя дзяўчаты з густымі і вельмі доўгімі валасамі, якія свабодна распушчаны. Часам русалкі маюць на галаве вянок з кветак ці лісця. Апранаюцца русалкі ў белыя, празрыстыя сукні. Часам на іх можна ўбачыць залатыя ўпрыгожанні. Русалкі-прыгажуні вельмі любяць танцаваць, спяваць, гуляць. Часта іх можна сустрэць на лузе ці ў лесе.

Русалкі выходзяць на Русальным тыдні ў вадзе, адкуль выходзілі на Русальным тыдні і заставаліся на зямлі да позняй восені. Пасля выхаду з вады, русалкі пасяліся ў палях ці ў лясах, дзе яны гушкаліся на арэлях, падвешаных да галінаў дрэў, скакалі, плялі вянкі, вадзілі карагоды, спявалі песні. Небяспека для чалавека была ў тым, што русалкі завабліваюць яго да сябе, абступалі гуртам, ціскалі ў абдымках і маглі заказытаць да смерці. Таксама маглі зацягнуць у ваду ці багну і ўтапіць.

Менавіта на Русальным тыдні гэтыя нячысцікі былі асабліва небяспечнымі для чалавека. Таму ў гэты час прытрымліваліся забаронаў на працу, не мыліся, не мылі блізкіну, не лавілі рыбу, забаранялася прасці, віць вяроўкі, гарадзіць платы і г.д. Забарона тычылася і наведвання мясцінаў, дзе могуць знаходзіцца русалкі: не хадзілі ў лес, асцерагаліся падыходзіць да вадаёмаў.

ЯК ЗАСЦЕРАГЧЫСЯ?

Засцерагальнымі сродкамі выратавання ад русалак, як і ад іншых нячысцікаў, быў нацельны крыжык — сапраўды ж нельга без яго хадзіць. І малітва любых русалак адагнаць здолее. Але ў фальклоры кажуць пра іншыя сродкі. Вельмі непрыемныя ёй некаторыя расліны — часнок ці палын. Згодна з беларускім павер'ем, калі нападалі русалкі, чалавек павінен быў намаляваць па магчымасці вялікае кола, у цэнтры яго — крыж і стаць на яго. Русалкі будуць злавацца, могуць нават кідацца камянямі, але намаляваны крыс не пяройдуць. Дзейсным сродкам лічылася таксама іголка ці шпілька, каб укалоць русалку, ад гэтага ўсе яны з віскам разбягаліся. У той жа час навукоўцамі зафіксаваны паданні аб русалках, якіх злавілі і прывялі дамоў, дзе яны засталіся жыць і працавалі на карысць чалавека.

Падобныя вобразы існуюць у фальклоры розных краін свету. Недзе русалкі жывуць у моры і нагадваюць рыбаў, а недзе знешне падобныя на людзей, толькі халодныя. У Грэцыі русалак завуць Сірэнамі, у Сербіі — Вілямі, у Германіі — Ундзінамі, у Літве — Нарэ, у Ірландыі Мерроў... Нават у Сярэдняй Азіі раскажуць пра дзяўчыну-рыбу Су-кзлар.

ЦІ РАБІЛІ ШТО ДОБРАЕ?

Раней верылі, што там, дзе пабегалі русалкі, трава расце зялянейшай і гусцейшай. Яны надзяляліся роляй ахоўніц ураджаю. Русалкі знаходзіліся ў жыце, калі яно пачынала цвісці, і сачылі, каб ніхто не хадзіў у гэты час па полі, не ламаў і не абтрасаў каласоў. Дзяцей палохалі, каб яны не хадзілі па жыце, бо «русалка заказыча». Але, спрыяючы ўраджаю, русалкі маглі пакараць таго, хто працаваў на Русальным тыдні: вытоптвалі пасевы, насылалі град ці засуху, шкодзілі хатняй жывёле. Ёсць над чым нам задумацца.

Зразумела, лепш русалку не злаваць, таму што дзяўчына ж з характарам...

— У адрозненне ад іншых нячысцікаў, з русалкай немагчыма было заключыць «кантракт», па якім яна б спрыяла чалавеку, прыносіла яму багацце ці незвычайныя здольнасці ў замен на яго душу пасля смерці. Акрамя таго, у народзе існавалі прысвечаныя русалкам абрады, чаго няма ні ў адным выпадку з іншымі нячысцікамі, — падсумоўвае кандыдат гістарычных навук Ірына Махоўская.

ЯК ПРАВЕСЦІ РУСАЛЬНЫ ТЫДЗЕНЬ?

Склаўся ў народзе нават абрад Русальнага тыдня — провады русалкі. Выбіралася прыгожая дзяўчына, якую апраналі русалкай: распускалі валасы, упрыгожвалі кветкамі, стужкамі, на галаву надзявалі вянок, часта з русалкі здымалі адзенне, пакінуўшы толькі кашулю. Дзяўчаты, па парах узяўшыся за рукі, з песнямі вялі русалку за вёску ў поле. Там яе сілком упіхвалі ў жыта, зрывалі з яе вянок і разбягаліся. Русалка бегла за дзяўчатамі, ляскала ў далоні і палохала сябровак гучнымі воклічамі.

У некаторых сёлах, напрыклад, у сяле Юркевічы Гомельскай вобласці рабілі чучала русалкі з саломы. Саламяную «русалку» таксама ўбіралі каснікамі і кветкамі. Дзяўчаты распускалі косы, апраналі на галовы вяночкі і вадзілі карагоды з русальнай лялькай, потым выкідалі яе ў жыта і ўцякалі. Яшчэ ў адным лакальным варыянце правадаў русалкі дзяўчаты выкідалі ў поле свае вянкі. На наступны дзень іх адшуквалі, разрывалі і раскідвалі на агародах, каб не заводзіліся чэрві ў капусце. Спявалі русальныя песні:

Праўду русалку, праўду
Да й асінкаю заламлю,
Каб тая русалка
па жыце не хадзіла,
Майго жыта не ламіла.
Маё жыцейка дробнае
Да ў каласку буйнае.
Праўду русалку, праўду
Да й асінкаю заламлю.

Пасля провадаў русалкі дзяўчаты вярталіся ў вёску, дзе да іх далучаліся хлопцы, і яны разам ладзілі вечарыну з песнямі і скокамі.

...Ці не тут была галоўная спакуса Русальнага тыдня? Ці не ад таго перасцярогі: маўляў — пагуляць пагуляй, а пра тое, чаму носіш крыжык — не забывай. Усё-такі вялікія светлыя святы на парозе — Сёмуха ды Духаў дзень.

Падрыхтавала Ларыса ЦІМОШЫК.

АДЗІН — ЗА СЯБЕ

Нефармат

У тралейбусе пасварыліся дзве жанчыны. Акурат на мосце праз вяслярны канал нехта згадаў, што побач з гэтым месцам сёлета прайшла ўдалая аперацыя па выратаванні рыбакоў. Гісторыя тыповая: напрадвесні на тоненькім лёдзе аматары-экстрэмалы трапілі ў бяду. На дапамогу прыйшлі выратавальнікі з падраздзялення МНС. Адзін з іх, зусім яшчэ малады хлопец, калі выцягваў некага з небараку, сам праваліўся ў ледзяную ваду, падхапіў запаленне лёгкіх, потым, натуральна, доўга лячыўся. Але ж справа завяршылася паспяхова, пра яе вынік дружна напісалі ўсе газеты.

Дык вось жанчына, у якой, вельмі падобна на тое, хтосьці са сваякоў служыць выратавальнікам, адразу і катэгарычна выказалася супраць «вымушанага» гераізму. Яе аргументы зводзіліся да наступнага: «Навошта ратаваць людзей, якія ідуць на рызыку добраахвотна і свядома? Колькі газеты, радыё, тэлебачанне кожны сезон трубяць пра небяспеку лову на тонкім крохкім вясновым лёдзе! Ды і якому даросламу нармальнаму чалавеку можа быць незразумела, што такія забавы тояць у сабе вялікую мажлівасць бяды? А калі людзі ўсё ж ідуць на неабдуманую рызыку, значыць, яны бяруць на сябе адказнасць за ўласнае жыццё».

У тралейбуснай прамоўцы адразу ж знайшлася апанентка, якая запярэчыла, што ў выратавальнікаў такая прафесія — ратаваць людзей, а не высвятляць, пры якіх абставінах, яны трапілі ў бяду. Але першая кабета стаяла на сваім: прафесія выратавальніка падразумявае дапамагаць тым, хто трапіў у надзвычайнае становішча па волі лёсу ці недарэчнага выпадку, а не тым, хто па ўласнай дурасці, часта падагрэўшы азарт гарэлкай, лезе без дай прычыны на ражон. Калі ж разглядаць апошні выпадак, то тыя, каго давялося ратаваць, усе былі дзядзькамі за сорак, а тыя, хто ратаваў, па ўзросце падыходзілі ім у сыны. У дыскусію ўцягнулася амаль палова пасажыраў тралейбуса, і кожны падтрымліваў адну з завадатарак дыскусіі. Наўрад ці ў гэтай спрэчцы нарадзілася б ісціна, але закончыўся дыспут гэтак жа раптоўна, як пачаўся, на прыпынку «28 Ліпеня» выйшла большасць салона.

Відавочна, што абодва бакі выпадковай славеснай сутычкі мелі сваю рацыю. Як відавочна і тое, што ў работу выратавальнікаў ніхто не будзе ўносіць карэктывы наконт мэтазгоднасці дапамогі ў залежнасці ад ступені віны пацярпелага. Але ж нельга і не прызнаць, што пачуцця адказнасці за сябе чалавеку, асабліва нашаму суайчынніку, вельмі часта бракуе. Не варта, мусіць, казаць пра надзвычай частыя выпадкі гібелі на пажарах, прычынай якіх бывае нязменнае курэнне ў п'яным выглядзе альбо нецвярозае ліхацтва за рулём. Апошнія, хутчэй, з разраду злачыннасці, паталогіі ці пагранічнага з імі сацыяльнага падзення. І гэта асобная тэма.

Хачу пагаварыць аб іншым. Савецкая сістэма каштоўнасцяў, тагачасная ідэалогія выхоўвала чалавека-калектывіста. Памятаеце: адзін — за ўсіх, усе — за аднаго. Са стратай калектывізму як пачуцця мы шмат чаго страцілі. Ці многа цяпер ёсць нават працоўных калектываў, дзе захавалася атмасфера добрасычлівасці і ўзаемападтрымкі? Свет змяніўся. Рынкавыя адносіны патрабуюць ад чалавека ўмення змагацца за сваё месца пад сонцам. І амаль нязменна выйграе той, хто разлічвае перш за ўсё на сябе, на ўласныя магчымасці.

З месяц таму ў адным з матэрыялаў я прысвяціла абзац наведвальніцы брэсцкага карпункта Ларысе Анатольеўне Катовіч. Цікавым, нават знакавым уяўляецца мне працяг гісторыі гэтай жанчыны. Напомню, бяда абрынулася на гэту жанчыну ў выглядзе пажару. Пакуль гаспадыня была на рабоце (яна працуе медсястрой), зламысніца падпаліла яе дом. Згарэла ўсё нажытае, і дом, які Ларыса будавала амаль чвэрць стагоддзя. Спачатку яна думала, што не перажыве гэтага, здарыўся інфаркт. Некаторы час пасля выпіскі з бальніцы не магла працаваць. Паходы па калідорах улады нічога не далі, акрамя невялікай матэрыяльнай дапамогі, якой хапіла б на камплект адзення аднаго сезона. Яна вельмі любіла свой дом, нават знадта. Як сказаў ёй адзін святар, з якім давялося гутарыць: «Вы зрабілі са свайго дома храм, а гэта няправільна». Менавіта тая сустрэча з маладым яшчэ бацюшкам дапамагла ёй крыху супакоіцца і ўнутрана сабрацца. І Ларыса Анатольеўна ўзялася за справу. Яна адкрыла рахунак, звярнулася да многіх добрых людзей, да сяброў, знаёмых, усіх, хто мог дапамагчы. Адзін дапамог капейкай, іншы — будаўнічымі матэрыяламі, і гаспадыня пачала адраджаць свой дом. Да зімы яна плануе аднавіць першы паверх і зрабіць перапланіроўку. Новы дом будзе больш сціплым, аднапавярховым. Але ён будзе! Ларыса Анатольеўна кажа: «Самым цяжкім быў адчай бы ўсведамленне таго, якія мы адзінокія і безабаронныя перад любой навалай. Калі б я не распачала будоўлю, я не выжыла б, хваробы канчаткова адолелі б, а так, спадзяюся, яшчэ пажыву».

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ІНТРЫЖКА ЁСЦЬ ІНТРЫЖКА

Псіхолагі сцвярджаюць, што пра курортныя раманы мараць каля 70 працэнтаў жанчын.

Яны могуць гаварыць сабе і іншым, што ніколі не пойдуць на выпадковую сувязь, але на адпачынку, як правіла, аказваюцца не ў сілах супрацьстаяць спакусе. Многія кідаюцца ў курортны раман як у вір з галавой і не ўзважваюць усе магчымыя плюсы і мінусы. А апошніх, як правіла, аказваецца больш.

Герой курортнай інтрыжкі — заўсёды кот у мяшку. Мы ўяўлення не маем, што і дзе ў яго баліць, з кім і як даўно ён займаўся сэксам і ці карыстаўся пры гэтым прэзерватывам. Дарэчы, паводле даных Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, герпес і вірус папіломы чалавека — найбольш распаўсюджаныя захворванні, якія перадаюцца палавым шляхам. Яны не вылечваюцца, а апошні яшчэ ўбудоўваецца ў геном клеткі чалавека з тым, каб ужо ніколі яго не пакінуць.

Акрамя таго, для многіх мужчын сэкс — асаблівы від спорту. Яны здольны займацца ім, і не перажываць пры гэтым ніякіх пачуццяў да партнёршы. А вось жанчынам уласціва зараджэнне кахання да сэксуальнага партнёра. Але ў курортнага ўлюбляцца не варта, таму што для яго раман на адпачынку — тое, аб чым ён лёгка забудзецца, як толькі вернецца да жонкі і дзяцей.

Нарэшце, за адной здрадай, як правіла, цягнецца ланцужок іншых захапленняў. Па той простай прычыне, што калі аднойчы вы ўжо пераадолелі бар'ер, які аддзяляў вернасць і пастаянства ад здрады, то псіхалагічна прыняліся тое, што адбылося.

ТЭСТ

ЦІ ПАГРАЖАЕ ВАМ ГЭТЫМ ЛЕТАМ КУРОРТНЫ РАМАН?

1. Што вы пакладзяце ў свой чамадан?

А. Што-небудзь спакуслівае. 10
В. Прыгожыя рэчы. 5
В. Галаўны ўбор ад сонца. 0

2. Чым запоўніце час у дарозе?

А. Новым знаёмствам. 10
Б. Чытаннем любоўнага рамана. 5
В. Буду спаць. 0

3. Вы мяняецеся падчас адпачынку?

А. Так, станаўлюся бесклапотнай і адкрытай для прыгод. 10
Б. У мяне заўсёды добры настрой. 5
В. Менш сачу за сваёй знешнасцю. 0

4. Падчас адпачынку вы ходзіце ў рэстараны ці кафэ?

А. Часцей у рэстараны. 10
Б. Калі толькі пакліча сяброўка. 5
В. Імкнуся пазбягаць людных месцаў. 0

5. Што вы скажаце, калі ў рэстаране вас запросіць на танец?

А. «З задавальненнем!» 10
Б. Разгублюся, але згаджуся. 5
В. «Не танцую». 0

6. Як вы рэагуеце на камплімены незнаёмых мужчын?

А. Даю зразумець, што мне гэта прыемна. 10
Б. Усмешкай. 5
В. Раблю выгляд, што не чую. 0

7. Чым будзеце займацца ў вольны ад загарання час?

А. Знайду сабе кампанію. 10
Б. Згуляю з кім-небудзь у валейбол. 5
В. Пайду адпачываць у нумар. 0

8. У адпачынку будзеце вытрымліваць дыету?

А. Так, хачу быць прывабнай. 10
Б. Пастараюся. 5
В. Навошта? 0

9. Што для вас вострыя адчуванні?

А. Новыя эратычныя ўражанні. 10
Б. Паплаваць аголенай. 5
В. Зайсці ў халодную ваду. 0

10. Калі параўнаць адпачынак з напоем, то гэта будзе...

А. Ігрыстае шампанскае. 10
Б. Алкагольны кактэйль. 5
В. Шклянка кефіру. 0

Ад 0 да 40 балаў.

Курортны раман вам не пагражае. На водпуск вы гледзіце з пункту гледжання паўнацэннага адпачынку. Вы не станеце любавацца ўсходамі над морам і танцаваць усю ноч да раніцы — лепей будзеце разглядаць салодкія сны. Затое, калі набераецся сілаў, вам удасца дасягнуць кар'ерных поспехаў. Галоўнае, дакладна ведаць, чаго хочаш.

Ад 41 да 90 балаў.

Вас чакае прыемны флірт, які ні да чаго не абавязвае. Мужчыны будуць аглядаць вас прагнымі позіркамі, рабіць кампліменты і запрашаць на танцы. Гэтага вам акажацца цалкам дастаткова. Хоць, не выключана, што вы сустрэнеце таго, што закране ваша сэрца. Тады здзівіцеся самі сабе.

Ад 91 да 100 балаў.

Вы ніколі не сумуеце на адпачынку: самі выбіраеце мужчын і часам разбіваеце нямала сэрцаў. Ваш адпачынак — суцэльныя прыгоды і забавы. Не выключана, што ваша адкрытасць калі-небудзь падорыць вам сустрэчу з адзіным і непаўторным мужчынам.

Святлана БАРЫСЕНКА.

Казкі для дарослых

Грыбныя страсці

Калі на роўныя асфальтаваныя дарожкі апускаецца асенні вечар і ў дамах, дзе жывуць адпачывальнікі, запальваюцца агні, на алеі невялікага скверыка з'яўляецца пара. Мужчына і жанчына ідуць калі не пад руку, дык, ва ўсякім разе, на такой блізкай адлегласці адно ад аднаго, што не застаецца ніякіх сумненняў у іх узаемных прыязных адносінах. Яны не першы год прыязджаюць разам у гэты санаторый. Жывуць у розных пакоях, кожны пад сваім прозвішчам. Але заўсёды трымаюцца разам, адасабляюцца ад астатніх...

Галіна спецыяльна выбірае для адпачынку грыбны сезон. Заядлая грыбніца, яна ўжо на памяць ведае ўсе сцяжынкі і лагчынкі, усе «каштоўныя месцазнаходжанні» ў радыусе з паўкіламетра вакол санаторыя, дасканала вывучыла іх за некалькі апошніх гадоў. Грыбы ідуць на засушку і засолку. Валера заўсёды прывозіць з сабой некалькі пустых вёдраў ці іншую тару, а потым адвозіць (запоўненую) на машыне дадому. Калі заканчваецца тэрмін путоўкі, за ім на службовай машыне прыязджае вадзіцель, і яны разам грузяць у багажнік прыгатаваныя Галінай грыбныя прысмакі і разнасолы. Вадзіцель прыцмоквае ад здзіўлення языком: «Гэта вы самі, Валерый Іванавіч, назбіралі?»

Валера невыразна паціскае плячыма і, стараючыся надаць голасу адценне абыякавасці, адказвае: «Не зусім... Дапамагала тут адна... суседка па паверсе».

У гэты самы час «суседка» ўважліва назірае за зборамі пяці шчылін паміж фіранкамі ў сваім пакоі... Яна паедзе дадому спачатку ў прыгарадным аўтобусе, потым — у электрычцы. І ўсё вернецца на «кругі свае». Дом, дзеці, работа на чыгуначным вузле сувязі і... дача, дзе яны час ад часу сустракаюцца з Валерам. Галіна ўжо і сама дакладна не памятае, як і чаму ўсё гэта закруцілася, дзе і калі пачалося. Наглядзелася прыгожых фільмаў, пазайздросціла чужому каханню і прыгожаму жыццю... Захацелася незвычайнасці, небудзённасці, узлёту... Муж — самы пасрэдны, з такім не ўзляціш. З дому — на работу, з работы — дадому. З парога — на кухню, з кухні — у залу, за кнігу, за газету, а потым — спаць. Яна ляжала побач з ім з заплюшчанымі вачыма і пад яго храпенне марыла зусім аб іншым жыцці: поўным прыгод, рызыкі і пачуццёвасці. А раніцай наступнага дня ўсё паўтаралася зноў...

Ні ад чаго не стамляешся так, як ад будзённасці, ад штодзённага паўтарэння падзей, размоў і твараў. Прыядаючыся паступова і спакваля, яны робяцца неад'емнай часткай жыцця, яго стваральнікамі і разбуральнікамі адначасова... Так жылі ўсе Галіны сяброўкі, суседкі, калегі, знаходзячы ў хатнім кругавароце і дачных клопатах і супакаенне, і радасць, і збавенне ад іншых праблем, і нават шчасце. Галіна, адзіная са свайго невялікага калектыву, любіла камандзіроўкі. Нават непрацяглыя і зусім кароценькія — туды і назад: раніцай — у сталіцу, з паперамі да высокага начальства, вечарам — дадому. Вось і даездзілася: Валерый Іванавіч, на якога яна нават глядзець баялася, калі паперы на подпіс прывозіла, уласнай персонай запрасіў да сябе на дачу. Было нейкае свята, у госці панаехала процьма людзей (балазе, жонка гаспадара знаходзілася на адпачынку ў іншай краіне). Так, здаецца, усё і пачалося... Падвыпіўшы, народ запаліў вогнішча, пачалі смажыць шашлыкі... Шампанскае цякло ракой, з начнога неба таямніча падміргвалі зоркі... Душа неслася ў рай, і Галіне здавалася, што менавіта да гэтага адчування яна імкнулася ўсё жыццё... Валерый Іванавіч вадзіў яе, п'яную ад шчасця, за руку паміж градак і тлумачыў, дзе і што расце, хоць усё роўна нічога не было відаць...

Потым яны не раз прыязджалі на дачу ўдваіх. Спачатку для таго, каб адпачыць, расслабіцца, нацешыцца адсутнасцю чужых вачэй... Але аднойчы, «каб не вяртацца сюды аднаму яшчэ раз», Валера папрасіў яе дапамагчы паліць памідоры і агуркі ў парніку. Галіна згадзілася. У наступны свой прыезд яны «за аднам разам» абабралі куст чырвонай парэчкі, і Валера павёз дадому цэлае вядро ягад на кампоты... Потым палолі градкі, збіралі слівы, яблыкі, выкопвалі бульбу. Галіна і сама не заўважыла, як уцягнулася. Здзіўлялася толькі свайму спруту, сіле, вынослівасці — трэба ж было завіхацца на дзвюх дачах (сваёй і Валеравай), усюды паспяваць. Муж асабліва не цікавіўся, дзе і як жонка праводзіла выхадныя. Ды і яна, падняўшыся ў сваіх уласных вачах, увогуле перастала з ім лічыцца... Праўда, ехаць адпачываць у санаторый з чужым чалавекам у першы раз было ўсё ж жудаснавата. За пару тыдняў да ад'езду Валера папрасіў яе дапамагчы ўправіцца з агародам. Жонка адпусціла яго на дачу з адзінай умовай: сабраць і закансерваваць агуркі. На агурочнай ніве Галіна шчыравала ледзь ці не да апоўначы. І калі, стомленая, ледзь дацягнулася да ложка — не да рамантыкі ўжо было, не да кахання — у акно нечакана ўдарыў свет ад аўтамабільных фар. У пакой заляцеў напалоханы Валерый Іванавіч: «Схавайся куды-небудзь хутчэй, сын з сяброўкай прыехаў!»

Нічога не папішаш — прыйшлося лезці на гарышча...

Седзячы наверсе на зламанай раскладушцы, ляскаючы зубамі ад холаду і хутаючыся ў тоненькую коўдру, Галіна слухала, як смяюцца і нешта гучна абмяркоўваюць унізе незнаёмыя людзі. Яны звінелі шклянкамі і гараталі, а яна скрозь маленькае акенца пазірала на жніўеньскае неба, адкуль па-змоўніцку падмігвалі зоркі... Было вельмі шкада сябе і хацелася лаяцца апошнімі словамі. Успаміналіся ўласныя дзеці і мучыла думка пра тое, што яны, напэўна, леглі спаць ненакормленыя...

Натуральна, назаўтра Галіна спазнілася на работу. Праз паўгадзіны калегі былі ў курсе яе спраў — разлаванай жанчыне вельмі цяжка стрымліваць свае эмоцыі... Усе думалі, яна не даруе ні яму, ні сабе, паступова супакоіцца, апусціцца на зямлю, возьмецца за розум. У першыя дні пасля прыезду з дачы яна сапраўды сцішылася, узяла сябе ў рукі... Але ўжо праз тыдзень патэлефанавала Валеру, каб... папрасіць прабачэння за свой «нервовы зрыў». Гэта толькі яшчэ раз пацвердзіла вядомую аксіёму наконт таго, што жаночыя ўчынкі не падпарадкоўваюцца законам логікі.

Пра Галіну пагаварылі і забылісяя: у рэшце рэшт, супрацоўніцам надакучыла кожны дзень абмяркоўваць адно і тое ж. Дароспая жанчына — яе праблемы.

...Каханне, кажуць, рэч вельмі злая. Ніколі не ведаеш, які жарт утворыць з табой у наступны момант. Галіна часта ўспамінае свой першы вечар на Валеравай дачы. Вогнішча, песні, пырскі шампанскага... Яна хацела прыгожай казкі і гатовая была дзеля гэтага ахвяраваць усім ранейшым жыццём, зацягнутым плёнкай паўсядзённасці... Магчыма, яна апынулася не ў той казцы ці с

На свае вочы

ПІЦЕР БАКІ ВЫЦЕР

У мінулым артыкуле «Беларускі Пецярбург» пастараўся распавесці пра піцерскіх беларусаў. Аднак ёсць (бываюць) у горадзе на Няве і нашы суграмадзяне. Не толькі на экскурсіях, але і па справах. Падчас прэс-тура беларускіх і саюзных СМІ, наладжанага міжнародным цэнтрам інтэграцыйнай інфармацыі, грамадскім прэс-цэнтрам Дома прэсы, давялося, напрыклад, папрысутнічаць на пасяджэнні Сумеснай камісіі па развіцці супрацоўніцтва Ленінградскай вобласці і Рэспублікі Беларусь. Беларускія інтарэсы адшукаліся і падчас візітаў на прадпрыемствы Санкт-Пецярбурга. Аднак спачатку пра тое, дзе беларусаў не было. Прынамсі, ні ў спісах удзельнікаў, ні жыўцом нікога знайсці не ўдалося. Размова пойдзе пра XII Пецярбургскі міжнародны эканамічны форум, які праходзіў якраз тымі днямі.

ПМЭФ — па сутнасці расійскі адказ швейцарскаму Давосу. Калі зусім проста — «тусоўка» багацейшых і самых уплывовых людзей свету. Пра гэта можна было здагадацца па колькасці акіянскіх лайнераў і самых дарагіх яхтаў, якія раптоўна апынуліся ў Фінскім заліве і нават «запаркаваліся» каля набярэжнай Нявы побач з незабыўнай «Аўрорай». Вось такі своеасаблівы рэванш сусветнага капіталу ў цэнтры «калыскі трох рэвалюцый». Асаблівы ажыятаж традыцыйна выклікала яхта Pelorus, якая належыць расійскаму алігарху, губернатару Чукоткі Раману Абрамовічу. 115-метровае судна коштам 129 мільёнаў долараў не памясцілася ў месцы агульнай швартоўкі для гасцей побач з «Ленэкспа» і таму яго размясцілі на Англійскай набярэжнай. Прычым, «паркоўка» уладальніку Чэлсі не каштавала ні долара, у той час як з уладальнікаў іншых яхтаў за стаянку ў цэнтры Пецярбурга бяруць ад трох да чатырох тысяч за суткі.

Сярод іншых заўважных асобаў форуму можна назваць прэзідэнта Расіі Дзмітрыя Мядзведзева, які і адкрыў мерапрыемства, міністра фінансаў Германіі Пеэра Штэйнбрука, міністра гандлю ЗША Карласа Гуціераса, кіруючага дырэктара Сусветнага Банка Нгозі Аконьо-Івела, прэзідэнта «Майкрасофт Інтэрнэйшнл» Жан-Філіпа Куртуа, галоўнага рэдактара газеты «Файнэншл Таймс» Лаянела Барбера, старшыню праўлення ААТ «Газпрам» Аляксея Мілера, гендырэктара «Расатама» Сяргея Кірыенку, прэзідэнта ААТ «Лукойл» Вагіта Алекперава і многіх іншых. Усяго ў мерапрыемстве ўзялі ўдзел больш за 10 тысяч чалавек, у тым ліку — 2300 удзельнікаў і 800 прадстаўнікоў СМІ. На форум прыехалі 74 афіцыйныя дэлегацыі, прысутнічалі кіраўнікі дзяржаў, прэм'еры, віцэ-прэм'еры, міністры, кіраўнікі сусветных кампаній.

Вынікі XII ПМЭФ нават у грашовым вымярэнні таксама ўражваюць: за два дні заключана здзелак на 14,6 млрд долараў. З больш дробязнага — госці паміж справамі набылі некалькі прыватных самалётаў, якія адна амерыканская кампанія прадстаўляла побач з прэс-цэнтрам.

Сярод пытанняў, што абмяркоўваліся на форуме, многія ў той ці іншай ступені датычыліся і інтарэсаў нашай дзяржавы. Напрыклад, «Нацыянальныя інтарэсы і глабальныя правілы: выклікі будучыні», «Свет адной валюты», «Энергетыка — глабальныя ігракі і арбітры. Узаемазалежнасць, партнёрства, канкурэнцыя»...

У той час, як на Васільеўскім востраве вырашаліся лёсы сусветнай эканомікі, у рэзідэнцыі губернатара Ленінградскай вобласці не менш плённа працавала беларуская дэлегацыя на чале з віцэ-прэм'ерам Беларусі Андрэем Кабяковым. На пасяджэнні сумеснай камісіі разглядаліся пытанні супрацоўніцтва гандлёва-прамысловых палат, паставак трактароў і сельскагаспадарчай тэхнікі з Беларусі, узаемных паставак прадукцыі аграпрамысловага комплексу, развіцця супрацоўніцтва і кааперацыі ў галіне будаўніцтва, рэалізацыі сумесных праектаў на тэрыторыі Ленінградскай вобласці.

Як адзначыў падчас імправізаваны прэс-канферэнцыі па выніках пасяджэння Андрэй Кабякоў, гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва паміж Рэспублікай Беларусь і Ленінградскай вобласцю развіваецца даволі дынамічна. Летась аб'ём таварааабароту павялічыўся ў паўтара раза, а сёлета да канца года можа перавысіць 400 млн долараў. Адметна, што сальда знешняга гандлю для Беларусі складваецца адмоўнае. І гэта пры тым, што Ленвобласць не мае нафты і газу. Паводле слоў Андрэя Ўладзіміравіча, гэта з'яўляецца стымулам для беларускага боку. У найбліжэйшы час будуць вызначаны пазіцыі, якія наша рэспубліка зможа прапанаваць рэгіёну Расіі з тым, каб збалансаваць таварааварот.

Паводле слоў віцэ-прэм'ера, Урад Беларусі і Урад Ленінградскай вобласці распрацоўваюць праграму супрацоўніцтва на 2009—2011 гады. Аналагічная праграма на 2006—2008 гады ў асноўным выконваецца. Ёсць пазітыўныя вынікі: павялічваюцца пастаўкі беларускай сельскагаспадарчай, камунальнай тэхнікі. Рэгіён праяўляе цікавасць да магчымасцяў беларускіх будаўнікоў і вытворцаў будаўнічых матэрыялаў. Як адзначыў Андрэй Кабякоў, далейшае нарошчванне тавараабароту будзе адбывацца, у першую чаргу, за кошт павелічэння паставак па традыцыйных накірунках, у прыватнасці, сельгастэхнікі. Намеснік прэм'ер-міністра Беларусі падкрэсліў, што развіццё аграрна-прамысловага комплексу ў Ленінградскай вобласці знаходзіцца на высокім ўзроўні і патрабуе адпаведнага ўзроўню тэхнікі. У сувязі з гэтым ужо ў самы блізкі час узоры беларускай сельскагаспадарчай тэхнікі могуць быць накіраваны для выпрабаванняў на палігоны Ленінградскай вобласці, каб больш шырока прадэманстраваць яе магчымасці.

Падчас пасяджэння сумеснай камісіі Андрэй Кабякоў выканаў і яшчэ адну прыемную місію: уручыў ордэн Пашаны губернатару Ленінградскай вобласці, нашаму земляку Валерыю Сердзюкову за значны ўклад у развіццё гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва паміж Беларуссю і рэгіёнам РФ.

Вялікі інтарэс да супрацоўніцтва з беларускімі прадпрыемствамі праяўляюць і прадпрыемствы Санкт-Пецярбурга.

ААТ «Звезда» — вядучы расійскі вытворца лёгкіх высокаабаротных дызельных рухавікоў для суднабудавання, чыгуначнага транспарту. Адным з галоўных партнёраў прадпрыемства з'яўляецца Беларуская чыгунка. Сёння на БЧ эксплуатуецца больш за 100 дызеляў тыпу ДР1 з больш як 230 рухавікамі ААТ «Звезда». Прадпрыемства таксама з'яўляецца афіцыйным удзельнікам Праграмы развіцця Беларускай чыгункі да 2010 года і праграмы мадэрнізацыі дзеючага і ўкаранення новага рухомага саставу. ААТ узяло ўдзел у стварэнні новай серыі пасажырскіх дызель-цягнікоў павышанай камфортнасці, якія будуе паводле заказу Беларускай чыгункі Рыжскі вагонабудаўнічы завод.

Летась прадпрыемства разам з БЧ распачала праект мадэрнізацыі дызель-цягніка серыі ДР1А з заменай рухавікоў папярэдняга пакалення на сучасныя эканамічныя рухавікі магутнасцю 1500 к. с. З павышанай надзейнасцю, палепшанымі экалагічнымі і эксплуатацыйнымі характарыстыкамі. Дастаткова адзначыць, што мотарэсурс навінкі павялічаны практычна ўдвая! Цяпер першы мадэрнізаваны дызель-цягнік праходзіць доследную паднаглядную эксплуатацыю на дыстанцыі Мінск—Гомель. На сярэдзіну мая яго прабег склаў 48 000 км: фактычна поўны абарот вакол зямнога шара прайшоў без заўваг. У выпадку паспяховага завяршэння выпрабаванняў у лістападзе будзе сфарміравана праграма паэтапнай мадэрнізацыі ўсяго парка дызель-цягнікоў серыі ДР1А на Беларускай чыгунцы. Агульны аб'ём мадэрнізацыі ацэньваецца прыкладна ў 150 адзінак дызельных рухавікоў.

ААТ «Авангард», найбуйнейшае навукова-вытворчае аб'яднанне Расіі, — прадпрыемства зусім іншага кшталту. Асноўны накірунак яго дзейнасці — мікраэлектроніка і мікрасістэматэхніка.

Мікрасістэматэхніка (МСТ) — гэта новая галіна навукі і тэхнікі, мэта якой — стварэнне мікрасістэм, што забяспечваюць успрыняцце фізічных, хімічных, і біялагічных характарыстык асяроддзя. Улічваючы велізарную патрэбу Саюзнай дзяржавы ў сучасных сістэмах і электроннай элементнай базе для іх, заснаванай на апошніх дасягненнях у галіне сістэматэхнікі і нанатэхналогій, ААТ «Авангард» разам з беларускім ДНДА «Планар» выступілі ініцыятарамі распрацоўкі навукова-тэхнічнай праграмы Саюзнай дзяржавы «Распрацоўка і стварэнне новага пакалення мікрасістэматэхнікі і ўніфікаваных інтэграваных сістэм двайнога прызначэння на яе аснове» на 2007—2011 гады. Прынята рашэнне ў рамках названай праграмы стварыць Расійска-Беларускі цэнтр «Мікрасістэматэхніка» на навукова-вытворчай базе ААТ «Авангард».

Чакаецца, што ў выніку рэалізацыі праграмы будзе створана сучасная навукова-вытворчая інфраструктура па распрацоўцы і вытворчасці кампанентнай базы і ўніфікаваных электронных модуляў для выпуску высокатэхналагічнай навукаёмістай імпартазамяшчальнай радыёэлектроннай прадукцыі сусветнага ўзроўню. Вобласць яе прымянення — найважнейшыя тэхнічныя сістэмы паветранага, марскога, наземнага транспарту, ракетна-касмічная тэхніка, машынабудаўнічае, энергетычнае абсталяванне, вылічальная тэхніка, сістэмы кіравання, навігацыі, сувязі, медыцынская тэхніка, экалагічны кантроль. У рэалізацыі праграмы бяруць удзел больш за 30 прадпрыемстваў Расіі і да 15 прадпрыемстваў Рэспублікі Беларусь. Сярод нашых — ДНВА «Планар», ДНВА «Інтэграл», Мінскі НДІ радыёматэрыялаў і іншыя. Тэрмін рэалізацыі праграмы разлічаны на 2009—2012 гады, аб'ём фінансавання складзе 1257 млн расійскіх рублёў. Пакуль праграма знаходзіцца на разгляздзе Расправа РФ і Мінпрама Беларусі. Аднак пэўныя падзвіжкі ўжо ёсць.

Сяргей ПРОТАС,
Санкт-Пецярбург — Мінск.

БЕЛАРУСКІЯ ПРЫВАТНЫЯ ГЕРБЫ

Глебка

У блакітным полі срэбная падкова гакамі ўніз, на ёй залаты крыж кавалерскі.

Гербам карысталіся: Глебка, Ісаевіч.

Дар

У блакітным полі срэбная падкова гакамі ўніз, працятая срэбнай стралой наўкос злева направа, над падковай залатая шасцікутная зорка.

Герб роду Маджарскіх.

Павала

У срэбным полі падкова гакамі ўніз, на ёй вагі, над правым плячом вагаў залаты крыж кавалерскі, над левым — чырвонае ядро.

Герб роду Скаргаў.

Кушаба

У чырвоным полі дзве залатыя трохканцовыя харугвы адна над адной.

Герб роду Кмітаў.

Рубрыку вядзе Уладзімір КРУКОЎСКІ.

У срэбным полі камень ад жорнаў з чорнай воссю.

Герб роду Гродзенскіх.

Кміта

У чырвоным полі срэбная падкова гакамі ўніз, на ёй залаты трохканцовы крыж.

Герб роду Кміт Чарнабыльскіх.

Минский городской центр недвижимости

Извещение о проведении 27 июня 2008 года

74-го открытого аукциона на право заключения договора аренды (сроком на 5 лет*) нежилых неиспользуемых помещений коммунальной собственности г. Минска

№ лота	Адрес, тип помещения, целевое назначение	Арендуемая площадь, кв. м	Начальная цена, тыс. руб.
	КУП «ЖРЭО Заводского района г. Минска» тел. 285-56-02		
1	ул. Народная, 52, подвал (защитное сооружение) (под непроизводственное – офис)	35,4	590
2	ул. Алтайская, 66а, помещение на 1 этаже, вход через ОПОП (под непроизводственное – офис)	37,23	620
3	ул. Жилуновича, 43, подвальное помещение (под торговый объект непродовольственной группы товаров)	38,34	2 000
4	ул. Голодеда, 49, пом. 04, подвальное помещение (под непроизводственное – офис)	16,5	270
5	ул. Л.Чайкиной, 15, помещение на 1 этаже, вход через пункт охраны правопорядка (под непроизводственное – офис)	52,47	870
6	ул. Селицкого, 105, п. 7, 1 этаж, проходной подъезд (под торговый объект по продаже овощей и фруктов, при условии выполнения требований МЧС и ЦГиЭ)	20,7	4 000
7	ул. Я. Райниса, 9, помещение на 1 этаже (под парикмахерскую)	71,08	7 000
	КУП «ЖРЭО Ленинского района г. Минска» тел. 223-35-03		
8	ул. К. Маркса, 11, ком. 7, помещение в цокольном этаже, имеется естественное освещение, электроосвещение, отопление, санузел совместного пользования, вход совместно с другими арендаторами (под непроизводственное – офис)	14,42	240
9	ул. Красноармейская, 8, подвал, отсутствуют естественное освещение, имеется отопление, энергоснабжение и санузел, вход через подъезд (под склад)	108,58	1 790
10	ул. Красноармейская, 32, подвал, требуется ремонт, отсутствуют естественное освещение, отопление, вода, вход через подъезд (под склад)	40,14	660
11	ул. Красноармейская, 32, подвал, отсутствует естественное освещение, имеется отопление, энергоснабжение и санузел), отдельный вход (под склад)	118,65	1 960
12	ул. Плеханова, 72, помещение на 2 этаже, имеется естественное освещение, отопление, санузел совместного пользования с другими арендаторами (под непроизводственное — офис)	56,9	940
13	ул. Плеханова, 72, помещение на 2 этаже, требуется ремонт, отсутствует отопление, санузел совместного пользования, вход совместно с другими арендаторами (под торговый объект непродовольственной группы товаров)	19,68	2 000
14	пр. Рокоссовского, 149, помещение на 1 этаже, имеется естественное освещение, отопление, энергоснабжение, отдельный вход, требуется ремонт (под образовательные, воспитательные цели)	114,9	1 900
15	ул. Маяковского, 168, убежище, без отопления, воды, имеется электроосвещение, вход через подъезд жилого дома, требуется косметический ремонт помещения (под склад)	73,33	1 210
16	пр. Партизанский, 13, подвальное помещение, вход через подъезд, коммунальные услуги имеются, естественное освещение отсутствует (под непроизводственное – офис)	53,26	880
17	ул. Судмалиса, 26, помещение на 1 этаже, требуется ремонт, имеется естественное освещение, отопление, санузел совместного пользования, вход совместно с другими арендаторами (под непроизводственное – офис)	25,6	1 500
18	ул. Фабричная, 26, помещение на 1 этаже, требуется ремонт, имеется естественное освещение, отопление, санузел совместного пользования, вход в помещение через подвал (под непроизводственное – офис)	19,35	320
19	ул. Физкультурная, 26а, помещения на 2 этаже (17,22 кв.м, 25,34 кв.м, 27,05 кв.м, 16,0 кв.м), имеется естественное освещение, отопление, энергоснабжение, вход с другими арендаторами, требуется косметический ремонт (под непроизводственное – офис)	85,61	1 410
20	ул. Якубова, 66, корп. 2, помещение на 1 этаже, имеется естественное освещение, отопление, водоснабжение, канализация, энергоснабжение, санузел совместного пользования с другими арендаторами (под непроизводственное – офис)	85,5	1 410
	КУП «ЖРЭО Московского района г. Минска» тел. 252-80-63, 207-10-89		
21	ул. Куприянова, 15, нежилое помещение на 1 этаже жилого дома (под склад промышленной группы товаров, кроме товаров бытовой химии и парфюмерно-косметических товаров)	403,96	6 670
22	ул. Короля, 4, часть нежилого помещения на 1 этаже жилого дома (под непроизводственное – офис)	14,24	240
23	ул. Короля, 4, часть нежилого помещения на 1 этаже жилого дома (под непроизводственное – офис)	16,42	270
24	ул. Куприянова, 1, часть нежилого помещения в цоколе жилого дома (под мастерскую по ремонту бытовой техники)	29,93	490
25	ул. Московская, 12, часть нежилого помещения в подвале жилого дома (под кафе, бар)	82,35	10 000
	КУП «ЖРЭО Партизанского района» тел. 294-01-11		
26	ул. Ванеева, 24, подвальное помещение (под склад при условии выполнения требований МЧС)	113,3	1 870
27	ул. Грицевца, 1, помещение на 1 этаже (под непроизводственное – офис, при условии выполнения требований МЧС)	106,43	1 760
28	ул. Долгобродская, 6, корп. 1, подвальные помещения (35,4 кв.м, 73,95 кв.м, 34,35 кв.м) (под склад, при условии выполнения требований МЧС)	143,7	420
29	ул. Долгобродская, 10/2, подвальное помещение, общий вход с пунктом охраны правопорядка (под непроизводственное — офис, при условии выполнения требований МЧС)	43,24	710
30	ул. Долгобродская, 30, подвальное помещение (целевое назначение в соответствии с требованиями МЧС и ЦГиЭ)	9,68	160
31	ул. О. Кошевого, 14, подвальное помещение (под склад, при условии выполнения требований МЧС)	203,06	3 350
32	пер. Козлова, 6, 1 этаж, подвал (под магазин по продаже плодово-овощной продукции, при условии выполнения требований МЧС)	311,19	15 000
33	ул. Козлова, 8/1, подвальное помещение (целевое назначение в соответствии с требованиями МЧС и ЦГиЭ)	67,8	1 120
34	ул. Козлова, 8/1, подвальное помещение (целевое назначение в соответствии с требованиями МЧС и ЦГиЭ)	40,37	670
35	ул. Козлова, 8/1, убежище (целевое назначение в соответствии с требованиями МЧС и ЦГиЭ)	120,01	1 980
36	ул. Козлова, 14, подвальное помещение (целевое назначение в соответствии с требованиями МЧС, ЦГиЭ)	121,7	2 010
37	ул. Первомайская, 18 (под склад, при условии выполнения требований МЧС)	37,58	620
38	ул. Первомайская, 24/1, помещение на 1 этаже (под непроизводственное – офис, при условии выполнения требований МЧС)	15,0	250
39	ул. Солтыса, 189, место в вестибюле 1 этажа (под пункт подключения сотовой связи при условии выполнения требований МЧС)	16,0	260
40	ул. Солтыса, 189, подвальное помещение (под производство, при условии выполнения требований МЧС)	161,23	2 660
41	ул. Холмогорская, 51, в помещении временно хранится арестованное имущество, договор аренды может быть заключен только с даты фактического освобождения от арестованного имущества (под аптеку со складскими помещениями при условии выполнения требований МЧС)	307,6	5 080
	КУП «ЖРЭО Первомайского района» тел. 285-72-92		
42	ул. Волгоградская, 5, 1 этаж, подвал, требуется выполнение условий МЧС – запасной выход (под магазин непродовольственной группы товаров)	366,8	30 000
	КУП «ЖРЭО Советского района» тел. 293-74-31		
43	Логойский тракт, 1, корп.1, помещение на 1 этаже (под непроизводственное – офис, смешанное (за исключением производства, торговли, оказания услуг)	137,8	5 000
	КУП «ЖРЭО № 1 Фрунзенского района г. Минска» тел. 204-30-46		
44	ул. Бурдейного, 19, комната в цокольном этаже жилого дома, со всеми удобствами, общий вход и совместный тамбур с жильцами (под непроизводственное – офис)	15,7	260
45	ул. Берута, 14, 1 этаж жилого дома, две комнаты с удобствами, в одной из которых щитовая, общий вход с жильцами (под непроизводственное – офис)	33,8	560
	КУП «ЖРЭО № 2 Фрунзенского района г. Минска» тел. 253-03-26		
46	ул. Матусевича, 19, две комнаты в подвале жилого дома, общий вход с бытовым помещением производственного участка ЖРЭО (под непроизводственное – офис)	27,45	450
	КУП «ЖРЭО Центрального района г. Минска» тел. 203-79-43, 203-34-46		
47	пр. Независимости, 37, подвал (под непроизводственное – офис)	16,6	280
	КУП «Минская спадчина» тел. 226-53-04		
48	ул. Богдановича, 9а, мансарда (под непроизводственное – офис)	92,0	1 520
49	ул. Коммунальная набережная, 6, помещение на 2 этаже (под непроизводственное – офис 109,67 кв.м и производственное 20,6 кв. м)	130,27	2 150
50	ул. Сторожевская, 5, актовый зал на 3 этаже, перед аукционом обязательное согласование с балансодержателем (под производственное, для размещения студий, театров, танцевальных, литературно-художественных коллективов, непроизводственное – офис)	136,95	2 260
51	ул. Сторожевская, 5, цокольный этаж, перед аукционом обязательное согласование с балансодержателем (под смешанное использование, склад)	30,0	500
	КУП «Минсктранс» тел. 219-86-78		
52	ул. Филимонова, 63, 2 этаж, место в зале ожидания под торговый объект по продаже печатной продукции	7,5	1 400
53	ул. Филимонова, 63, место на перроне под торговый объект по продаже печатной продукции	5,0	960
	КУП «Минсктранс», филиал «Автобусный парк № 1 тел. 223-26-01		
54	ул. Прушинских, 23, помещение на 2 этаже диспетчерской станции, имеется отопление и освещение (под непроизводственное – офис)	12,3	200
	Управление образования администрации Заводского района тел. 296-28-19		
55	ул. Ангарская, 38, школа-интернат № 5, отдельно стоящее помещение с тепловым узлом (под производство мебели)	89,9	1 500
	Комитет по здравоохранению, УЗ «2-я городская клиническая больница» тел. 256-03-66		
56	ул. Богдановича, 2, площадь на 4 этаже главного корпуса (под объект общественного питания, в том числе горячего питания для сотрудников учреждения, исключая из ассортимента алкогольные и табачные изделия)	28,27	2 800
	Главное управление потребительского рынка Мингорисполкома тел. 220-51-34, 219-00-78		
57	ул. Логойский тракт, 34, помещение под объект общественного питания	665,9	11 000
58	ОТЦ «Столица», площадь Независимости, помещение № 312 (под объект общественного питания)	1 097,85	18 120
59	Торговый центр «Партизанский», подземный переход перед универмагом «Беларусь», помещение № 11 (под розничную торговлю непродовольственными товарами)	22,5	2 000
60	Торговый центр «Партизанский», подземный переход перед универмагом «Беларусь», помещение № 17 (под розничную торговлю непродовольственными товарами)	25,5	2 000
61	ул. Уральская, 16а, отдельно стоящее здание (под пункт приема стеклотары)	212,0	3 500
	УП «Минский оптовый рынок» тел. 279-40-79, 279-41-79		
62	Минский район, д. Таборы, помещение фруктохранилища, (под производственные цели)	10,4	170
	Охранно-эксплуатационное коммунальное унитарное предприятие «Гаражи, автостоянки и парковки» тел. 252-06-14		
63	ОТЦ «Столица», площадь Независимости, торговый объект № 52 (под торговлю непродовольственными товарами)	45,6	4 500
64	ОТЦ «Столица», площадь Независимости, торговый объект № 66 (под торговлю непродовольственными товарами)	94,5	9 000
	УП «Чайка» тел. 282-12-52, 281-38-08		
65	ул. Пожарского, 27, часть 1 этажа в здании прачечной (под производственные и непроизводственные цели)	285,59	4 710
	УП «Отдых» тел. 255-20-00, 255-11-07		
66	ул. Сухаревская, 26, 2 помещения на 1 этаже (45,0 и 13,65 кв.м) (под непроизводственное – офис)	58,65	970
	КУП «БытЭкс» тел. 203-79-66, 306-43-92		
67	ул. Московская, 20, три помещения без естественного освещения: одно помещение в цокольном этаже – 9,8 кв.м, два смежных помещения на втором этаже (под объект общественного питания)	24,8	2 500
68	ул. Кульман, 5, помещение на 5 этаже (под производственное, непроизводственное использование, услуги образования)	349,2	5 760
69	пер. Северный, 17, на 2 этаже четыре помещения: три смежных, в т.ч. одно без естественного освещения; отдельное помещение без естественного освещения (под непроизводственное – офис)	31,3	520
	ГПО «Коммунальное хозяйство Мингорисполкома» КУПП «Минскводоканал» тел. 294-81-21		
70	Минский район, Ждановичский с/с, отдельно стоящее одноэтажное здание на территории дренажной насосной станции «Юность-южная», огороженной ж/б плитами, стены кирпичные, крыша мягкая рулонная (под производственные цели – организация тренировочной базы спортсменов)	71,0	1 170
	ЖЭФ ОАО «Минскремстрой» тел. 293-05-19, 293-08-31		
71	ул. Андреевская, 4, кабинет № 15 в цокольном этаже общежития № 4 (под непроизводственное – офис)	27,14	450
	КУП «Минская овощная фабрика» тел. 344-36-82		
72	Минский район, п/о Тростенец, здание ангара, без телефона, воды и электроэнергии, требуется ремонт (под производственные цели)	672,0	11 090
72	Минский район, п/о Тростенец, две комнаты в административном здании без телефона и отопления (под непроизводственное – офис)	21,45	360
73	Минский район, восточная окраина д. Б. Тростенец, открытая площадка (для производственного использования, стоянки автомобилей)	5 100	85 000
	Не завершенные строительством помещения в составе бизнес-центра (2-я очередь строительства) в «Центре коммерческих связей с гостиничным комплексом» после передачи объекта в хозяйственное ведение КУП «Бизнес-центр «Столица»		
74	пр. Победителей, 59, 9-й этаж (помещения для размещения казино)**	1 690,37	27 900

**В отдельных случаях договор аренды может быть заключен на срок 11 месяцев. При этом Мингорисполком гарантирует победителю аукциона продление заключенного договора аренды в течение пяти лет.*

***Договор аренды с победителем аукциона заключается в установленном порядке после передачи объекта в хозяйственное ведение КУП «Бизнес-центр «Столица».*

Организатор аукциона (продавец) – КУП «Минский городской центр недвижимости», г. Минск, ул. К. Маркса, 39.

Участник аукциона до начала его проведения должен выяснить у балансодержателя возможность использования помещения под планируемые виды деятельности, в том числе с учетом требований по санитарным и противопожарным нормам.

Для участия в аукционе участник перечисляет задаток в размере 10 процентов от начальной цены лота и плату за участие в аукционе в размере 4 базовых величин на расчетный счет 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, код 153001331, УНП 190398583, УП «Минский городской центр недвижимости». Перечень и порядок подачи документов определены условиями проведения аукциона, которые **предоставляет участникам торгов организатор аукциона** после публикации извещения в газете «Звязда».

Условия и сроки оплаты: разовый платеж в течение срока, указанного в протоколе о результатах аукциона. Договор аренды с победителем аукциона заключается в установленном порядке в 30-дневный срок с даты принятия решения Мингорисполкома.

Аукцион состоится 27 июня 2008 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Документы на участие принимаются по 26 июня 2008 года до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. Документы, поданные после указанного времени, не рассматриваются. Телефоны для справок (017) 227-40-22, 227-48-36. Интернет: www.mgcn.by.

Целевое назначение помещений определяется в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 30 сентября 2002 г. № 495 «О совершенствовании порядка определения размеров арендной платы и передачи в безвозмездное пользование общественных, административных и переоборудованных производственных зданий, сооружений и помещений, находящихся в государственной собственности» и предусматривает:

- *«непроизводственное целевое использование»* — использование помещений для размещения руководителей, органов управления и контроля юридических лиц и их структурных подразделений, а также специалистов по снабжению и сбыту, финансово-экономических служб, бухгалтерий;
- *«смешанное целевое использование»* — использование помещения одновременно в производственных и непроизводственных целях;
- *«производственное целевое использование»* — использование помещения непосредственно для выпуска продукции, выполнения работ и оказания услуг с размещением на арендуемых площадях рабочих и специалистов, а также для складирования продукции, товаров. К помещениям производственного целевого использования относятся также помещения актовых, спортивных, выставочных залов, подсобные помещения, предназначенные для обслуживания деятельности юридических лиц и индивидуальных предпринимателей (кладовые, раздевалки, умывальники, комнаты для приема пищи), др.

Порядок определения размеров арендной платы при сдаче в аренду зданий, сооружений и помещений, находящихся в государственной собственности, установлен Указами Президента Республики Беларусь от 30 сентября 2002 г. № 495 «О совершенствовании порядка определения размеров арендной платы и передачи в безвозмездное пользование общественных, административных и переоборудованных производственных зданий, сооружений и помещений, находящихся в государственной собственности» и от 4 августа 2006 г. № 498 «О некоторых вопросах аренды государственного имущества».

Арендуемая площадь — площадь, сдаваемая в аренду, размер которой определяется умножением нормируемой площади на коэффициент перевода.

УНП 190398583

САБАКА — ДОКТАР ЧАЛАВЕКА

Догатэрапію ў Беларусі распачалі выратавальнікі

Разумны, кемлівы, адказны, дысцыплінаваны, камунікабельны, прыязны, цярплівы... Нібы вытрымкі з рэзюмэ, ці не так? А гэта ў пэўнай ступені і можна назваць рэзюмэ. Праўда, сабачым. Менавіта такія якасці ўласцівыя ўсім сабакам-выратавальнікам, а ў асаблівасці тым, што па сумяшчальніцтве займаюцца і лячэннем хворых дзетак.

Мы пісалі раней пра лячэнне коньмі (іпатэрапію), а сёння раскажам пра догатэрапію, дзе дактары — сабакі. У Беларусі гэты накірунак распачалі выратавальнікі. ***Начальнік кіналагічнай службы Рэспубліканскага атрада спецыяльнага прызначэння МНС Ігар КРАКОЎСКІ*** цікавую ідэю гады тры таму «прывёз» з Польшчы, куды ездзіў на семінар. Там спецыяльна навучаныя і падрыхтаваныя сабакі-выратавальнікі «даглядалі» састарэлых. У нас жа наладзілі сувязі з Рэспубліканскім рэабілітацыйным цэнтрам для дзяцей-інвалідаў, дзе малыя праходзяць рэабілітацыю па тры месяцы на год. На выратаванне малых — фізічнае і псіхалагічнае — чатырохногіх спецыялістаў сталі вывозіць двойчы на тыдзень. І дзеці з парушэннямі маўлення, апорна-рухальнага апарата — дзеці, пра якіх прынята гаварыць «з абмежаванымі магчымасцямі», атрымлівалі разам з фізічнай трэніроўкай неабмежаваную колькасць пазітыўных эмоцый.

— Догатэрапія (або лячэбная кіналогія) — гэта не толькі фізічная рэабілітацыя, але і псіхалагічная, — лічыць Ігар Кракоўскі. — Хворыя дзеці, пагуляўшы з сабакамі, становяцца больш разняволенымі, смялейшымі. У іх з'яўляецца шчыры і непадробны інтарэс да жыцця.

Пры гэтым магчымасці для фізічнай трэніроўкі тут таксама досыць шырокія. Кіналагі тлумачаць гэта тым, што сабакі — адданыя і ласкавыя, да таго ж у параўнанні з іншымі жывёламі яны лягчэй паддаюцца дрэсіроўцы. Для кожнага маленькага пацыента ў стасунках з чатырохногім доктарам зноў-дзецца нешта сваё — адмысловае і патрэбнае менавіта яму. Дзетак з павышаным тонусам мышцаў рукі просяць пагладзіць сабаку і апрануць яму ашыйнік. Малыя, якім цяжка хадзіць, — водзяць махнатых таварышаў на павадку. І падтрымку адчуваюць, і ўласную ад-

Лячэбная кіналогія паспяхова практыкуецца ў Беларусі ўжо тры гады.

казнасць і важнасць адначасова. Тых, хто дрэнна размаўляе, вучаць аддаваць каманды. Кінолагі часам нават пускаюцца на хітрыкі — гэткая хлусня дзеля выратавання. Развучваюць з дзіцем, скажам, каманду «сядзець». Малы стараецца, ажно пыхціць, і як толькі атрымліваюцца гукі, якія нават аддалена нагадваюць патрэбныя, кіналог непрыкметна падае каманду свайму выхаванцу — і сабака садзіцца. Уяві-це, колькі радасці ў дзіцяці і які стымул для трэніровак!

Пакуль не ўбачыла саміх догатэрапеўтаў, мяне больш за ўсё хвалявала пытанне «Ці не небяспечна гэта для дзяцей: а што калі супраць поўсці пагладзяць ці за вуха сабаку пацягнуць — раптам той укусіць крыўдзіцеля?». Як высветлілася, такія ж асцярогі ў саміх малых пацыентаў і іх бацькоў.

— Многія дзеці спачатку і падыходзіць да сабак баяцца, не тое што дакранацца. Назіраюць здалеку. І толькі паглядзеўшы на астатніх дзяцей, якія гарэзуюць з сабачкамі, пакрысе адважваюцца асцярожна пагладзіць. Затое потым іх ад сабак не адцягнуць! Дзеці ў гульні не стрымліваюцца — сапраўды, і цягаюць, і тузаюць сабак за вушы, за лапы, за хвасты. А тыя нават не рыкаюць у адказ. Пра тое, каб кусацца, і размовы быць не можа. Я ў сваім сабаку ўпэўнены больш, чым на 100 працэнтаў, — заверыў Ігар Кракоўскі. — Калі б не быў упэўнены, нават і не пачынаў бы гэтай справы. Пёс-выратавальнік прывучаны ўспрымаць чалавека як сябра, а не ворага. Гэта ж не тое, што байцы ў пагранічных атрадах, дзе задача — знайсці злачынцу і абясшкодзіць. Сябар для іх толькі кіналог, астатнія — ворагі. Нашыя ж сабакі сацыяльна адаптаваныя, і нязвычны да чалавека першы раз у жыцці, а лашчыцца будуць так, нібы ўсё жыццё сябравалі.

Пасля знаёмства з Агатай — выхаванкай Ігара Кракоўскага — усе пытанні адпалі. Яна — сама ласка: так і туліцца да новага знаёмага, хвост увесь час верціцца туды-сюды, вочы гараць, так і імкнецца лізнуць языком. А якая яна выхаваная, як імгненна падпарадкуецца камандам кіналага! Здаецца, ён яшчэ і не дагаварыў, а Агата ўжо выконвае. І адносіны ў іх па-чалавечы цёплыя і прыязныя. Сабак у кіналога не можа быць многа, упэўнены Ігар Кракоўскі. Як самая сапраўдная раўнівая жонка, напарніца выратавальніка не церпіць саперніц. Таму кожны кіналог выхоўвае сабе толькі аднаго сабаку — вернага баявога таварыша. Выхаванка Ігара Кракоўскага — лабрадор Агата — яшчэ маладая (ёй тры гады), але ўжо вопытная выратавальніца. Яна дэсантавалася з вертталёта разам з гаспадаром, брала ўдзел не толькі ў змадэляваных на вучэннях сітуацыях, але і ў рэальных пошуках пацярпелых — як напрыклад, на нядаўнім трагічным здарэнні ў Слуцку, дзе абваліўся катэдж. Яна ж была адной з першых сабак у краіне, што сталі лячыць дзетак. Цяпер кампанію пяці чорных лабрадораў-догатэрапеўтаў папоўніла і шчаня ньюфаўндленда (вадалаза па-простаму). Ён яшчэ малы, аднак задачы ў яго вельмі важныя — ньюфы рыхтуюць да выратавальных аперацый на вадзе.

— Стасункі дзяцей і сабак падчас заняткаў догатэрапіяй — гэта гульня і для тых, і для другіх, — кажа Ігар Кракоўскі. — А вось вынікі — самыя сур'ёзныя. Медыкі адзначаюць станоўчую дынаміку ў стане здароўя дзяцей, а нашы гадаванцы — прызвычайваюцца да малых. Галоўнае прызначэнне сабакаў-выратавальнікаў — адшукваць пацярпелых у завалах. І навыкі ўсталявання кантактаў з самымі рознымі людзьмі для гэтага вельмі карысныя. Мы прывучаем сваіх сабак нават да алкаголікаў і бамжоў. Падыходзім да такога чалавека і просім пагладзіць сабаку. Бывае, сам стаіш і нос затыкаеш, а Агата хоць бы што — лашчыцца! Затое цяпер, калі такі чалавек будзе, крый Божа, ляжаць пад завалам, гэткі пах не будзе для сабакі нязвыклым і ён не пройдзе міма.

Заняткі з сабакамі, паводле назіранняў Ігара Кракоўскага, найбольш цікавяць самых малых дзетак. Іх адносіны да «махнатых дактароў» асабліва трапяткое. Яны з такім задавальненнем кідаюць сабаку мяч, водзяць на павадку, даюць каманды. У кожнага ёсць свае «любімчыкі». Яны ўжо праз некалькі заняткаў могуць адрозніць лабрадораў і, калі раптам, «іх» сабак не аказалася, пачынаюць дапытвацца, калі прывязуць Агату ці Аргуса, Гарду ці Гінэсу. Нездарма ў працоўным кабінеце Ігара Уладзіміравіча столькі падзелак, малюнкаў і аплікацый з выявамі сабачак. Гэтыя падарункі, зробленыя рукамі маленькіх пацыентаў, — самая шчырая ўдзячнасць. Ды і выратавальнікі не проста два разы на тыдзень па гадзіне займаюцца з хворымі дзеткамі — яны ўкладваюць душу ў гэту справу. Такую патрэбную і высакародную. Як могуць апякуюць дзетак і радуюць.

— Падарылі вось цэнтру стэрэаўстаноўку, у якой і колеры зменяюцца, і дым яна пускае. Цяпер яны там сапраўдныя дыскатэкі ладзяць — во забава для малых! — шчыра радуецца Ігар Кракоўскі.

Карысць жа ад заняткаў догатэрапіяй відавочная. Кінолаг не без гонару прыгадвае моманты, калі сабакі літаральна рабілі цуды:

— Памятаю, у дактароў літаральна акругліліся вочы, калі хлопчык, у якога раней не расціскалася рука, раптам пачаў гладзіць сабаку адкрытай далонню. Мы, кажуць, і ўколы робім, і масаж, і электрапрацэдуры, а тут толькі сабаку пагладзіў — і такі вынік! Дзеці, якія амаль не гутарылі, пачыналі балбатаць з сабакамі без перапынку — вядома ж, невыразна, але ўсё ж маўленчая трэніроўка. Было і такое, што хлопчыкі і дзяўчынкі, якія рухаліся выключна на мыліцах, пачынялі гуляць з сабакамі ў даганялкі!

Цалкам пазітыўныя ўражанні ад убачаных сеансаў догатэрапіі і ў супрацоўнікаў Рэспубліканскага рэабілітацыйнага цэнтра для дзяцей-інвалідаў. Расказвае сацыяльны педагог цэнтра Лілія Булат:

— У нашым цэнтры праходзяць лячэнне дзеці з усёй рэспублікі з захворваннямі апорна-рухальнага апарата. Пры іх рэабілітацыі выкарыстоўваецца і кінолагатэрапія. Першыя заняткі былі масавымі, цяпер нашы спецыялісты фарміруюць невялікія групы — па пяць-шэсць дзяцей. І для кожнага свой набор практыкаванняў у залежнасці ад захворванняў. Тыя дзеткі, якім трэба лячыць ногі, часцей водзяць сабаку на павадку, пераадольваюць разам з ёй перашкоды. Тым, у каго хворыя ручкі, прапануюць кідаць мячык сабаку, зашпільваць ашыйнік. Ім варта займацца з ньюфаўндлендамі — густая і жорсткая поўсць прыдатная для развіцця маторыкі. Вельмі карысная гульня ў юных ветэрынараў, калі малыя бінтуюць сабакам лапы. Гэта і маторыку дзіцячых рук развівае, і чыста псіхалагічна дапамагае: дзеці адчуваюць сябе патрэбнымі, здольнымі паклапаціцца пра катоў. Для сабакі яны на многае адважваюцца. Тыя, хто раней не хадзіў без рукі дарослага, абапіраюцца на сабаку і спакойна ідуць. Для дзетак, якія не падымаюць галавы, кіналагі прыдумалі такое практыкаванне: яны садзяць сабе на плечы сабаку, а дзіцяці ж хочацца паглядзець — вось і стараецца падняць галаву, каб толькі ўбачыць сабаку. Тыя, хто раней баяўся сабак, цяпер весела з імі гуляюць. Пераадоленне ўласных жахаў таксама вельмі важнае для дзяцей. У рэшце рэшт заняткі з сабакам — гэта выдатная эмацыянальная разгрузка. Праз сабаку такім дзеткам лягчэй кантактаваць і з іншымі людзьмі — яны становяцца больш камунікабельнымі. Бацькі бачаць усё гэта і многія з іх заводзяць сабак дома. Пазітыўны эфект ад лячэння варта падтрымліваць — займацца рэгулярна. Мы вельмі ўдзячныя нашым кіналагам за добрую справу, якую яны робяць, дарэчы, абсалютна бясплатна.

А самае галоўнае, што сёння ў беларускіх кіналагаў-выратавальнікаў дзеткам больш не паслядоўнікаў. Напрыклад, спецыялісты фізкультурна-аздараўляльнага цэнтра Першамайскага раёна сталіцы. Іх навучаныя сабакі таксама дапамагаюць дзеткам. Ёсць планы і стварыць спецыялізаваны цэнтр лячэбнай кіналогіі ў Беларусі (такі, дарэчы, ёсць у суседняй Расіі). Цэнтр, дзе лячыць людзей будуць сабакі. Гэткія шчырыя і бескарыслівыя дактары чалавека.

Ала МАЧАЛАВА.
Фота з асабістага архіва Ігара КРАКОЎСКАГА.

Ці будзе «Домік у Лёзне»?

Ідэя пабудаваць у Віцебску на вуліцы Пакроўскай, дзе жыў Шагал, дом, які ён намаляваў, пакуль застаецца толькі на паперах. Шкада.

Нагадаю, «Звязда» паведамляла пра тое, што адна з фірмаў плануе стварыць на знакамітай Пакроўскай вуліцы турыстычна-гасцінічны комплекс. Фасад будынка вырашылі ўзяць з шагалаўскага малюнка «Дом у Лёзне». Але камерсантаў спужала высокая цана на зямлю.

Як паведаміла дырэктар музея Людмілы Хмяльніцкая, актыўна шукаюць спонсараў для рэалізацыі гэтай цікавай ідэі. Расказвалі пра яе прадстаўнікам розных краін, у тым ліку і мэру аднаго з ізраільскіх гарадоў. Упэўнены, што пытанне будзе вырашана станоўча.

Затое, у самым цэнтры горада ўжо закладна адновяць будынак гатэля «Брозі», дзе жыла сям'я жонкі Шагала. І, безумоўна, будынак упрыгожыць гістарычны цэнтр горада.

Віцебск у гэтыя дні зноў успамінае свайго славутага земляка — Марка Шагала. З 15 па 17 чэрвеня пройдуць Міжнародныя Шагалаўскія чытанні, на якія запрасілі гасцей з Расіі, Ізраіля, Латвіі, Літвы, Польшчы.

Цікава, што ў чытаннях, ужо 18-х па ліку, возьмуць удзел не толькі вядомыя мастацтвазнаўцы, навуковыя супрацоўнікі, але і студэнты. Апошнія перамаглі ў спецыяльным конкурсе навуковых работ. У рамках чытанняў 15 чэрвеня ў абласной філармоніі пройдзе канцэрт — фартэпіянны вечар з удзелам лаўрэата міжнародных конкурсаў Таццяны Брыжаневай. Прагучаць творы Шастаковіча, Рахманінава...

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Дзве даты

14 чэрвеня

Сёння — Сусветны дзень донара. Установлены ў дзень нараджэння Карла Ландштайнера, аўстрыйскага вучонага, лаўрэата Нобелеўскай прэміі, які адкрыў групы крыві чалавека (1900).

1941 год — ТАСС аб'явіў правакацыяй чуткі аб падрыхтоўцы Германіі да вайны супраць СССР. Наркам замежных спраў В. Молатаў заявіў, што «толькі ідыёт мог бы зараз думаць аб нападзе на Савецкі Саюз».

1905 год — пачалося паўстанне на рускім браняносцы «Князь Пацёмкін Таўрычаскі». Нагодай для яго стала адмова каманды есці абед, прыгатаваны з гнілога мяса. Паўстанцы арыштавалі афіцэраў, завалодалі караблём і ўзнялі чырвоны сцяг. Царскі ўрад аддаў загад — прымусіць «Пацёмкін» здацца ці патапіць яго. На падаўленне паўстання да Адэсы былі накіраваны 5 браняносцаў, крэйсер, 7 мінаносцаў. «Пацёмкін» выйшаў насустрач і, адхіліўшы прапанову аб здачы, прайшоў скрозь строй караблёў. Матросы эскадры адмовіліся страляць па мяцежным караблі, а эскадраны браняносец «Георгій Перамаганосец», узняўшы чырвоны сцяг, перайшоў на яго бок. 25 чэрвеня «Пацёмкін» быў інтэрніраваны румынскімі ўладамі, члены экіпажа аб'явілі сябе палітычнымі эмігрантамі, частка з іх вярнулася ў Расію, дзе была арыштавана і аддадзена пад суд, большасць жа вярнулася на радзіму пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 года. Паўстанне пацёмкінцаў стала пачаткам масавых рэвалюцыйных выступленняў у арміі і на флоце.

Цытата дня

«Кахання жанчыны трэба баяцца больш, чым нянавісці мужчыны. Гэта — атрута, тым больш небяспечная, таму што прыемная».

Сакрат (470—399 да н.э.), старажытнагрэчаскі філосаф.

Усміхнёмся

Кнопка экстранага катапультавання з перапоўненага аўтобуса знаходзіцца на бюстгальтары ў кандуктаркі.

☺

— Слухайце, перастаньце называць мяне «дырэктар», «начальнік», «бос», «шэф»... Для чаго такая ўгодлівасць? Не люблю я гэтага!

— А як інакш, бо..? Вой, не — шэ... Я хацеў сказаць...

— Як? Ну, я не ведаю... Прасцей як-небудзь. Ну, напрыклад, «кармілец».

☺

Прыспешваць жанчыну — тое ж самае, што спрабаваць паскорыць загрузку камп'ютара. Праграма ўсё роўна павінна выканаць усе відавочна неабходныя дзеянні і яшчэ шматлікія тыя, якія заўсёды застаюцца па-за вашым разуменнем.

☺

— А я ўжо з адчыненым акном сплю !

— У вашым узросце, малады чалавек, час бы ўжо спаць з жанчынамі.

☺

У мяне гора — мой персідскі кот на маім персідскім дыване зрабіў «персідскі заліў».

Усходні гараскоп на наступны тыдзень

ШАЛЯМ СПАДАРОЖНІЧАЕ ПОСПЕХ, ДЫ І Ў СТРАЛЬЦОЎ СВЕТЛАЯ ПАЛАСА Ў ЖЫЦЦІ

ВАВЕН. Не выключана, што вам ша актыўнасць будзе абмежавана аб'ектыўнымі прычынамі. Не плывіце супраць цячэння, заставайцеся часова на другіх ролях — менавіта такая тактыка прывядзе да найлепшага выніку. У суботу будзьце больш асцярожныя, бо магчыма паступленне наўмысна скажонай інфармацыі.

ЦЯЛЕЦ. Вам проста неабходна захоўваць дакладную пасля-доўнасць у дзеяннях. У пачатку тыдня праявіце інтарэс да новых прапаноў, тады яны пачнуць паступаць у нарастальным тэмпе. Усё вакол вас будзе несці карысную і вельмі патрэбную інфармацыю.

БЛІЗНЯТЫ. З'явіцца магчымасць з поспехам вырашыць пытанні, якія звязаны з вучобай і пошукам інфармацыі, якой не хапае, праз калег і блізкіх сяброў. Не звяртайце ўвагі на падколкі «добразычліўцаў» — у вас усё атрымаецца: праўда, гэта датычыцца толькі бягучых спраў. У панядзелак, адчуўшы смак да навізны, вы вырашыце для сябе штосьці важнае. Аднак не спяшайцеся аб'яўляць пра гэта.

РАК. Больш разважнасці і рашучасці — і ў вас з'явяцца добрыя магчымасці для змянення і паляпшэння сваіх асабістых якасцяў. Выкарыстоўвайце традыцыйны падыход. Жыццё віруе, хоць многія планы давядзецца перагледзець. Пастарайцеся не кідаць слоў на вецер, падмацоўвайце іх справамі, інакш рызыкуеце падарваць свой аўтарытэт. У панядзелак лепш не адстойваць свае планы і задумы перад начальствам. У чацвер не лезьце на ражон — лепш прыміце прапановы тых, хто над вамі, і не ўскладняйце сабе жыццё.

ЛЕЎ. У панядзелак неабходна быць больш уважлівымі і асцяражнымі, сачыце за словамі. Можа ўзнікнуць сітуацыя, калі неабходна хутка авалодаць новымі прафесійнымі навыкамі — калі ёсць падазрэнні, што гэта могуць быць за веды, лепш прыступаць да іх атрымання загадзя. Тыдзень спрыяльны для вынаходніцкай дзейнасці, магчыма з'яўленне новых ідэй.

ДЗЕВА. Настае час падвядзення вынікаў і пераацэнкі каштоўнасцяў. Паверце ў свае сілы: зараз спрыяльны момант для рэалізацыі задумаў. Сумненні, якія вы адчуваеце, могуць абцяжарваць, але вы з усім справіцеся і адчуеце жаданую палёгку. Залежнасць ад начальства будзе засмучаць, але яе кампенсуюць грашовыя паступленні.

ШАЛІ. Поспех будзе спадарожнічаць вам. Удзяліце больш часу сабе. Цяпер можна дазволіць многае — раптоўнае змяненне іміджу ці патаканне асабістым капрызам. Магчыма прасоўванне па службе, але толькі пры ўмове, што праявіце мудрасць і дыпламатычнасць. У аўторак лепш не трапляць на вочы начальству, а важную размову пажадана запланаваць на чацвер.

СКАРПІЁН. Будзеце выпраменьваць аптымізм на працягу ўсяго тыдня і гэтым прыцягваць навакольных. Звярніце належную ўвагу на кантакты і вядзенне перамоў. У панядзелак ці аўторак верагодныя важныя званкі — пастарайцеся іх не прапусціць. Пажадана адмовіцца ад рызыкоўных ці авантурных прапаноў. З наватарскімі ідэямі лепш пачакаць.

СТРАЛЕЦ. Настае светлая паласа ў вашым жыцці. Адна з галоўных задач тыдня — пачаць рэалізоўваць усе вашы выдатныя здольнасці. Давядзецца мабілізавацца. Сачыце за сваімі ўчынкамі і словамі — яны павінны быць прадуманымі. Прыслухайцеся да інтуіцыі, выберыце ўдалы момант і падыдзіце з ініцыятыўнымі прапановамі да начальства — яно ацэніць гэта належным чынам. Старайцеся кантраляваць эмоцыі і не спрачацца з калегамі, бо станоўчых вынікаў гэта не прынясе.

КАЗЯРОГ. У жыцці настаюць моманты, калі неабходна спыніцца хоць бы ненадоўга і падумаць... Вы толькі што вызваліліся ад цяжару адказнасці — і ўжо спяшаецеся за новай, яшчэ больш цяжкай порцыяй? Усвядомце, што на гэты раз без памочнікаў не абысціся. Пятніца спрыяльная для самааналізу і асэнсавання свайго вопыту.

ВАДАЛЕЙ. Агульная тэндэнцыя тыдня — крок наперад, два крокі назад. У панядзелак лепш строга захоўваць дысцыпліну і праяўляць выключна дзелавыя якасці. Чым больш новага даведаецеся ў сераду, тым больш поспехаў вас чакае ў бліжэйшай будучыні. У пятніцу пастарайцеся не звязваць сябе ніякімі абяцаннямі: верагодна, іх будзе вельмі складана выканаць.

РЫБЫ. Першая справа — праяўляць ініцыятыву і дэманстраваць сваю актыўнасць. Асабліва карыснымі такія паводзіны будуць для кар'ернага росту. Можа з'явіцца магчымасць для падарожжа, якое прыняло новыя знаёмствы — не выключана, што і рамантычныя. Самым складаным днём, як і належыць, будзе панядзелак: вам спатрэбіцца цярпенне і ўпартасць. Лепшы дзень для вырашэння сур'ёзных праблем — пятніца.

Фестывалі

Ёсць весткі ад Бога

У Беларусі могуць паспрачацца з думкай аднаго іспанскага фільма, таму што добрыя весткі да нас прыходзяць і праз кіно таксама. Дзеля гэтага ўжо чацвёрты раз пройдзе Міжнародны каталіцкі фестываль хрысціянскіх фільмаў і тэлепраграм «Magnificat».

З 17 чэрвеня ў Глыбокім збяруцца кінамайстры самых розных краін, якія здымаюць свае фільмы на тэму духоўнага жыцця чалавека. Адкрыццё кінасвята пройдзе ва Ўдзеле, у францішканскай парафіі, якая была заснаваная ў 1727 годзе. Але цяперашні касцёл быў адбудаваны ў 1989 годзе намаганнямі парафіян. Будзе што паглядзець гасцям у вёсках Мосар і Івесь, куды яны спецыяльна паедуць. Але самі конкурсныя прагляды пройдуць у Глыбокім.

«Сучасная супольнасць выхоўваецца на кіно і тэлебачанні. Таму як кіно, так і тэлебачанню неабходна як мага больш прыкладаў хрысціянскага жыцця і сведчання...» — адзначае архібіскуп Тадэвуш Кандрусевіч, Мітрапаліт Мінска-Магілёўскі.

Глыбокія думкі чакаюць зацікаўленых у Глыбокім.

Ларыса ЦІМОШЫК.

вітанні старшыня Глыбоцкага райвыканкама М. Кандзерскі. У праграму адабраныя 34 стужкі з 14 краін свету. Найбольшую колькасць прадставіла Беларусь — 8 фільмаў. Будзе паказана 7 расійскіх карцін, 4 італьянскія, 3 польскія, 2 украінскія. Акрамя таго, прыедуць фільмы з Літвы, Латвіі, ЗША, Францыі, Канады, Харватыі, Швейцарыі. Упершыню ў беларускім фестывалі возьмуць удзел Грузія і Ліван. Трэба адзначыць, што канфесіянальная прыналежнасць ствараліннікаў не была прынцыпам падбору фільмаў у праграму. Яны адрасаваныя тым людзям, якія імкнуцца працаваць над сваёй душой, выхоўваючы яе на лепшых прыкладах чалавечых учынкаў і разважаючы пра тое, як захаваць вобраз Божы, які ёсць у кожным чалавеку. 15 стужак будуць перакладзены на беларускую мову і агучаны — усё-такі ў справах духоўных мае значэнне кожнае слова. Асабліва, калі яно прамоўлена з душой для многіх людзей адначасова.

ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ДАПАМАЖЫ САБЕ САМ

Водпуск — на карысць

Лета — самая спрыяльная пара, каб набрацца сілаў і здароўя, добра адпачыць. Аднак бывае вельмі крыўдна, калі хваробы парушаюць нашы планы на водпуск, не дазваляюць атрымаць асалоду ад цікавых падарожжаў ці проста з задавальненнем пакапацца на градках. Каб нічога не парушыла вашы мары і надзеі, пад рукою трэба мець пару-тройку сродкаў для аднаўлення здароўя. Некаторыя з іх і прапануем успомніць.

ХУТКАЯ ДАПАМОГА...

...пры атручэннях

Як быццам, усе добра ведаюць аб тым, што перад ядой трэба мыць рукі, але чамусьці колькасць летніх атручэнняў і іншых страўнікава-кішачных праблем не памяншаецца. Вось правілы, якія дапамогуць правесці адпачынак без праблем.

● Мыйце рукі не толькі перад ядой і пасля наведвання туалета, але і пасля наведвання любых грамадскіх месцаў, дзе бывае вялікая колькасць людзей, — магазінаў, базараў, грамадскага транспарту і г.д.

● Другое няўхільнае правіла — старанна мыйце садавіну і гародніну. Напрыклад, моркву трэба мыць пры дапамозе спецыяльнай шчоткі, калі яе няма, то пасля абскрабання памытую моркву трэба памыць яшчэ раз. Садавіну мыйце нават калі будзеце знімаць з яе лупіну, бо бактэрыі могуць трапіць з лупіны на мякаць на нажы.

● Асцярожна абыходзьцеся з малочнымі і кісламалочнымі прадуктамі. Калі ёсць падазрэнне, што кефір ці малако пастаялі без халадзільніка, то лепш іх не піць, бо ў малацэ бактэрыі размнажаюцца вельмі хутка.

● Не трымайце на сонцы мінеральную ваду — пластык пачынае выдзяляць шкодныя рэчывы, ды і вада на спякоце хутка псуецца. Дзецям можна даваць піць ваду, калі бутэлька адкрыта не больш чым паўгадзіны таму.

● Калі атручэння пазбегнуць не ўдалося, піце паболей вады з дабаўленнем актываванага вугалю, а таксама пастарайцеся выклікаць ваніты. Пры з'яўленні паносу таксама паболей піце і не спыняйце яго пры дапамозе лекаў у першыя некалькі гадзін пасля атручэння. Далейшае лячэнне — гэта шчодрае піццё, спакой і голад. Калі панос не спыняецца больш чым суткі, абавязкова звярніцеся да ўрача, каб не дапусціць абязводжвання арганізма.

...пры траўмах

Траўмы і іншыя непрыемнасці ў водпуску здараюцца асабліва не да месца, і тут важна ведаць, як аказаць сабе і блізкім першую дапамогу.

● Пры расцяжэнні звязак неабходны поўны спакой і холад на месца пашкоджання. Толькі на 2—3-і дзень вы можаце пачаць праграванне, каб паскорыць кровазварот і паменшыць боль у суставе. Лепшым падручным сродкам пры расцяжэннях з'яўляецца любая гліна — зрабіце аладку з гліны таўшчынёй 1,5—3 см і налажыце на балючае месца, каб захапіць і частку здаровых тканак, накрыйце цэлафанам і шарсцяной тканінай, трымайце каля 2 гадзін. Выкарыстаную гліну закапайце.

● Каб спыніць кроў, прыкладзіце да раны аблітую кіпенем траву крапівы ці крывасмоку. Трыпутнік таксама перад выкарыстаннем трэба апарыць і крыху памяць, каб ён пусціў сок. Яшчэ адзін нядрэнны сродак для спынення вонкавага крывацёку — свежае здробненае лісце вішні.

● Пры апёках як мага хутчэй прыкладзіце хвілін на пяць холад, каб зняць боль, а затым — лісце свежай капусты ці надзёртую моркву (можна бульбу). Мяняйце павязкі праз кожныя 2 гадзіны.

-2507-

САКРЭТЫ ПРЫГАЖОСЦІ

Худзеем без праблем

Звычайна ўсе жанчыны стараюцца пахудзець да пачатку летняга сезона, але, як заўсёды, увесь час нешта перашкаджае. Таму можна паспрабаваць скінуць некалькі лішніх кілаграмаў за час водпуску.

Такім чынам, настаў водпуск і з'явіўся вольны час, а гэта значыць, што пешыя прагулкі, бег, плаванне, веласіпед могуць уступіць у свае правы цалкам, а ўжо пабегаць за некалькі гадзін да сну вам дакладна нічога не памяшае (акрамя ляноты).

Прымаючы ванну, капніце ў ваду 4—5 кропель эфірнага алею грэйпфрута ці апельсіна і паляжыце ў духмянай вадзе, а яна ў гэты час будзе раствараць вашы лішнія кілаграмы. І кожны дзень з'ядайце па грэйпфруту ці апельсіну, бо яны змяшчаюць рэчыва, якое садзейнічае расшчапленню тлушчаў.

Страта вагі будзе адбывацца хутчэй і лягчэй, калі вы будзеце ачышчаць арганізм. Кожную раніцу нашча і за 20—30 хвілін да яды ўдзень выпівайце 1 шклянку гатаванай халоднай вады, у якой растворана 1 ч. лыжка блакітнай гліны, ачышчанай ад пяску.

У такім няпростым пытанні, як пахудзенне, нельга абысціся без пытання харчавання. Лета — час свежых раслінных прадуктаў, халаднікоў, бацвіння. Калі вы ўключыце іх у сваё меню замест наварыстых супоў, то зможаце скінуць некалькі кілаграмаў. Ужо з'явіліся першыя ягады. Ешце паболей і не перажывайце, што большасць з іх змяшчае вялікую колькасць цукру. Гэты цукар прыняло толькі карысць, калі вы не будзеце змешваць ягады з іншымі відамі ежы. Чарніцы лідзіруюць па сваёй здольнасці амалодживаць арганізм, таму што змяшчаюць рэкордную колькасць антыаксідантаў, а маліны і ажыны дапамагаюць нармалізаваць гарманальны фон у жанчын, і ўсё гэта ў спалучэнні дазваляе хутчэй пазбавіцца ад лішняй вагі.

Многія спецыялісты рэкамендуюць заняцца і аэробікай у вадзе — бегаўшы, скачыце, плавайце, размахвайце рукамі і нагамі. Такія практыкаванні паскараюць абменныя працэсы і спальваюць тлушчы, а каб пахудзенне адбывалася максімальна хутка, не ешце за гадзіну да заняткаў і праз гадзіну пасля.

І асобная парада жанчынам — кідайце курыць. У час водпуску, калі стрэсаў мінімум, а прыемных момантаў — максімум, самы час кінуць цыгарэты і падарыць сабе, любімай, сапраўдную маладосць, здароўе і прыгажосць.

ДА ВАШАГА СТАЛА

Варэнікі з чарэшняй

400 г мукі, 1 яйка, 0,5 шк. вады, крыху солі, 1 ч. лыжка алею, 800 г чарэшні, 0,3 шк. цукру, 3 ст. лыжкі крухмалу.

Соус: 200 г смятаны, 200 г чарэшні, 1 шк. цукру, 1 шк. вады.

Выдаліце костачкі з чарэшні, пасыпце цукрам, крухмалам і пакладзіце ў друшляк, каб сцякаў сок. Замясіце цеста з мукі, вады, яйка, алею і солі. Калі яно будзе гатовае, накрыйце гарачай каструляй і дайце цесту пастаяць прыкладна 10 хвілін, яно павінна атрымацца эластычным. Разрэжце на тры часткі, з кожнай зрабіце «каўбаску» таўшчынёй з палец, нарэжце на кавалкі. Кожны кавалачак раскачайце на дошцы, пасыпанай мукой. Пакладзіце па 3—4 чарэшні, зляпіце варэнікі. Адварыце іх у падсоленай вадзе, дастаньце на блюда і паліце соусам. Для соусу ачышчаную чарэшню патаўчыце, дадайце ваду і добра адцісніце праз некалькі слаёў марлі. У сок пакладзіце цукар і пракіпяціце, астудзіце, злучыце са смятанай.

-2508-

ШАХМАТЫ

Пад рэдакцыяй майстра спорту Уладзіміра СЫЧОВА

ПАДУМАЙ І РАШЫ!

В. Разінкін (Мінск)



Мат за 2 хады. (4+3).

Я. Дзвізаў (Жлобін)

Белыя пачынаюць і выйграць. (6+8).

Чакаем вашых адказаў.

ПРАВЕРЦЕ СВАЕ РАШЭННІ

Змяшчаем рашэнні задач і пазіцый з практыкі, апублікаваных у маі гг.

В. Жуковіч і М. Бельчыкаў. 1. Фа2! цугцванг.

М. Быкаў. 1. Ле6! ~~ 2. Фс6х.

В. Разінкін. 1. Ла1! b5 2. Лh1 Крh5 3. Крg3; 1. ... Крh5 2. Крg3 g4 3. Крf4 Крh6 4. Лh1х.

П. Радзюк. 1. Лс1! de 2. К:e3+ Крd4 (e4) 3. Ле4х; 1. ... Крс6 2. Кd6+; 1. ... gf 2. Лh5+; 1. Кb6+? Крс6! 1. Кd6? Крс5!

С. Бегун — А. Вакуленка. 19. К6:g5+! Крg6 20. Фf5+! С:f5 21. gf+ Крh5 22. Кg3+ Крh4 23. Лf4+ і чорныя здаліся.

А. Коўчан — А. Цімафееў. 44. Ке4+! de4 45. fe4 Ле1+ 46. Крf3 Л:e4 47. Л:e4 С:e4 48. Кр:e4 f5+ 49. Крd3 f4 50. Л:с6 і белыя выйгралі.

ПАПЯРЭДНІКІ

У шахматнай кампазіцыі хоць і рэдка, але здараюцца супадзенні знойдзеных пазіцый. Тады кажуць, што яны маюць папярэдніка. Так называюць твор, які па ідэі, схеме і канструкцыі падобны да апублікаванай раней задачы або эцюда. Пры поўным супадзенні пазіцыі апошняя губляе права на існаванне. Пры захаванні ідэі твора, але рознай канструкцыі гавораць аб частковым папярэдніку.

Прывядзём прыклады перайманння вядомай патавай ідэі А. Троіцкага. Белыя: Крg4, Лd5, п. h2 (3). Чорныя: Крf8, Сd2, п. g2 (3). Нічыя.

1. Лf5+ Крe7 2. Ле5+ Крf6 3. Ле1! С:e1 4. Крh3. Эцюд быў апублікаваны ў 1895 годзе ў часопісе «Новы час».

Ф. Амялунг, 1903 г. Белыя: Крe6, Лс1, п. h2 (3). Чорныя: Крe8, Са5, пп. e3, g2 (4). Нічыя.

1. Крf5! e2 2. Крg4 e1Ф 3. Л:e1+ С:e1 4. Крh3.

П. Генекер, 1927 г. Белыя: Крa4, Сf3, Кh3, п. a2 (4). Чорныя: Крd5, Се4, п. b2 (3). Нічыя.

1. Кf2! С:f3 2. Кd1 С:d1 3. Крa3.

У эцюдзе Л. Кубеля, 1908 г., фінальная пазіцыя крыху іншая. Белыя: Крh4, Лс7, Кg7 (3). Чорныя: Крh6, Сf4, пп. g2, g3 (4). Нічыя.

1. Кf5+! Крg6 2. Лg7+ Кр:f5

ААТ «ШКЛОЎСКІ МАСЛАРОБНЫ ЗАВОД»: МАЛОЧНЫЯ РЭКІ, ТВАРОЖНЫЯ БЕРАГІ

Паводле вынікаў 2007 года, ААТ «Шклоўскі масларобны завод» занесена на Рэспубліканскую дошку гонару.

Шклоўскі масларобны завод прапануе людзям натуральную і смачную малочную прадукцыю пад маркай «Избушка молочника». І яе будзе значна болей, калі праз два гады ў райцэнтры пабудуюць новую сучасную вытворчасць, дзе будуць перарабляць 200 тон малака за суткі.

Юбілейны год

Сёлета Шклоўскаму масларобнаму заводу спаўняецца 60 гадоў. Юбілей тут маюць намер адзначыць у жніўні, калі таксама споўніцца 4 гады, як заводам кіруе Аляксандр ЕРАШЭНКА.

Ён узначаліў прадпрыемства, калі яно мела каля мільярда рублёў страт. У завода была велічэзная крэдыторская запазычанасць, не выконваліся прагнозныя паказчыкі, удавалася перарабіць толькі 8 тон малака — гэта у 5 разоў менш, чым цяпер.

Новы кіраўнік сабраў каманду спецыялістаў і паставіў задачы: прыбытковая праца, павелічэнне аб'ёмаў вытворчасці, пашырэнне асартыменту прадукцыі і заваёва сур'ёзных рынкаў збыту.

Для таго, каб прадукцыю Шклоўскага масларобнага завода пакупнікі лёгка пазнавалі на паліцах крамаў, з'явіўся новы арыгінальны брэнд — «Избушка молочника». Сёння гэты брэнд ведаюць не толькі на роднай Шклоўшчыне, але і ў Магілёве, Мінску і нават Смаленску. Тры-чатыры разы на тыдзень у Расію адпраўляецца 7,5 тоны натуральнамалочнай прадукцыі, якая карыстаецца папулярнасцю ў смалян.

Поспехі ў працы кіраўніцтва і працоўнага калектыву Шклоўскага масларобнага завода адзначаны цяпер шматлікімі ўзнагародамі. Трэці год запар прадпрыемства атрымлівае пераможны сцяг Шклоўскага раёна. Дырэктар быў удастоены звання «Чалавек года». Завод прапісаўся на раённай Дошцы гонару, а цяпер трапіў і на рэспубліканскую.

Тут будзе новы завод!

Шклоўскі масларобны завод месіцца ў цэнтры горада, непадалёк ад райвыканкама. Дарэчы, адзін з заводскіх будынкаў — былая сінагога з адпаведнай архітэктурай.

Усе памяшканні завода — чыстыя і акуратныя. Невялікая тэрыторыя ўпрыгожана кветкавымі клумбамі і фантанам. Тут сочаць за парадкам. Аднак пры ўсім гэтым заводу цесна на сваёй цяперашняй невялікай тэрыторыі. Яму трэба развівацца і пашыраць вытворчасць.

— Мы цяпер перарабляем за суткі 40 тон малака, і гэта нават больш за нашы магутнасці, — расказвае галоўны інжынер Аляксандр КАПЫЛОЎ. — У летні сезон вялікага малака ў раёне мы збіраем ужо 160 тон малака, а, паводле планаў, да 2010 года гэтая лічба павялічыцца да 200 тон, а то і болей. Мы аддаём малако на іншыя прадпрыемствы, але пастаўлена задача перарабляць усё тут, у Шклове. Таму цяпер ідзе размова пра глабальную рэканструкцыю і пашырэнне завода.

У райцэнтры будзе пабудавана новае прадпрыемства, якое акрамя натуральнамалочнай прадукцыі будзе вырабляць масла і сухое малако.

— Пашырацца на цяперашняй пляцоўцы складана з-за санітарна-ахоўных нормаў: цэнтр Шклова не вельмі пасуе для вялікага прадпрыемства, — паведаміў дырэктар Аляксандр Ерашэнка. — Таму новую вытворчасць пабудуем на новым месцы — на былой тэрыторыі агракамбіната, якая цяпер пустуе. Кіраўнік дзяржавы даў дабро: пры наведванні Шклова на адкрыцці завода па вырабе газетнай паперы Аляксандр Лукашэнка сказаў, што праз два гады ў раённым цэнтры з'явіцца новае прадпрыемства па перапрацоўцы малака. Нават верагодна, што знойдзецца і расійскі інвестар. Сёння ўжо робіцца праект, і хутка ў нас будзе сучасны, перадавы завод.

Дырэктар Аляксандр ЕРАШЭНКА: «Ключ да поспеху — працаваць лепей за іншых. Усё залежыць ад каманды спецыялістаў і ўвогуле працоўнага калектыву. Трэба добра рабіць сваю справу і ганарыцца тым, што мы – завадчане!»

Жывыя прадукты

Нездарма гавораць, што шклоўскае малако надзвычай добрае і смачнае. Больш за 90 працэнтаў малака, якое паступае на Шклоўскі масларобны завод, — вышэйшага гатунку.

Усе карысці добрай сыравіны імкнецца данесці да людзей «Избушка молочника». Прадукцыя гэтага масларобнага завода мае адметную рысу: яна натуральная, ці як трапна кажуць — жывая.

— Жывыя прадукты не маюць кансервантаў і не прайшлі дадатковую тэрмічную апрацоўку, — тлумачыць Аляксандр Капылоў. — Шклоўскія прадукты — выключна натуральныя і жывыя!

— Нам трэба заваёўваць рынак якаснай прадукцыяй, — тлумачыць падыходы Аляксандр Ерашэнка. — Малако — адзін з асноўных харчовых прадуктаў, які патрабуецца чалавеку штодзень. Самае смачнае малако — у бабулі ў вёсцы, і яно стаіць толькі некалькі сутак. А што гэта за малако, якое захоўваецца некалькі дзесяткаў дзён? Людзям патрэбны натуральны прадукт. Такі, як наш: ён пачысціць арганізм і дасць яму карысныя рэчывы.

І праўда: невялікія тэрміны захоўвання жывой шклоўскай прадукцыі не перашкаджаюць яе паспяховай рэалізацыі. Адносна невялікія аб'ёмы вытворчасці і кампактны калектыў дазваляюць, што называецца, вынасіць на руках кожны пакунак. Так што рэкламны слоган шклоўскіх малочных харчоў «Казка-прадукт» тут вельмі да месца.

Здаровая ежа

Усяго на заводзе ў Шклове вырабляюць 24 найменні прадукцыі. Многія з прадуктаў маюць дыпломы «Прадукт года». Дакументы, якія адзначаюць высокую якасць прадукцыі завода, у вялікай колькасці ўпрыгожваюць сцены прыёмнай і кабінетаў кіраўніцтва.

Сярод іх — і сертыфікат аб адпаведнасці сістэмы менеджменту якасці СТБ ISO 9001-2001.

Сёння папулярнасцю карыстаюцца ёгурт «Крепышок», ражанка, біякефір, пітныя ёгурты. Людзям падабаюцца смачныя шклоўскія тварог і смятана.

Жыхары Магілёва пільнуюць у крамах завоз прадукцыі Шклоўскага масларобнага завода. Апошнім часам гараджане аддаюць перавагу модным дыетычным прадуктам — нізкатлустаму малаку і нятлустаму кефіру.

Але ўсё ж найбольш папулярны цяпер новы прадукт са Шклова: «Окрошка к картошке». Гэтаму кісламалочнаму напою з дадаткам агуркa і кропу аддае перавагу сам дырэктар завода і многія яго калегі:

— Гэта любімы народам прадукт. Ён нібыта вясковы: з бульбай альбо хлебам — тое, што трэба!

— І зноў-такі ўсё натуральнае, — заўважае мікрабіёлаг Наталля Ісаева. — Мне пабадаецца наша прадукцыя тым, што яна робіцца з якаснага малака, без аніякіх Е і хімічных дабавак. Гэта ўсё здаровае харчаванне: я ем яго сама і вам раю пачаставаць!

ААТ «Шклоўскі масларобны завод»
213004, Рэспубліка Беларусь, Магілёўская вобласць, г. Шклоў, вул. Інтэрнацыянальная, 64
e-mail: shklovmaslo@tut.by
тэл. +2239 31332
УНП 700026660

Кіраўнік завода разам з работніцамі хімбаклабараторыі.

Шклоўскія прафесіяналы

Сёння на Шклоўскім масларобным заводзе працуе 180 чалавек. Сярэдні заробак па прадпрыемстве летась склаў каля 700 тысяч рублёў. Нездарма ў кіраўніка завода ёсць цэлая кніжка для запісу тых, хто хоча атрымаць працу: з гэтых ахвотнікаў можна было б набраць поўнасцю новы калектыў!

— У нас ёсць прыбыткі, мы плацім грошы, але, заўважу, што не дарма! — запэўнівае Аляксандр Ерашэнка. — Наш завод пачынае працаваць а 3-й гадзіне. І людзі нашы — прафесіяналы: трэба ўмець рабіць смятану ці тварог, не пазяхаць, тэхналогію не парушаць, укладваць душу — каб усё было смачнае. Так што перад усім наша прадукцыя сваёй добрай рэпутацыяй удзячна добрасумленным працаўнікам завода.

— Я думаю, што рэцэпт поспеху прадпрыемства — насамрэч у калектыве, — пагаджаецца з дырэктарам галоўны бухгалтар Алена Таланкова. — Трэба не толькі хацець выкараскацца, але і павесці за сабой людзей. Каб ва ўсіх было перакананне, што чым сядзець і плакаць над цяжкасцямі, трэба падняцца і працаваць.

Супрацоўніца лабараторыі хімбаканалізу Ала Буевіч працуе на Шклоўскім масларобным заводзе больш за дзесятак гадоў. Яна ведала розныя часіны на прадпрыемстве, а цяпер прызнаецца, што трымаецца за сваю працу.

— Мы тут кіраўніцтвам задаволеныя: наш дырэктар нам як бацька, — прызнаецца яна. — І прадукцыя наша самая лепшая — карысная для здароўя, сапраўдная.

Раіса Сцяпанаўна Злобіна — мыйшчыца малакавозаў. Разам з вадзіцелем Алегам Кандраццевым яна мые аўтамабіль і расказвае:

— Машыны трэба добра мыць і парыць, каб малако было чыстае і добрае. Гэта абавязкова. І мне мая праца падабаецца. Хоць я і пенсіянерка, але дырэктар мне сказаў, што я магу працаваць на здароўе. І я ўсё раблю добра, сумленна!

На заводзе распавядаюць, што ўзор адказнага стаўлення работніка да справы — гэта старшая кладаўшчыца Наталля Леанідаўна Новікава. Сціплая жанчына, яна вельмі добра ведае сваю працу і выконвае яе так, як рабіла б гэта дома, для сябе.

Працуем добрасумленна!

За апошнія гады гаспадарка Шклоўскага масларобнага завода пашырылася. Каб паменшыць выдаткі на збор малака і развоз у гандаль гатовай прадукцыі, новае кіраўніцтва стварыла аўтатранспартны ўчастак. Закінутую аўтабазу прывялі ў парадак, каб арганізаваць стаянку і абслугоўванне аўтамабіляў — малакавозаў і ізатэрмічных фургонаў.

— Мне мая праца падабаецца, — усміхаецца начальнік участка Рыгор Осіпаў. — Прыходзіць новая тэхніка, наша база будуецца і пашыраецца, увогуле будзе новы завод. Так што перспектыва ў нас ёсць! Жадаю ўсім сваім калегам, каб на нашым заводзе быў прыбытак і каб мы заўсёды былі наперадзе!

У будучыні адкрыецца трэцяя фірмовая крама Шклоўскага масларобнага завода. Гэта будзе ў жылым раёне райцэнтра, паблізу якога распачнецца будоўля новай вытворчасці.

Кіраўніцтва адзначае добрую працу службы маркетынгу, якая заўсёды працуе ўзмоцнена. Менавіта ад яе супрацоўнікаў залежаць збыт, кліенты, рынак і, урэшце, прыбыткі прадпрыемства.

— Сёння ў Беларусі паважаюць шклоўскія малочныя прадукты, — лічыць дырэктар Шклоўскага масларобнага завода Аляксандр Ерашэнка. — Нам ёсць чым ганарыцца. Мы плацім падаткі ў бюджэт, спансіруем дзіцячыя ўстановы. Шклоўцы і ўлады паважаюць наша прадпрыемства, і мы будзем добрасумленна працаваць.

Матэрыял падрыхтавалі Вераніка ХІЛЬКЕВІЧ, Ілона ІВАНОВА, Аляксандр БЯЛЯСАЎ (фота).

Галоўны інжынер Аляксандр КАПЫЛОЎ: «Я жадаю ўсім працаўнікам нашага завода не спыняцца на дасягнутым і рухацца толькі наперад!»

Лабаранткі Ала БУЕВІЧ і Алена ВАРЗІНАВА правяраюць якасць сыравіны і гатовых прадуктаў.

Мікрабіёлаг Наталля ІСАЕВА: «Наша прадукцыя — гэта здаровае харчаванне. Раю ўсім пачаставацца!»

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Сканворд+судоку (10 чэрвеня). Па гарызанталі: Гаспра. Барсук. Малі. Карп. Сіу. Эсэ. Шпак. Аспід. Каракарум. Ала. Юка. Пакунак. Апак. Абат. Лета. Золата. Улар. Бра. Гера. Парк. Арак. Рыс. Эмблема. **Па вертыкалі:** Акапі. Бурымэ. Аташэ. Сіракуза. Плісэ. Канал. Пірке. Аркуш. Алабама. Перакат. Раска. Баржа. Танк. Камю. Калуга. Прапелер. Атара. Кукарда. Карак. **Судоку:** адказы гл. у табліцы.

2	5	9	6	1	8	7	3	4
7	6	1	2	3	4	8	5	9
4	3	8	9	5	7	2	6	1
8	9	3	4	7	5	1	2	6
5	2	6	3	9	1	4	8	7
1	7	4	8	6	2	5	9	3
9	4	5	1	2	3	6	7	8
6	1	2	7	8	9	3	4	5
3	8	7	5	4	6	9	1	2

Чытайце ў наступным нумары

ХОД КАНЁМ
Зрабіў у творчасці Сяргей Бандарэнка

Яго скульптуры коней знаходзяцца ў калекцыях многіх знакамітых людзей свету, нават прэзідэнтаў кампаній і краін. Да яго звяртаюцца, калі трэба ўвасобіць любімца ў бронзе, ён можа любавацца самымі знакамітымі канямі, калі іх лепіць. Можа разважаць пра прыгажосць пароды, нават з многіх коней беспамылкова выбраць самага перспектыўнага, які потым стане чэмпіёнам, як гэта было ў Амерыцы. Рэдкае спалучэнне якасцяў, унікальнае ва ўсёй Еўропе, калі скульптар з'яўляецца выдатным знаўцам коней. Стварае і выстаўляе Сяргей Бандарэнка розныя скульптуры, увогуле любіць анімалістыку, калі ўвасабляюцца розныя істоты з жывёльнага свету. Але толькі адна з іх дапамагла стаць асаблівым майстрам у свеце людзей — асам у коннай скульптуры.

Літаратару і гісторыку Анатолю Бутэвічу спаўняецца шэсцьдзесят гадоў. Многія яго творы былі надрукаваныя пад псеўданімам "Валошка".

* * *

Калі здарожыўся — спачні,
Зняверыўся — перахрысціся,
Да светлай вербы прытуліся,
Калі цямнота точыць дні.
Калі ж усе іспыты Свету
Пашле табе
Гасподзь гняўлівы —
Нішто не дапаможа ў гэтым,
Адно – валошка,
квет цнатлівы.
Укруг яе бураны зграяй,
Сякуць залевы,
спёка джаліць...
Вер, бо яна усё стрывае,
Ўратуе нас і захавае.

ПРА СЕМ БЕЛАРУСКІХ ЦУДАЎ

Выстава «Сем цудаў Беларусі» адкрылася ў мінскай бібліятэцы №1 імя Льва Талстога. Прымеркавана яна да 60-гадовага юбілею пісьменніка Анатоля Бутэвіча. Адну частку выставы складаюць працы таленавітага беларускага мастака-графіка Паўла Татарнікава. Яны з'яўляюцца ілюстрацыямі да серыі кніг «Сем цудаў Беларусі», якую выпускаюць выдавецтва «Кавалер» і Мінская фабрыка каляровага друку. Па сваёй сутнасці творы Татарнікава — гэта выдатныя працы на тэму нашай багатай і шматаблічнай гісторыі. Вынікі творчых намаганняў мастака сапраўды цудоўныя, яны так таленавіта дапаўняюць і шмат чаго дадаюць да тэксту Анатоля Бутэвіча, што, відаць, несправядліва было б называць іх проста ілюстрацыямі.

А другая частка выставы — гэта кнігі Анатоля Бутэвіча. Найперш — з серыі «Сем цудаў Беларусі»: «У гасцях у вечнасці», «Званы Нямігі», «За наміткай гісторыі», «Адвечны покліч Радзімы» і «Славутыя родам сваім». Акрамя таго, змешчаны і іншыя выданні, у тым ліку калектыўныя зборнікі, а таксама публікацыі ў перыядычным друку, крыху з напісанага крытыкамі пра пісьменніка. Некаторыя творы — з аўтографам аўтара.

«Звязда» віншуе з юбілеем свайго даўняга аўтара!

СЁННЯ

Месяц

Першая квадра.
Месяц у сузор'і Скарпіёна.

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	4.37	21.43	17.06
Віцебск —	4.18	21.41	17.23
Магілёў —	4.27	21.33	17.06
Гомель —	4.33	21.20	16.47
Гродна —	4.54	21.56	17.02
Брэст —	5.06	21.48	16.42

Імяніны

Пр. *Веры, Валяр'яна, Дзяніса, Харытона, Усціна.*

К. *Элізы, Эльвіры, Юстыны, Базыля, Валерыя, Міхала.*

НАДВОР'Е на заўтра



14 чэрвеня 2008 г. *— дзень 66-годдзя* ***СІТНІК Валянціны Пятроўны.***

Любая жонка!
Такіх, як ты, няма на свеце.
Я гэта ведаю даўно.
Ты для ўсіх, як сонца,
свеціш
і саграваеш, як яно.
Дачка, сыны, унучкі, унукі
Пад гэтай ласкай расцвілі,
Яны цалуюць твае рукі
І б'юць паклоны да зямлі...
А я дару ў вершы звонкім
Букет сардэчных,
цёплых слоў,
Жадаю, родненькая жонка,
Жыць доўга, аж да 100 гадоў.

Твой Сітнік.

Віншуем з днём нараджэння ***МАКСІМАВУ Ірыну Рыгораўну*** *з п. Крупскі Мінскай вобласці.*

Жадаем здароўя, шчасця, цеплыні гэтаму самаму дарагому і блізкаму чалавеку.

З любоўю
маці, муж, сын, сястра.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 7 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.

http://www.zviazda.by
e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 32.856 Індэкс 63850. Зак. № 3156. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12